Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра беларускай і замежнай філалогіі

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
_________А.М. Пісарэнка
“__” _________ 2022 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
________Ю. М. Галкоўская
“__” _______ 2022 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

*для ўсіх спецыяльнасцей універсітэта*

Складальнікі:
*В.С.Варапаева*, прафесар кафедры беларускай і замежнай філалогіі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*С.М. Тычына*, дацэнт кафедры беларускай і замежнай філалогіі, кандыдат філалагічных навук

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 21.06.2022 г.
пратакол № 12

Складальнікі:
*В.С.Варапаева, прафесар кафедры беларускай і замежнай філалогіі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
*С.М. Тычына, дацэнт кафедры беларускай і замежнай філалогіі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат філалагічных навук*

Рэцэнзенты:
*Жэлуновіч А.А., загадчык кафедры рускай мовы як замежнай установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;*

*кафедра беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка”*

Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:

*Кафедрай беларускай і замежнай філалогіі*
*(пратакол ад 26.05.2022 г. № 10)*

*Саветам факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый*
*(пратакол ад 31.05.2022 г. № 9)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЗМЕСТ**


| | | |
|---|---|---|
| 1. | ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА………………………………………………. | 4 |
| 2. | ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ…………………..………………. | 6 |
| 2.1. | Інфармацыйна-метадычнае забеспячэнне дысцыпліны……………… | 6 |
| 2.2. | Артыкулы……………………………………………………………….. | 9 |
| 3. | ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ……………………………...…………... | 49 |
| 3.1 | Спісы мастацкіх твораў па дысцыпліне……….………………………… | 49 |
| 3.2 | Семінарскія заняткі…………………………………………………… | 53 |
| 4. | РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ………………………..………………… | 78 |
| 4.1 | Кантралюемая самастойная работа ………………………………….. | 78 |
| 4.2. | Пытанні да экзамену для студэнтаў ФІДК…………………………… | 80 |
| 4.3. | Пытанні да заліку для студэнтаў ФІДК…............................................... | 83 |
| 4.4. | Пытанні да экзамену для студэнтаў ФКіСКД, ФХК, ФМіХМ………... | 85 |
| 4.5 | Крытэрыі ацэнкі вучэбнай дзейнасці……………………………….. | 88 |
| 5. | ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ…………………………………......... | 90 |
| 5.1 | Вучэбная праграма па дысцыпліне………………………………… | 91 |
| 5.2 | Асноўная навуковая літаратура…………………………………... | 114 |
| 5.3 | Дадатковая навуковая літаратура……………………………………... | 114 |
| 5.4 | Дадатковая даведачна-біяграфічная літаратура………………………. | 115 |
| 5.5 | Хрэстаматыі……………………………………………..………. | 115 |
| 5.6. | Тэматычныя планы вывучэння дысцыпліны………………………….. | 119 |


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Літаратура з'яўляецца крыніцай чалавеказнаўства, грамадазнаўства. Развіццё мастацтва слова неад'емнае ад гістарычнага развіцця чалавецтва. Невыпадкова мастацкую літаратуру часам называюць гісторыяй у вобразах. У працэсе вывучэння беларускай літаратуры на канкрэтных прыкладах можна спазнаць і засвоіць вытокі і асновы, этапы станаўлення і асаблівасці развіцця беларускай культуры. Дапамагаючы глыбей пазнаваць жыццё, літаратура адначасова спрыяе маральнаму, эмацыянальнаму і эстэтычнаму развіццю, духоўнаму самасцвярджэнню чалавека як асобы, здольнай творча і актыўна рэалізоўваць сябе ў соцыуме. Вывучэнне літаратуры плённа ўплывае на асэнсаванне матэрыялу пры засваенні іншых дысцыплін, таму што літаратура як від мастацтва здольная спасцігаць свет універсальна, усёабдымна, у самых розных яго вымярэннях: сучасным, гістарычным, перспектыўным, адлюстроўваючы жыццё свайго народа і жыццё народаў іншых краін. Беларуская літаратура паказвае чалавека ў пэўным сацыяльна-культурным асяроддзі, уздымае важныя філасофскія, маральна-этычныя, экалагічныя і іншыя праблемы сучаснасці, мінулага, будучыні. Менавіта таму вучэбная дысцыпліна "Беларуская літаратура" дапамагае рэалізоўваць галоўную мэту адукацыйна-выхаваўчага працэсу – фарміраванне інтэлектуальна і эстэтычна развітай, культурнай асобы. Вучэбная дысцыпліна "Беларуская літаратура" цесна звязана з такімі дысцыплінамі, як "Фальклор, міфалогія і этнаграфія беларусаў", "Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый", "Гісторыя мастацтваў", "Беларуская мова (прафесійная лексіка)" і інш. Літаратура фарміруе маральны ідэал, эстэтычныя густы, развівае інтэлект, далучае да духоўнага жыцця і культуры народа.

*Мэта* выкладання дысцыпліны "Беларуская літаратура": раскрыць адметнасць і шматстайнасць беларускага літаратурнага працэсу, даць уяўленне пра асноўныя этапы яго развіцця, пра змены мастацка-светапоглядных сістэм.

У працэсе засваення дысцыпліны "Беларуская літаратура" рэалізуюцца наступныя *задачы*:

– фарміраванне сістэмы літаратурных (тэарэтыка-літаратурных і гісторыка-літаратурных) ведаў як кампанента гуманітарнага светаадчування і мыслення;

– выпрацоўка навыкаў прафесійнага выкарыстання літаратурна-мастацкіх твораў у сваёй будучай прафесіі;

– развіццё вопыту навуковай і творчай дзейнасці;

– фарміраванне сістэмы этычных і эстэтычных нормаў адносін да свету, людзей, да сябе.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць*:

– спецыфіку мастацкай літаратуры як формы спасціжэння свету;

– мастацка-светапоглядныя сістэмы ў нацыянальнай літаратуры;

– эвалюцыйныя змены мастацкіх напрамкаў, стыляў, жанраў;

– творчасць яркіх прадстаўнікоў кожнай з мастацкіх эпох;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– спецыфіку нацыянальнага літаратурнага працэсу;

*умець:*

– характарызаваць літаратурную эпоху, асноўныя этапы яе развіцця, літаратурныя напрамкі;

– сістэматызаваць і абагульняць фактычны матэрыял, які адлюстроўвае асаблівасці літаратуры розных гістарычных перыядаў;

– выяўляць аб’ектыўныя заканамернасці і адметнасць развіцця літаратурнага працэсу;

– вылучаць сувязі літаратуры з іншымі відамі мастацтва, разумець узроўні іх ўзаемаўплываў;

*валодаць:*

– неабходнай літаратуразнаўчай тэрміналогіяй;

– навыкамі аналізу мастацкага твора з улікам яго ідэйна-мастацкай цэласнасці ў гісторыка-літаратурным і культуралагічным кантэксце.

**Структура вучэбна-метадычнага комплексу.**

Вучэбна-метадычны комплекс па дысцыпліне “Беларуская літаратура” складзены ў адпаведнасці з “Палажэннем аб вучэбна-метадычным комплексе па вучэбнай дысцыпліне” ва ўстанове адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (загад ад 26.04.2017 г. № 69) і прызначаны для рэалізацыі патрабаванняў адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі.

Вучэбна-метадычны комплекс пачынаецца з *“Тлумачальнай запіскі”*, дзе абазначана актуальнасць вывучэння дысцыпліны, яе спецыфіка ў сістэме іншых вучэбных прадметаў, акрэслены мэта і задачы вывучэння прадмета.

*Тэарэтычны раздзел ВМК* уключае ў сябе спіс падручнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў і слоўнікаў, якія дапамогуць узнавіць і сістэматызаваць веды па курсе, асобныя артыкулы выкладчыкаў, якія могуць быць выкарыстаны ў вучэбным працэсе студэнтам для самастойнай падрыхтоўкі да заліку ці экзамена.

*Практычны раздзел ВМК* змяшчае прыкладныя спісы мастацкай літаратуры для засваення дысцыпліны па семестрах навучання, тэматыку семінарскіх заняткаў для студэнтаў па спецыяльнасцях і розных формах навучання.

Наступным раздзелам комплекса з’яўляецца *раздзел кантролю ведаў*, які змяшчае заданні для самастойнай работы студэнтаў; пытанні да заліку і экзаменаў; крытэрыі ацэнкі вучэбнай дзейнасці студэнтаў.

У *дапаможным раздзеле ВМК* змешчана вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская літаратура” і яе навукова-метадычнае забеспячэнне; спісы асноўнай і дадатковай літаратуры, мастацкія тэксты ў электронным варыянце.

Для дыягностыкі кампетэнцыі, выяўлення вучэбных дасягненняў студэнтаў на прамежкавым і выніковым этапах выкарыстоўваюцца тэсты, рэфераты, вуснае і пісьмовае апытанне. Прадугледжаныя формы кантролю для студэнтаў ФІДК – залік, экзамен. Для студэнтаў ФКіСКД, ФХК, ФміХМ – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## II. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

**Інфармацыйна-метадычнае забеспячэнне дысцыпліны**
**Літаратура**

*Асноўная*

1. Старажытная беларуская літаратура / [уклад. УП "Выдавецтва "Вышэйшая школа"]. – Мінск: Вышэйшая школа, 2022. – 368 с.

*Дадатковая*

1. Баршчэўскі, Л. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён: папулярныя нарысы / Л.Баршчэўскі, П.Васючэнка, М.Тычына. – Мінск : Радыёла–плюс, 2006. – 574 с.
2. Бельскі, А. І. Сучасная беларуская літаратура: станаўленне і развіццё творчых індывідуальнасцяў (80–90 гг.): вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў / А.І.Бельскі. – Мінск : Нар. асвета, 1997. – 254 с.
3. Васючэнка, П.В. Сучасная беларуская драматургія: дапам. Для настаўнікаў / П.В.Васючэнка. – Мінск : Мастац. літ., 2000. – 156 с.
4. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: У 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я.Купалы; Навук. рэд.: І.Я.Навуменка, В.А.Каваленка. – Мінск : Бел. навука, 1999–2015. – 4 т.
5. Гісторыя беларускай літаратуры, XIX – пачатак XX ст.: Падруч. для філал. спец. выш. пед. навуч. устаноў / І.Э.Багдановіч, У.В.Гніламёдаў, Л.С.Голубева і інш.; пад агул. рэд. М.А.Лазарука, А.А.Семяновіча. – Мінск : Выш. шк., 1998. – 559 с.
6. Гісторыя беларускай літаратуры: XX стагоддзе (20-50-я гг.): Падруч. для студэнтаў філал. спец. ВНУ / У.В.Гніламёдаў, В.В.Казлова, М.А.Лазарук і інш.; Пад агул. рэд. М.А.Лазарука, А.А.Семяновіча. – Мінск : Выш. шк., 2000. – 510 с.
7. Гісторыя беларускай літаратуры: Старажыт. перыяд: падруч. для філал. спец. пед. выш. навуч. устаноў / М.М.Грынчык, У.А.Калеснік, У.Г.Кароткі і інш.; Пад агул. рэд. М.А.Лазарука, А.А.Семяновіча. – Мінск : Выш. шк., 1996. – 351 с.
8. Гісторыя беларускай літаратуры, XIX – пач. XX ст.: падручнік для філал. фак. пед. ін-таў БССР / Л. С. Голубева [і інш.]; пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – Мінск : Выш. школа, 1981. – 412 с.
9. Гісторыя беларускай літаратуры, XI – XIX стст.: у 2 т. / НАН Беларусі, Ін-т імя Я. Купалы; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2006—2007. – 2 т.
10. Дасаева, Т.М. Беларуская літаратура XX – пачатку XXI стагоддзя : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях "Журналістыка міжнародная", "Журналістыка (па напрамках)", "Літаратурная работа (па напрамках)", "Інфармацыя і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

камунікацыя", "Беларуская філалогія" / Т.М. Дасаева. – Мінск: РІВШ, 2016. – 263 с.
11. Кісліцына, Г.М. Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы. Навуковае выданне. – Мінск: Логвінаў, 2006. – 415 с.
12. Кісялёў, Г. Ад Чачота да Багушэвіча / Г.Кісялёў. – 2-е выд. – Мінск : Мастац. літ., 2003. – 426 с.
13. Лойка, А. А. Старабеларуская літаратура: Падруч. для філал. спец. ВНУ / А.А.Лойка. – Мінск : Выш. шк., 2001. – 318 с.
14. Лойка, А. А. Гісторыя беларускай літаратуры: дакастрычніцкі перыяд: падручнік для філал. фак. выш. навуч. Установ БССР: у 2 ч. / А. А. Лойка. – Мінск: Выш. школа, 1977–1980. – 2 ч.

### Дадатковая біяграфічна-даведачная літаратура

1. Адамовіч, А. Браму скарбаў сваіх адчыняю… : даследаванне жыцця і творчасці М. Гарэцкага / А.Адамовіч. – Мінск : БДУ, 1980. – 223 с.
2. Беларускія пісьменнікі; [пад рэдакцыяй А. В. Мальдзіса]: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы Акад. навук Рэсп. Беларусь, Беларус. энцыкл. – Мінск : БелЭн, 1992–1995. – 6 т.
3. З росных сцяжын: аўтабіяграфіі пісьменнікаў Беларусі / Уклад. М.Мінзер. – Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2009. – 460 с.
4. Максім Багдановіч. Пясняр чыстае красы: успаміны, артыкулы, прысвячэнні / [уклад. Т. Шэляговіч]. – Мінск: Мастац. літ., 2011. – 349 с. – (Жыццё знакамітых людзей Беларусі : ЖЗЛБ).
5. Пяцьдзесят чатыры дарогі: Аўтабіягр. беларус. пісьменнікаў / Склад. І падрыхт. Тэкстаў Я.Казекі. – Мінск : Мастац. літ., 1963. – 551 с.
6. Уладзімір Караткевіч. Быў. Ёсць. Буду!: успаміны, інтэрв'ю, эсэ / укладанне Г.Шаблінскай. – Мінск : Мастац. літ., 2005. – 517 с. – (Жыццё знакамітых людзей Беларусі : ЖЗЛБ).
7. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. / рэдкал.: І.П.Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1984–1987. – 5 т.
8. Янка Купала: энцыкл. Даведнік / Беларуская сав. энцыкл.; рэдкал.: І.П.Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1986. – 727 с.
9. Куляшова, В.А. Аркадзь Куляшоў. Лясному рэху праўду раскажу...: аповесць-эсэ / Валянціна Куляшова. – Мінск: Маст. літ., 2014. – 260 с.
10. Калядка, С.У. Максім Танк. Новыя факты, матэрыялы, інтэрпрэтацыі : [манаграфія] / С. У. Калядка ; [навук. рэд.: А. Л. Верабей, Л. Г. Кісялёва]. -- Мінск : Беларуская навука, 2014. – 483с.
11. Кузьма Чорны. Чалавек – гэта цэлы свет: успаміны, эсэ, артыкулы, інтэрв'ю, дакументы / [уклад. Галіна Шаблінская]. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2016. – 510 с. (Жыццё знакамітых людзей Беларусі).

### Хрэстаматыі

1. Анталогія даўняй беларускай літаратуры / пад рэд. В.Чамярыцкага. – Мінск: Выш. шк., 2003. – 1015 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Літаратура XI–XVI стагоддзяў / Уклад. і камент. А. У. Бразгунова, І. У. Будзько, Л. В. Ляўшун ; прадм. У. В. Гніламёдава; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. - Мінск : Маст. літ., 2011. – 765 с. – (Залатая калекцыя беларускай літаратуры).
3. Літаратура XVII–XVIII стагоддзяў / Уклад. А.У.Бразгунова, С.Л.Гараніна; навук. рэд. В.А.Чамярыцкі. – Мінск : Маст. літ., 2012. – 830 с. – (Залатая калекцыя беларускай літаратуры).
4. Літаратура Беларусі XIX стагоддзя: анталогія / уклад.: К.А.Цвірка, І.С.Шпакоўскі, К.У.Антановіч; нав. Рэд. А.В.Мальдзіс; прадм.: К.Цвірка . – Мінск : Бел. навука, 2013. – 861 с.
5. Старажытная беларуская літаратура (XII–XVII стст.) / уклад., прадм., камент. І.Саверчанкі. – Мінск : Кнігазбор, 2007. – 608 с.
6. Старажытная беларуская літаратура : Зборнік : Для ст. шк. узросту / уклад. Л.С.Курбека; аўт. Прадм. У.Г.Кароткі. – Мінск : Юнацтва, 1990. – 350 с.
7. Сучасная беларуская драматургія: Традыцыі і наватарства / уклад. П.Васючэнка. – Мінск: Маст. літ., 2003. – 639 с.
8. Сучасная беларуская п’еса: Зб. / склад. Г.Марчук. – Мінск: Маст. літ., 1992. – 396 с.
9. Сучасная беларуская п’еса: Зб. / склад. П.Васючэнка. – Мінск: Маст. літ., 1997. – 302 с.
10. Філаматы і філарэты : Зборнік / уклад., пер. пол. Твораў, прадм., біягр. Даведкі пра аўт. І камент. К.Цвіркі. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1998. – 400 с.
11. Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі: у 3 т. / Беларус. ун-т культуры; уклад., рэд. тэкстаў, уступ. Арт. І камент. А.В.Сабалеўскага. – Мінск : Беларус. навука, 1997. – 3 т.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Артыкулы

**Варапаева В. С**

# ЛІТАРАТУРА – ЧАСТКА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ – МАГУТНЫ СРОДАК ВЫХАВАННЯ МОЛАДЗІ

Доўгія гады літаратура як від мастацтва слова была і сёння застаецца пад пільнай увагай грамадства. Пацвярджэннем таму з’яўляецца і той факт, што Міністэрства культуры аб’явіла 2016 год Годам культуры ў Беларусі. Менавіта гэты год з’яўляецца юбілейным для шматлікіх знакамітых пісьменнікаў (18): М. Багдановіча Я. Лучыны, Г. Бураўкіна, З Бядулі, Н. Гілевіча, К. Крапівы, І. Шамякіна і інш.

Яшчэ на пачатку XX ст. бальшавіцкая газета “Праўда” пісала: “Кніга – моцная зброя, з дапамогай якой мы можам выхаваць новае пакаленне людзей. Выданне кніг павінна быць пад пільнай увагаю партыі…” і г. д. А калі звярнуць увагу на папярэднія стагоддзі, то можна знайсці адказы на вельмі важныя пытанні. “Кнігі пішуцца для выхавання. А выхаванне – вялікая справа, ім вырашаецца лёс чалавека” (Р. В. Бялінскій); “Кніга – духоўны запавет аднаго пакалення другому” (А. І. Герцэн); “Кніга –акно, праз якое можна паказаць жыццё” (В. Вітка). А Р. І. Барадулін зазначыў: “Слова – усяму аснова, душа крылатая ў слова”. І ўсе гэтыя выслоўі ідуць ад самага першага: “Спачатку было Слова і Слова было ў Бога, і Слова было Бог!”

У чым жа прырода такога магутнага ўздзеяння Слова на чалавека? Побач з іншымі відамі мастацтва, літаратура – мастацтва слова – у значнай ступені вызначае маральнае здароўе грамадства, яго духоўны клімат, садзейнічае ўсведамленню грамадскай значнасці чалавека, дапамагае яму быць псіхалагічна гібкім, рэагаваць на змены сацыяльнай рэчаіснасці, супрадзейнічаць стандартызацыі мыслення і чэрствасці пачуццяў. Асабліва гэта сёння важна для маладога пакалення, якое жыве і развіваецца ў іншых сацыяльных умовах, чым папярэднікі. І самае галоўнае – гэта тыя змены, якія адбыліся ў каштоўнасных арыентацыях моладзі: матэрыяльныя каштоўнасці дамінуюць над духоўнасцю.

Як сведчаць факты, выкладчыцкая праца моладзь мала чытае, а калі і чытае, то дэтэктывы, літаратуру жахаў, любоўныя раманы і г. д. Безумоўна, што такая літаратура не можа духоўна ўзбагачаць асобу, а наадварот, садзейнічае збядненню думак, а часам і разбурэнню асобы. Р. Бялінскі у свой час папярэджваў: “Лепей нічога не чытаць, чым чытаць “дурно выбранные книги”.

Між тым, філосафы, псіхолагі, педагогі сцвярджаюць, што высокамастацкая літаратура можа па-свойму актыўна ўдзейнічаць на ўсе сферы свядомасці. Выхаванне і развіццё асобы і пазнанне ёю аб’ектыўнай рэчаіснасці сродкамі мастацтва здзяйсняецца як адзіны дыялектычны працэс. Пазнанне рэчаіснасці і самапазнанне, самаацэнка і самавыхаванне ў гэтым працэсе дыялектычна ўзаемазвязаны. Выхаванне чалавека пад уздзеяннем мастацтва слова ажыццяўляецца перш за ўсё менавіта ў працэсе непасрэднага ўспрымання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

твора шляхам эмацыянальнага ўключэння яго (чытача) ў чужое жыццё, адлюстраванае ў творы, праз яго адкрыццё, разуменне і засваенне. Пры гэтым ідзе суперажыванне, якое і ўплывае на ўнутраны свет чалавека, на змены ў гэтым унутраным свеце. Пасціжэнне твора – працэс індывідуальны, творчы. Па-першае, таму што чытанне – гэта даверлівы дыялог пісьменніка і чытача. Па-другое, творчае чытанне – актыўная сумесная творчасць чытача і пісьменніка. Чытач як бы паўтарае ўжо пройдзены і апісаны аўтарам шлях, пазнаючы жыццё, адноўленае ў творы. Варта зазначыць, што гэтая духоўная дзейнасць працягваецца і пасля таго, як перагорнута апошняя старонка кнігі. Узнікаюць думкі, пачуцці, меркаванні, а вобразы працягваюць існаваць у свядомасці і пасвядомасці, і тым самым выклікаюць параўнанні, асацыяцыі, дзеянні асобы чытача. Разважаючы пра працэс чытання Гётэ так характырызаваў чытачоў: "Ёсць тры віды чытачоў: першы – гэта той, хто атрымлівае асалоду без развагі; другі – той, хто судзіць, без асалоды, і трэці, сярэдні – той, хто судзіць, атрымлівае асалоду і, задаволіўшыся, разважае". Менавіта гэтыя, апошнія, і аднаўляюць па-новаму твор. Калі гаварыць пра нашых студэнтаў, то ў большасці гэта першы від чытачоў. Аналіз твора часцей за ўсё зводзіцца да звычайнага пераказаў, без пранікнення ў яго ўнутраны сэнс. Мера чытання мастацкай літаратуры – гэта мера інтэрыязацыі і экстэрыярызацыі ў іх адзінстве. Інтэрыярызацыя – перанясенне зместу твора ва ўнутранае "дасягненне" асобы, своеасаблівая селекцыя чытаемага ў адпаведнасці з жыццёвымі і чытацкімі ўстаноўкамі чалавека, яго культурай, яго ўзростам. Засвойваючы багацце вобразоў, праводзячы іх адбор у сваёй чытацкай свядомасці, чалавек падымаецца на новую ступень свайго духоўнага развіцця, з якой ён па-іншаму глядзіць на самога сябе і наваколле. Адбываецца працэс экстэрыязацыі – пераўтварэнне ўнутранага ў знешняе, рэалізацыя багацця душы ва ўзаемаадносінах з людзьмі, у маральных і сацыяльных паводзінах.

Працэс станаўлення вызначаецца здольнасцю асобы праяўляць пэўныя адносіны да свету, асяродку, жыццядзейнасці, здольнасцю як бы паўставаць над сабою, ацэньваць сябе з боку, з пазіцыі іншага. Дзякуючы гэтаму, сама асоба і падуладна ўздзеянню мастацкага вобраза, а ён, у сваю чаргу, выступае своеасаблівым люстэркам, у якім чытач – асоба, якая развіваецца, – мае магчымасць убачыць і ацаніць сябе, выказаць уласныя адносіны да вобраза і адлюстраванай (створанай) рэчаіснасці, якая падаецца ў ёй. З гэтага вынікае адна з цэнтральных установак выхавання асобы ў працэсе чытання: яго накіраванасць на фарміраванне здольнасці меркаваць, мець свой погляд, выказваць свае адносіны да чытаемага, ці ўжо прачытанага твора і здольнасці пераносіць гэтыя адносіны на самога сябе. Аднак вядома, што чытанне прадуктыўнае толькі тады, калі яно арыентавана на засваенне літаратуры на ўзроўні "асобаснага сэнсу", што не сумяшчальна з разуменнем чытання як дзеяння, мэта якога толькі пашырэнне ведаў, узбагачэнне чытальніка- індывіда рознай інфармацыяй. Сама прырода асобы і працэс яе станаўлення абумоўлівае адзінства "пазнавальнай", "выхаваўчай" накіраванасці чытачоў. Пазнанне губляе выхаваўчую сілу, калі не мае асобаснага сэнсу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адной з найважнейшых задач літаратурнай адукацыі ў ВНУ (незалежна ад спецыяльнасці) і з'яўляецца духоўнае выхаванне моладзі з гуманістычным светапоглядам, самастойным мысленнем, з развітым пачуццём нацыянальнай і асабістай годнасці, чалавека чулага, адданага агульначалавечым ідэалам, асобу з творчымі магчымасцямі, крэатыўную, здатную ўспрымаць і ствараць прыгожае. Менавіта праз высокамастацкія творы можна перадаць студэнтам сукупнасць ведаў пра патрыятызм, любоў да Радзімы, маральныя прынцыпы і нормы, важныя для грамадства, аб сапраўднай духоўнасці чалавека.

Можна задацца пытаннем, а ці ёсць у беларускай літаратурнай спадчыны тыя здабыткі, творы, на якіх можна і варта выхоўваць? Так, ёсць! У арсенале беларускай літаратуры ёсць і аўтары, і творы, якія здольны актыўна ўплываць і на пачуцці, і на розум маладых людзей.

Ф. Багушэвіч усім сваім жыццём даказаў, як трэба любіць свій народ і служыць яму. Ён заклікаў людзей не зракацца мовы, дадзенай Богам, "каб не ўмерлі".

М. Багдановіч, які амаль не жыў на Беларусі, становіцца яе народным паэтам. Ці не прыклад гэта для моладзі, як трэба любіць сваю краіну і народ. Яго паэзія і сёння актуальна, бо насычана думкамі, развагамі: Жывеш не вечна, чалавек, – // … Жыві і цэльнасьці шукай, // Аб шыраце духоўнай дбай.

Янка Купала не выпадкова названы прарокам беларускай нацыі. Менавіта ён першы ўголас абвясціў: А хто там ідзе, а хто там ідзе // У агромністай такой грамадзе? // – Беларусы.

Якуб Колас узбагаціў сусвет сваімі алегарычнымі казкамі жыцця, стварыў запамінальныя сялянскія вобразы. У паэме "Сымон-музыка" ён актуалізаваў праблему: якім павінен быць мастак, што такое сапраўднае мастацтва, каму павінен служыць мастак і мастацтва.

Кузьма Чорны (наш Дастаеўскі, хаця і Дастаеўскі таксама наш, памесце яго і продкаў ягоных Достоева, што на Брэстчыне) глыбока зірнуў ва ўнутраны свет чалавека, раскрыў трагедыю маленькага чалавека, прымусіў задумацца над вечнымі праблемамі чалавечага шчасця.

Уладзімір Караткевіч абудзіў гістарычную памяць, духоўныя карані, душу народа. Да яго беларусы амаль нічога не ведалі пра геніяльных продкаў, якімі варта ганарыцца, браць з іх прыклад.

Дзякуючы Васілю Быкаву сусвет даведаўся пра жорсткую праўду вайны. Менавіта ён паказаў ролю аднаго (гэта азначае, кожнага!) чалавека ў перамозе, паказаў якім быў чалавек на вайне і што папярэднічала яго гераізму альбо здрадніцтву.

Янка Брыль падарыў чытачам светлыя непаўторныя, поўныя гумару і аптымізму творы. Асілак малога жанра (апавяданне) ён здолеў раскрыць самыя патаемныя рухі душы сваіх герояў ("Маці", "Галя", "Memento mori")

Максім Танк даказаў (чаму б нам не ганарыцца!), што беларуская мова багатая ва ўсіх сэнсах гэтага слова і на ёй можна стварыць нават верлібр (дзе ў нерыфмаванай форме ёсць рытм, мелодыка і высокамастацкі вобраз): Я спытаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чалавека, // Які прайшоў праз агонь, // І воды, // І медныя трубы: // – Что самае цяжкае // На гэтым свеце? // І ён адказаў: // – Прайсці праз вернасць.

Пімен Панчанка падкрэсліў: Той дзень прапаў і страчаны навекі, // Калі ты не зрабіў, таго што мог; // Калі не паспрыяў ты чалавеку, // Няшчыры быў, зманіў, не дапамог.

У. Дубоўка, Я. Пушча, І. Бураўкін, А. Вярцінскі, Р. Барадулін, Н. Гілевіч і інш. паэты-юбіляры стварылі ў сваіх творах дзівосны свет. Праблемамі сучаснасці (тэмы чужынцаў, якія не лічацца з інтарэсамі карэннага насельніцтва, наркаманіі, збядненне ўнутранага свету чалавека; абыякавасць; клопат пра нажыву і г. д.) насычаны творы Ю. Станкевіча, А. Федарэнкі (дарэчы выпускнік ФІДК), Л. Рублеўскай і інш.

Як данесці ўсё гэта духоўнае багацце да нашых студэнтаў?

Па-першае, не выключаць літаратуру з дзяржаўнага стандарту для гуманітарных вузаў і, безумоўна, універсітэта культуры, не скарачаць штогод літаратурныя курсы – гэта не на карысць нашым студэнтам, нашай культуры і нашаму грамадству.

Па-другое, у выкладанні літаратурных курсаў праяўляць больш крэатыўнасці: уключаць студэнтаў у працэс усведамлення глыбіні твораў праз тыя віды дзейнасці (прафесіянальныя), якія ім уласцівы.

Па-трэцяе, у спіс для самастойнага чытання павінны ўваходзіць толькі высокамастацкія творы. Лепей менш, але якасней.

На кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры накоплены такі вопыт. Напрыклад, харэографы праз свае замалёўкі паказваюць унікальную пластычнасць вершаў Р. І. Барадуліна, Л. Дранько-Майсюка, А. Сыса; рэжэсёры – дэманструюць урыўкі з твораў У. Караткевіча (“Ладдзя роспачы”, “Сівая легенда”), мастакі – ілюстрацыі да твораў В. Быкава і іншых аўтараў; студэнты другіх спецыялізацый пішуць рэцэнзіі, водгукі на сучасныя творы, ствараюць рэкламныя буклеты, літаратурныя партрэты, робяць прэзентацыі, прысвечаныя творчасці пісьменнікаў і г. д.

Што гэта дае? Гэта выхоўвае глыбокія пачуцці, якія праяўляюцца праз спачуванні, захапленні, суперажыванні; развівае ўменне эстэтычна ўспрымаць наваколле; фармуе ўменне вобразна мысліць, уносіць элементы творчасці ў асабістую дзейнасць. А яшчэ зусім іншае, больш глыбокае ўспрыманне, стаўленне да літаратуры як віда мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

С.М. Тычына

## ПРАДМОВЫ І ПАСЛЯСЛОЎІ ДА БІБЛІІ ЭПОХІ АДРАДЖЭННЯ І НАШЫХ ДЗЁН: ПАРАЎНАЛЬНЫ АСПЕКТ

Практыка напісання прадмоў да свяшчэнных тэкстаў узнікла дастаткова даўно. Адным з першых узораў прадмоў да біблейскага тэксту можна лічыць прадмову, якой распачынаецца “Кніга мудрасці Ісуса, сына Сірахава” (каля 170 г. да н.э.): “Многое и великое дано нам через закон, пророков и прочих

писателей, следовавших за ними, за что должно прославлять народ Израильский за образованность и мудрость; и не только сами изучающие должны делаться разумными, но и находящимся вне [Палестины] усердно занимающиеся [писанием] могут приносить пользу словом и писанием. Поэтому дед мой Иисус, больше других предаваясь изучению закона, пророков и других отеческих книг и приобретя достаточный в них навык, решился и сам написать нечто, относящееся к образованию и мудрости, чтобы любители учения, вникая и в эту [книгу], еще более преуспевали в жизни по закону" [1, с. 643]. Нягледзячы на тое, што "Кніга мудрасці Ісуса, сына Сірахава" не з'яўляецца для праваслаўных кананічнай, у пратэстанцтве і іўдаізме прызнана апакрыфічнай, а для каталікаў з'яўляецца другакананічнай, Ф. Скарына яе надрукаваў адной з першых у 1517 г. (услед за кнігамі "Псалтыр", "Іоў", "Прытчы Саламона"), паколькі лічыў, што яна "всю науку о добрых нравех в собе замыкающе" [6, с.160]. У сваёй прадмове да гэтага біблейскага тэксту Францыск Скарына пісаў, што ў кнізе гаворыцца "о мудрости, о страху господьнем, о слове божием, о справедливости, о вере, о любви, о надежи, о чистоте, о службе божией, о долготерпении, о смирении, о милостыни, о крепости, о трезвости, о мерности, о почтивости, о щедроте, о тихости, о долголюбии /…/ [5, с.168] – г.зн. пра найлепшыя якасці, якія павінныя быць у чалавека. Цікава, што прадмова, якую да біблейскага тэксту напісаў ўнук Ісуса, сына Сірахава, пэўным чынам пераклікаецца з прадмовамі Ф. Скарыны, а таксама звязана з адной з найважнейшых мэтаў, якія паставіў перад сабой беларускі асветнік, друкуючы свяшчэнныя кнігі: "для похвалы божией и размножения мудрости, умения, опатрености, разуму и науки" [5, с. 168]. Гэтаксама і ўнук Ісуса, сына Сірахава, тлумачыў, што пераклаў свяшчэнны тэкст для тых, хто знаходзячыся ў чужых землях, жадае вучыцца, спасцігаць мудрасць і жыць паводле закона Божага.

Вядома, што з'яўленне пасляслоўяў да свяшчэнных тэкстаў таксама вядзе свой пачатак ад старажытнасці. Даследчык М.М. Розаў лічыў узнікненне пасляслоўяў і прыпісак данінай візантыйскай традыцыі, якая патрабавала абавязковага спалучэння трох элементаў: падзякі Богу за закончаную працу, пахвалы таму, хто замовіў кнігу і звароту да чытача з просьбай выправіць магчымыя памылкі, якія ўзніклі пры перапісванні тэксту [4, с. 51]. Праўда, дадзеная традыцыя дастаткова часта парушалася і некаторыя элементы маглі змяняцца ці набываць большую інфарматыўнасць.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што да нашага часу было назапашана дастаткова шмат тэкстаў, якія цікава было б параўнаць для таго, каб высветліць, як паступова змяняліся і якімі наогул былі прадмовы і пасляслоўі да Бібліі. Паколькі гэтая праца аб'ёмная і спецыфіцыцы прадмоў і пасляслоўяў да розных (у тым ліку рэлігійных) тэкстаў розных перыядаў прысвечана дастаткова шмат навуковых работ (У. Конана [3], Ю. Лабынцава, Л. Ігнацінай, А. Ялеонскай і інш. [7]), то ў сваім невялікім даследаванні мы лічым мэтазгодным абмежавацца толькі некаторымі тэкстамі, якія так ці інакш маюць дачыненне да Беларусі (прадмовамі і пасляслоўямі Ф. Скарыны і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадмовамі і пасляслоўямі да Біблії 1990 г. (прадмову напісаў А.А. Круглоў) і 1993 г. (предрук з Сінадальнага выдання)). Кнігі канца ХХст. былі выдадзеныя ў Мінску.

Безумоўна, вялікая колькасць Біблій наогул не мае прадмоў і пасляслоўяў (у прыватнасці, гэтая заўвага справядлівая ў адносінах да перакладаў свяшчэнных тэкстаў на беларускую мову к. ХХ і пач. ХХІ ст.). Сучасныя Біблії звычайна не маюць прадмоў да кожнай кнігі. У некаторых Бібліях змяшчаецца кароткі змест таго, пра што будзе расказвацца ў той або іншай главе, аднак, звычайна не даюцца ніякія дадатковыя тлумачэнні. Гэта не ў апошнюю чаргу звязана са спецыфікай успрымання свяшчэннага тэксту, кансерватыўнымі царкоўнымі традыцыямі, з бояззю дапусціць сэнсавыя скажэнні свяшчэннай кнігі. Таму спроба далучэння да ўжо гатовага кананічнага тэксту нечага свайго (няхай сабе і прадмовы) можа падацца блюзнерскай. Можа быць гэтым тлумачыцца той факт, што прадмовы і пасляслоўі на сучасным этапе звычайна ўзнікаюць у тым выпадку, калі Біблія друкуецца з пэўнай мэтай: напрыклад, калі Біблію прадстаўляюць як сусветна вядомы помнік старажытнай культуры (напрыклад, Біблія з прадмовай А.А. Круглова 1990 г. на рускай мове), як узор складанага тэксту, фактычна зборнік міфаў, легенд, гістарычных падзей. Ці, напрыклад, з'яўленне шматлікіх экземпляраў і перакладаў на родныя мовы Біблій абумоўлена пэўнымі грамадска-палітычнымі ўмовамі. Так у 90-я гады ХХ ст. стала з'яўляцца вельмі шмат Біблій, якія друкаваліся з мэтай распаўсюджвання свяшчэннага тэксту на тэрыторыі краін, якія доўгі час знаходзіліся пад уплывам атэістычнай ідэалогіі, а таму Біблейскі тэкст вымагаў тлумачэнняў, звязаных найперш з рэлігійнымі пытаннямі (у Мінску, напрыклад, Бібліі пэўны час раздаваліся проста на вуліцах, прычым, можна было атрымаць розныя пераклады і варыянты – поўны біблейскі тэкст або толькі Новы Запавет).

У сваім даследаванні мы сканцэнтруем асноўную ўвагу на прадмове Ф. Скарыны да ўсёй Бібліі і на прадмовах да мінскіх выданняў 1990 і 1993 гг. Выданне Бібліі на рускай мове 1990 г. падрыхтавана не для багаслужэння. А.А. Круглоў, аўтар прадмовы, прапаноўвае зірнуць на свяшчэнны тэкст з пункту погляду мастацкай літаратуры. Пры тым, што А.А. Круглоў аспрэчвае гістарычную дакладнасць падзей, згаданых у тэксце, піша пра тое, што значэнне Бібліі для развіцця мастацтва і фарміравання духоўнай культуры не варта пераацэньваць (Ф. Скарына прытрымліваўся іншага меркавання, паколькі для яго многія веды, у тым ліку тыя, што тычацца розных відаў мастацтва, змяшчаюцца ў Бібліі) і наогул выказвае меркаванне пра тое, што пройдзе час і людзі перастануць звяртацца да рэлігіі, а тэкст Бібліі захаваецца як зборнік міфаў і паданняў, тым не менш у некаторых момантах яго прадмова падобная да прадмовы беларускага асветніка. У прыватнасці, у яго падобны падыход да апісання самаго свяшчэннага тэксту. Як і Ф. Скарына ён па чарзе разбірае часткі і кнігі, з якіх складаецца Біблія. Для параўнання: у прадмове Ф. Скарыны гаворыцца, што "Вторый пророк божий Еремиа, во утробе материне посвященный, во младости своей начал пророковати. К тому теже написал

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

книжку, еже словеть “Плачь Еремиин” [6, с. 160], а ў прадмове А.А.Круглова мы чытаем, што “В Плаче Іереміі в форме элегій оплаківается паденіе Іерусаліма і Іудейского царства, вавілонское плененіе его жітелей царем Навуходоносором в 587-586 годах до н.э.” [1, с.10]. Бясспрэчна, аўтары канцэнтруюць увагу на розных момантах. Ф. Скарына адзначае найперш духоўнае значэнне кніг, у той час як А.А.Круглоў засяроджвае ўвагу на іх гістарычнай адпаведнасці. Прадмова А.А. Круглова цікавая яшчэ і тым, што аўтар вельмі высока ацэньвае працу самаго Ф. Скарыны, піша пра тое, што “ён быў адным з першых мысліцеляў, якія выдавалі Біблію на роднай мове” [1, с. 15]. І дадае: “Дарэчы, выданні Францыска Скарыны былі сустрэтыя вельмі непрыхільна Рускай праваслаўнай царквой” [1, с. 16]. Нягледзячы на пэўную антырэлігійную скіраванасць прадмовы (прычым, аўтар выказваецца вельмі мякка і наогул стараецца не засяроджвацца на гэтым моманце (усё ж варта памятаць, у які час і дзе рабілася гэтая праца)), А.А.Круглоў прапаноўвае ўдумліва і сур’ёзна паставіцца да біблейскага тэксту. Пасляслоўя гэтае выданне не мае. У канцы змешчана карта, паказальнік евангельскіх і апостальскіх царкоўных чытанняў, табліца, у якой адлюстроўваецца паслядоўнасць евангельскіх падзей, невялікі артыкул, прысвечаны грашовым адзінкам, згаданых у Новым Запавеце.

Другое выданне, якое мы разгледзім, несумненна прызначана для веруючых ці зацікаўленых хрысціянскай верай людзей. Адпаведна, прадмова да біблейскага тэксту амаль поўнасцю прысвечана пытанням веры. Але і ў гэтай прадмове мы можам адзначыць паралелі з прадмовамі Ф. Скарыны. Як і ў прадмове беларускага асветніка, у выданні 1993 г. тлумачыцца, што такое Біблія: “Біблію нельга назваць адной кнігай. Гэта цэлы збор кніг, бібліятэка, напісаная пад кіраўніцтвам Богам людзьмі, якія жылі ў розныя стагоддзі. У Бібліі ёсць і гісторыя, і філасофія, і навука. Яна таксама ўключае ў сябе паэзію і драму, біяграфічныя звесткі і прароцтвы. Чытанне Бібліі дае нам натхненне” [2, с. 5]. Параўнаем з тэкстам Ф. Скарыны: “Библиа – греческим языком, по рускии сказуется – книги. /…/ И тако младенцем и людем простым ест наука, учителем же и людем мудрым подивление. /…/ В сей книзе всее прироженое мудрости зачало и конець; Бог вседержитель позновай бываеть. /…/ Ту навчение философии добронравное, яко любити Бога для самого себе и ближнего для Бога, имамы. Ту справа всякого собрания людского и всякого града, еже верою, соединением ласки и згодою посполитое доброе помножено бываеть. Ту научение седми наук вызволенных достаточное” [6, с. 157]. У выданні 1993 г. таксама даюцца парады наконт таго, як варта чытаць Біблію і ідзе пералік біблейскіх цытат, якія тлумачаць, чаму вучыў Ісус. Згадаем, што Ф. Скарына ў сваіх прадмовах дастаткова часта выкарыстоўвае цытаты. А ў прадмове да ўсёй Бібліі змясціў цытаты пракокаў, у якіх прадказваецца прыход Ісуса Хрыста.

У канцы выдання Бібліі 1993 г. змешчаныя карты некаторых мясцін, пра якія ідзе гутарка ў тэксце, а таксама шмат месца займае “Дыялог” (адказы на рэлігійныя пытанні, якія звычайна задаюць людзі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што прадмова да Бібліі Ф. Скарыны мае шмат паралеляў з сучаснымі падобнымі тэкстамі. Ва ўсялякім выпадку А.А.Круглоў, які змясціў прадмову да выдання 1990 г., быў знаёмы непасрэдна з тэкстамі Ф. Скарыны і цалкам верагодна, што яго прадмова была напісана з улікам узору беларускага асветніка (нам падаецца не выпадковым згадванне імені Ф. Скарыны ў прадмове А.А.Круглова). Што тычыцца выдання 1993 г., то мы не можам сцвярджаць, што на фарміраванне тэксту, які папярэднічае непасрэдна кананічным кнігам, паўплывала менавіта творчасць Ф. Скарыны (ніякіх сведчанняў пра гэта няма), але нельга не адзначыць той факт, што ў сэнсавых адносінах некаторыя ўрыўкі з гэтага тэксту фактычна ідэнтычныя кавалкам тэксту з прадмовы нашага асветніка.

**Спіс літаратуры**

1. Библия: Книги священного писания Ветхого и Нового завета. – Минск: Беларусь, 1990. – 1376 с.
2. Библия: Книги Священного Писания Ветхого и Нового завета канонические в русском переводе с параллельными местами / Издание миссионерского общества "Новая Жизнь" Кэмпус Крусэйд фор Крайст Интэрнэшнл. – Минск: Типография им. Ф.Скорины, 1993. – 292 с.
3. Конан, У.М. Прадмова / У.М. Конан // Францыск Скарына і яго час: энцыклапедычны даведнік. – Мінск: "Беларуская Савецкая энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі, 1988. – С. 460 – 462.
4. Розов, Н.Н. Послесловия Ивана Федорова как продолжение русской рукописной книжной традиции / Н.Е. Розов // Федоровские чтения. – Москва: "Навука", 1987. – С. 51–54.
5. Скарына, Ф. Предъмолва доктора Франъциска Скорины с Полоцька в книгу Исуса Сирахова / Ф. Скарына // Старажытная беларуская літаратура: Зборнік. Уклад. Л.С. Курбека. – Мінск: Юнацтва, 1990. – С. 167–169.
6. Скарына, Ф. Предъсловие доктора Франъциска Скорины с Полоцька во всю Бивлию рускаго языка / Ф. Скарына // Старажытная беларуская літаратура: Зборнік. Уклад. Л.С. Курбека. – Мінск: Юнацтва, 1990. – С. 157–161.
7. Тематика и стилистика предисловий и послесловий / Под ред. О.А. Державина и др. – Москва: Из-во "Наука", 1981. – 304 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тычына С.М.**

## ПАЭМЫ "ЭНЕІДА НАВЫВАРАТ" І "ТАРАС НА ПАРНАСЕ" Ў КАНТЭКСЦЕ МАДЭРНІЗАЦЫІ ЛІТАРАТУРНАЙ КЛАСІКІ

Паэмы "*Энеіда навыварат*" і "*Тарас на Парнасе*" – адны з самых знакавых і разам з тым загадковых беларускіх твораў XIX ст. З гэтымі невялікімі па аб'ёме тэкстамі звязана шэраг праблем і, нягледзячы на вялікую колькасць прасвечаных паэмам літаратуразнаўчых даследаванняў, застаюцца

неасветленымі некаторыя пытанні. “*Энеіду навыварат*” і “*Тарас на Парнасе*” варта разглядаць у кантэксце мадэрнізацыі літаратурнай класікі. Вядома, што надзвычай багатымі крыніцамі сюжэтаў, вобразаў і матываў з’яўляюцца не толькі фальклор, гісторыя ці уласны жыццёвы вопыт пісьменніка, але і мастацкія тэксты, творы, якія былі напісаныя іншымі аўтарамі. Найперш маюцца на ўвазе творы, якія сталі літаратурнай класікай. Напрыклад, “*Энеіда*” Вергілія атрымала новае нараджэнне ў шматлікіх пародыях на твор, сярод якіх і вядомая беларускаму чытачу “*Энеіда навыварат*” В. Равінскага, а вось паэма “*Тарас на Парнасе*” К. Вераніцына сама была пакладзена ў аснову іншага тэксту – “*Без Тараса на Парнасе*” М. Танка. У многіх выпадках мы можам гаварыць пра тое, што, па сутнасці, літаратурная класіка была мадыфікаваная, мадэрнізаваная, адаптаваная да новага часу. Зыходзячы з вызначэння, якое даецца ў “*Тлумачальным слоўніку беларускай мовы*”, “мадэрнізацыя – дзеянне паводле знач. дзеяслова мадэрнізаваць”. “Мадэрнізаваць – удасканаліць (удасканальваць) што-небудзь у адпаведнасці з навейшымі патрабаваннямі, густамі. 2) Надаць (надаваць) рысы сучаснасці з’явам і прадметам мінулага”[1]. Класічныя тэксты, нават калі яны, здаецца, былі дастаткова падрабязна разабраныя даследчыкамі, усё адно застаюцца прывабнымі для новых інтэрпрэтацый, асабліва калі гутарка ідзе пра пастаноўку твора на сцэне ці яго экранізацыю. Класіка – гэта ўжо не твор, а менавіта тэкст, які валодае больш шырокімі магчымасцямі і ўласцівасцямі, чым твор (паводле Р. Барта, нават аўтар тэксту ўспрымаецца не як стваральнік, а як адзін з персанажаў[2]). У тэксце “не патрабуецца “паважаць” ніякую арганічную цэльнасць; яго можна драбіць (як, дарэчы, і рабілі ў сярэднявеччы, прычым з двума высокааўтарытэтнымі тэкстамі – са Святым пісаннем і з Арыстоцелем), можна чытаць, не прымаючы ў разлік волю яго бацькі; пры ўзнаўленні ў правах інтэртэксту парадаксальным чынам адмяняецца права на спадчыну”[3]. Сярод шляхоў мадэрнізацыі мастацкага тэксту можна назваць наступныя:

**1. Пераказ/пераклад-адаптацыя.** Для таго, каб твор стаў зразумелым для пэўнай (напрыклад, дзіцячай) аўдыторыі, з тэксту нешта прыбіраюць ці наадварот дадаюць. Існуе пераказ для дзяцей Т. Габе вядомага сатырычнага рамана Д. Свіфта “*Падарожжы Гулівера*”. Часам, калі мастацкія творы перакладаюцца на іншую мову, перакладчык стараецца зрабіць тэкст больш зразумелым для свайго чытача альбо прасцейшым (больш цікавым, менш сумным, менш фрывольным і г.д. – тут могуць быць розныя варыянты). У сувязі з гэтым перакладчык можа нават прыбраць канец твора, што, напрыклад, адбылося ў беларускім перакладзе XVI – XVII стст. рамана “*Аповесць пра Трышчана*”. У артыкуле, прысвечанаму беларускаму перакладу рыцарскіх раманаў, драматург і літаратуразнаўца С. Кавалёў пісаў: “Цяжка сказаць, ці беларускі перакладчык сапраўды карыстаўся незавершаным сербскім (італьянскім) тэкстам, ці трагічны фінал яму проста не спадабаўся і ён свядома

---

[1] Тлумачальны слоўнік беларускай мовы ў 5 тамах, т. 3, Л–П, рэд. П.М. Гапановіч, Мінск 1979, с. 82.

[2] Р. Барт, Избранные работы: Семиотика. Поэтика, Москва 1994, с. 420.

[3] Р. Барт, Избранные работы: Семиотика. Поэтика, Москва 1994, с. 419.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абарваў гісторыю, дазволіўшы чытачам самім "дадумаць" фінал на ўласны густ. Але такі геніяльны, "адкрыты" фінал даваў поўную свабоду сучаснаму драматургу ў адвольнай інтэрпрэтацыі старадаўняга твора, у канструяванні новага мастацкага свету"[4]. Можна прапанаваць і такое рашэнне загадкі абарванага фіналу твора. Справа ў тым, што нешчаслівае заканчэнне падобнай гісторыі кахання быў натуральны для эпохі Сярэднявечча. Ці маглі Трыстан і Ізольда быць разам? У свой час – не, бо Трыстан павінны быў служыць гаспадару, каралю і сваяку Марку і не мог яму "здрадзіць", украўшы яго нявесту. Але за Сярэднявеччам ідзе эпоха Адраджэння з яркімі героямі, Рамэа і Джульетай, якія сталі змагарамі за свае правы на каханне і шчасце, якія не пабаяліся ісці супраць волі бацькоў. У сувязі з тым, што паступова змяняліся погляды на стасункі паміж людзьмі, маглі змяніцца погляды і на магчымыя шляхі развіцця сюжэта рамана. Такім чынам, узнікаюць новыя варыянты развіцця падзей для герояў, якія з-за пэўных абставінаў не могуць быць разам. Можна казаць пра тое, што пераклад твора адпавядае патрабаванням часу.

**2. Спецыфічная літаратуразнаўчая, культуралагічная інтэрпрэтацыя.** Часам у літаратуразнаўцы з'яўляецца спакуса знайсці ў вядомым і, здаецца, добра вывучаным тэксце тое, што не знайшлі іншыя, зрабіць адкрыццё. Гэтага можна дасягнуць, напрыклад, выкарыстаўшы пры даследаванні тэксту не толькі літаратуразнаўчыя паняцці, але і, напрыклад, паняцці з псіхалогіі, звярнуўшыся да метадаў псіхааналізу. Усялякае новае, незвычайнае прачытанне тэксту, безумоўна, цікавае і ад абгрунтавання даследчыка залежыць, ці мае такая інтэрпрэтацыя права на жыццё. Паводле меркавання пісьменніка-постмадэрніста У. Эка: "Нічога так не радуе літаратара, як новыя прачытанні, пра якія ён не думаў і якія могуць узнікнуць у чытача. [...] Я не кажу, што нейкія прачытанні не могуць здавацца аўтару памылковымі. Але ўсё адно ён абавязаны маўчаць. У любым выпадку. Няхай абвяргаюць іншыя, з тэкстам у руках"[5]. Пры гэтым, аднак, застаецца пытанне, ці ўкладваў аўтар такі сэнс у тэкст. Надзвычай цікавыя працы належаць В. Рудневу, які ў сваім "*Культуралагічным слоўніку*" звяртаецца да тэкстаў Ф. Кафкі, Т. Мана, М. Павіча і інш. Адна з самых арыгінальных інтэрпрэтацый тычыцца апавядання Д. Сэлінджэра "*Добра ловіцца рыбка-бананка*", якое аналізуецца з розных пунктаў погляду. В. Руднеў спалучае прымітыўную жыццёвую інтэрпрэтацыю з філасофскай і псіхалагічнай і, такім чынам, знаходзіць у тэксце прыхаваны сэнс ("псіхааналітычны" і "дзэнскі"[6]). У святле новых падыходаў бязвінная на першы погляд сімволіка твора набывае асаблівае значэнне. А з вядомым творам Л.М. Талстога "*Костачка*" В. Руднеў праводзіць надзвычай цікавы "псіхатычны эксперымент"[7].

**3. Экранізацыя літаратурнай класікі.** Само па сабе перанясенне тэксту на экран (а калі яшчэ выкарыстаныя сучасныя камп'ютарныя тэхналогіі) – ўжо

---

[4] С. Кавалёў, Рыцарскі раман у беларускай літаратуры "Acta Albarutenika: навуковы зборнік" 2005, вып. 5, с. 61.
[5] У. Эко, Заметки на полях "Имени розы", Санкт-Петербург 2003, с. 8.
[6] В. Руднев, Энциклопедический словарь культуры XX века: Ключевые понятия и тексты, Москва 2003, с. 547-548.
[7] В. Руднев, Энциклопедический словарь культуры XX века: Ключевые понятия и тексты, Москва 2003, с. 557.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мадэрнізацыя. Аднак, нас больш цікавяць класічныя тэксты, якія былі асучаснены. Напрыклад, такія, як "*Рамэа і Джульета*" (у руках Рамэа з фільма 1996 г. з адпаведнай назвай не шпага, а пісталет) ці "*Кароль Лір*" У. Шэкспіра (твор быў адаптаваны да японскіх рэалій у фільме А. Курасавы "*Ран*"). Існуюць шматлікія мадэрнізацыі рамана Д.Дэфо "*Рабінзон Круза*" (у адной з экранізацый ("*Сіньёр Рабінзон*") герой настолькі прывязаны да выгодаў цывілізацыі, што гатовы ствараць ілюзію гэтых выгодаў ці ахвяраваць дзеля іх каханнем, у другой ("*Выгнаннік*") герой знаходзіць сябра не ў вобразе дзікуна Пятніцы, а ў выглядзе футбольнага мяча). Да твора Д. Сэлінджэра "*Чалавек, які смяяўся*" звяртае вельмі папулярны сярод аматараў анімэ серыял "*Прывід у даспехах*". Былі мадэрнізаваныя творы Ф.М. Дастаеўскага (фільм "*Даўн хаўз*"), Л. Кэрала (фільм "*Аліса ў краіне цудаў*"), Г.Уэлса (мультсерыял "*Футурама*", фільм "*Назад у будучыню*" і г.д.), Т. Драйзера (серыял "*Жыццё, якога не было*") і інш. На вялікі жаль, некаторыя класічныя творы адаптуюцца не для таго, каб падкрэсліць іх актуальнасць, а для таго, каб так званы "масавы" глядач змог зразумець асноўную ідэю твора. А часам сама ідэя знікае, хаваецца за шматлікімі прыгодамі героя. Такім чынам, атрымліваецца, што твор губляе свае вартасці пры пераносе яго на экран. Гэта звязана і з тым, што ствaральнікі кінастужак дастаткова часта імкнуцца да камерцыйнага поспеху і прыбіраюць з тэкстаў тое, што, магчыма, будзе нудным ці незразумелым для сярэднестатыстычнага гледача.

**4. Стварэнне камп'ютарных праграм, гульняў** па матывах літаратурных твораў (гульні "*Уладар пярсцёнкаў онлайн*", "*Аліса ў краіне цудаў*" і інш.). Гульні даюць ілюзію ўдзелу ў падзеях кнігі. Але насамрэч ад твора мала што застаецца (звычайна пакідаюцца толькі пэўныя фрагменты).

**5. Пародыя** (разгледзім больш падрабязна, паколькі гэта – адзін з самых цікавых для нашага даследавання спосабаў мадэрнізацыі літаратурнай класікі, бо ён мае непасрэднае дачыненне да беларускага твора XIX ст. – "*Энеіды навыварат*"). Вялікая колькасць пародый была створана па матывах эпічных паэм Гамера і Вергілія. Прычым, у многіх пародыях героі набываюць рысы сучасных людзей, яны добра знаёмыя з новай палітычнай, эканамічнай, культурнай сітуацыяй. Для падобных пародый часта твор-аснова – гэта толькі абалонка, якую аўтар напаўняе новым, сучасным зместам і актуальнымі праблемамі. Нягледзячы на тое, што антычная літаратура налічвае даволі шмат помнікаў гераічнага эпасу, самымі вядомымі застаюцца "*Іліяда*" і "*Адысея*" Гамера, а таксама "*Энеіда*" Вергілія, якія ўяўляюць сабой пэўны ўзор, на які варта арыентавацца. Усе тры паэмы былі пакладзены ў аснову шматлікіх іншых твораў. Напрыклад, на "*Іліяду*" было створана шэраг пародый: "*Батрахаміямахія*" ("*Вайна мышэй і жаб*"), "*Выкрадзенае вядро*" А. Тасоні, "*Налой*" М. Буало і г.д. "*Адысея*" выкарыстоўвалася ў творах Г. Сакса "*Падарожжы Уліса*", А. Тэнісана "*Уліс*", С. Выспянскага "*Вяртанне Адысея*", Д. Джойса "*Уліс*" і інш. "*Энеіда*" Вергілія была выкарыстана пры напісанні пародый Д.-Б. Лалі, П. Скарона, М. Осіпава, І. Катлярэўскага, В. Равінскага і інш. Як правіла, пры аналізе эпасаў Гамера і Вергілія, адзначаецца іх стылёвае



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падабенства (Вергілій наогул шмат у чым паўтараў Гамера). Цікава, што пры ўсім відавочным падабенстве, кожная з трох паэм "нарадзіла" розныя творы. Так большасць твораў, напісаных па матывах "*Іліяды*" і "*Энеіды*" – гэта пародыі. "*Адысея*" ж падштурхнула многіх аўтараў да стварэння сур'ёзных твораў (праўда, у "*Літаратурным энцыклапедычным слоўніку*" пра раман Д. Джойса "*Уліс*" згадваецца ў артыкуле "*Пародыя*"). Паводле меркавання даследчыка А.Ф. Лосева: "У сувязі з разлажэннем абшчынна-радавога ладу і ўзнікненнем вострых і глыбокіх асабістых настрояў стары гераічны эпас перастае задавальняць мастацкія густы і паступова пачынае набываць да пэўнай ступені музейную цікавасць. Разам з гэтым з'яўляецца і кплівыя адносіны да старога гераічнага эпасу і робяцца спробы стварыць на яго пародыю"[8]. Крытык XVII ст. Дэмарэ дэ Сэн Сарлен (папярэднік Ш. Перо) лічыў, што старажытная літаратура далёкая ад дасканаласці, а творы Гамера наогул "нізкія", "недарэчныя", там шмат "непатрэбшчыны", "смяхотных гутарак і дзеянняў"[9] (гаворка ідзе пра арыгінальныя тэксты Гамера, а не пародыі!). Нездарма шмат пародый узнікла ў XVII ст. (час росквіту класіцызму, калі на антычны ўзор арыентаваліся, але і шмат крытыкавалі таксама). Магчыма, "*Адысея*" дае меншы прастор для досціпаў таму, што само жаданне героя вярнуцца на радзіму і пабачыць блізкіх зусім не вартае высмейвання.

У той жа час, пародыі на "*Іліяду*" і "*Энеіду*" моцна адрозніваюцца. Напрыклад, у "*Батрахаміямахіі*" "*Іліяда*" толькі ўгадваецца. Да Гамера нас звяртае сюжэт пародыі (вайна, ваенныя падзеі, некаторыя эпізоды, якія маюць паралелі з тым, што адбывалася ў "*Іліядзе*", напрыклад смерць аднаго з герояў і наступная помста за яго), удзел у вайне багоў, гераічны пафас, выкарыстанне гамераўскай фразеалогіі. Але героі нават не людзі, а мышы і жабы. Пародыі на "*Іліяду*" нават у назвах не даюць спасылку на эпас Гамера. Наогул пародыі нібыта высмейваюць не саму "*Іліяду*", а хутчэй пустую нагоду, з-за якой можа развязацца крывапралітная вайна (непаразуменне паміж жабамі і мышамі, выкрадзенае вядро, з-за якога пасварыліся жыхары Мадэны і Балоны, спрэчка з-за таго, дзе павінны стаяць налой і г.д.). Што тычыцца "*Энеіды*", то ў пародыях на гэты твор не толькі выкарыстоўваецца знаёмы сюжэт, але і фігуруюць вядомыя героі: Эней, Дыдона, Юнона і інш. Нават спосабы дасягнення камізму ў пародыях на эпічную паэму Гамера і эпас Вергілія адрозніваюцца. Ш. Перо ў сваёй працы "*Паралель паміж старажытнымі і новымі ў адносінах паэзіі (дыялог чацвёрты)*" аналізаваў вядомыя яму пародыі П. Скарона і М. Буало (з апошнім у яго былі пэўныя супярэчнасці ў поглядах): "Камізм жа бурлеску складаецца з неадпаведнасці прадстаўлення пра рэч, якую ён дае, з яе сапраўдным паняццем. А гэтую неадпаведнасць ствараюць двума спосабамі: гаворачы нізкай мовай пра самыя высокія рэчы і гаворачы напышліва пра рэчы самыя нізкія. Гэтыя два віды неадпаведнасці і нарадзілі два роды бурлеску, пра якія ідзе гутарка. Аўтар "*Вергілія навыварат*" гаворыць у самых звычайных і збітых выразах пра самыя вялікія і высакародныя прадметы,

[8] А.Ф. Лосев, Античная литература: Учебник для высшей школы, 7-е изд., Москва 2008, с. 62.
[9] В.Я. Бахмутский, На рубеже двух веков [в:] Спор о древних и новых, Москва 1985, с. 10.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

а аўтар “*Налоя*”, наадварот, гаворыць пра самыя звычайныя і пошлыя прадметы ў самых напышлівых і красамоўных выразах. [...] “*Вергілій навыварат*” – гэта прынцэса ў сукенцы сялянкі, а “*Налой*” – сялянка ў вопратцы прынцэсы, і як прынцэса мілей за сялянку ў кароне, так і сур’ёзныя і важныя прадметы пад покрывам звычайных і жартаўлівых выразаў даюць больш задавальнення, чым штодзённыя і збітыя прадметы пад покрывам пышных і бліскучых выразаў”[10]. Наколькі высока французскі пісьменнік і крытык XVII ст. ацэньваў “*Вергілія навыварат*” П. Скарона, настолькі мала была ацэненая “*Вергіліева Энеіда*” М. Осіпава знакамітым рускім крытыкам XIX ст. В. Бялінскім, які называў яе правінцыйнай[11], бо, на яго думку, гэты твор здольны насмяшыць толькі натоўп, а не адукаванае грамадства, паколькі элементы камічнага схаваныя ў самой рэчаіснасці і не маюць патрэбы ў карыкатурах і перабольшаннях, якія прадстаўленыя ў творы[12]. Аднак як жа тады быць з папулярнасцю пародый М. Осіпава і І. Катлярэўскага сярод адукаванай публікі Расійскай імперыі?

Цікавым з’яўляецца пытанне наконт таго, чаму на тэрыторыі Беларусі ўзнікла пародыя менавіта на “*Энеіду*” Вергілія, а не “*Іліяду*” Гамера (варта ўлічыць тое, што нават Вергілій арыентаваўся на Гамераўскі эпас, а значыць менавіта твор старажытнагрэчаскага аўтара павінны быў быць заўважаны ў першую чаргу). Можна спаслацца на высновы даследчыкаў (напрыклад, Г. Кісялёва, В. Каваленкі, М. Хаўстовіча) наконт таго, што “*Энеіда*” з’явілася ў выніку цесных і плённых беларуска-ўкраінска-рускіх сувязей. Беларускі аўтар быў знаёмы з рускай травесціяй М. Осіпава і ўкраінскай пародыяй І. Катлярэўскага. Згаданыя пісьменнікі карысталіся менавіта творам Вергілія і арыентаваліся на ўжо існуючыя падобныя пародыі. Але ўсё ж такі, чаму менавіта Вергілій, а не Гамер? Айчыннаму аўтару абавязкова трэба было напісаць нешта кшталту таго, што было ў іншых? У кнізе “*Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён*” ёсць меркаванне: “І ўсё ж, напэўна, беларускі аўтар не меў за сваю галоўную задачу даць “пераніцаваную” “*Энеіду*”, якая і так была добра вядомая магчымаму чытачу з твораў Катлярэўскага, Осіпава дый Блумаўэра. В. Равінскі меркаваў перадусім праз пераказ вядомага сюжэта звярнуць увагу на магчымасці беларускай мовы”[13]. Сапраўды, пародыі, як правіла, пішуцца на вядомыя творы і добра вядомыя сюжэты. Ці значыць гэта, напрыклад, што беларускі чытач XIX ст. лепш ведаў творчасць Вергілія, а не Гамера? Пры ўсёй папулярнасці пародый, пры ўсіх іх вартасцях, падобныя творы могуць быць правільна ўспрыняты чытачом толькі тады, калі ён знаёмы з першакрыніцай (творам, які

---

[10] Ш. Перро, Параллель между древними и новыми в отношении поэзии: диалог четвёртый [в:] Спор о древних и новых, Москва 1985, с. 238-239.

[11] В.Г. Белинский, Жизнь и похождения Петра Степанова сына Столбикова... Рукопись XVIII века [в:] В.Г. Белинский, Собрание сочинений в 9 томах, т. 4, Статьи, рецензии и заметки, март 1841 – март 1842, Москва 1979, с. 498.

[12] В.Г. Белинский, Жизнь и похождения Петра Степанова сына Столбикова... Рукопись XVIII века [в:] В.Г. Белинский, Собрание сочинений в 9 томах, т. 4, Статьи, рецензии и заметки, март 1841 – март 1842, Москва 1979, с. 498.

[13] Л. Баршчэўскі [і інш.], Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён: папулярныя нарысы, Мінск 2006, с. 77.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

высмейваецца, парадзіруецца). На пытанне пра вядомасць твораў Гамера і Вергілія ў XIX ст. можа адказаць не толькі тагачасная праграма навучальных устаноў, але і мастацкія тэксты. Напрыклад, у кнізе Я. Баршчэўскага "*Шляхціц Завальня*" Янка (асобу героя можна супаставіць з асобай самаго аўтара) па просьбе дзядзькі расказвае пра тое, чаму вучылі яго ў езуіцкай школе: "Трэба было і мне расказаць што-небудзь падобнае, таму вырашыў пачаць з "*Адысеі*" Гамера, бо ў гэтай паэме поўна чараў і дзіваў, як і ў нашых простанародных аповесцях"[14]. Цікава, як пры гэтым "*Адысею*" ўспрынялі некаторыя з чэлядзі: "Нам гэтай басні ня выўчыцца, усё што-то ні па-нашаму, тут нічога не прыпомніш"[15]. І як сам шляхціц Завальня: "Але твая ўчарашняя гісторыя вельмі вучоная, хоць забі, не помню аніводнага прозвішча тых паганскіх багоў"[16]. Пазней Завальня прызвычайваецца да дзіўных "чужых" апавяданняў пляменніка: "найбольш падабалася з "*Адысеі*" мудрасць Уліса на берагах Цырцэі і на востраве цыклопаў", "не мог таксама ён забыць шостае песні з Вергілія, дзе Эней увайшоў у пекла"[17]. Варта згадаць і далейшы каментар шляхціца да новай (ужо не старажытнагрэчаскай ці старажытнарымскай, а беларускай) гісторыі: "А што, Янка, ці падабаюцца табе нашы простыя апавяданні? Яны праўдзівыя, і іх лягчэй зразумець, чым гісторыі пра даўніх паганскіх багінь і бажкоў, пра якіх ты мне апавядаў. Такую байку ніхто не запомніць, хіба толькі вучоны чалавек"[18]. Такім чынам, у творы прадстаўленыя некалькі катэгорый чытачоў (у дадзеным выпадку – слухачоў апавяданняў) першай паловы XIX ст.: чэлядзь (сяляне), якія антычны гераічны эпас не ведаюць і не ўспрымаюць; шляхціц Завальня, які нібыта павінны быць адукаваным чалавекам, але творы Гамера і Вергілія не ведае і да іх не надта добра ставіцца (можа быць, з-за таго, што Я. Баршчэўскі паказвае нам хрысціяніна, для якога багі з старажытнагрэчаскай міфалогіі – зусім чужыя); малады адукаваны Янка ("Хто вучыцца, – адказаў я, – той павінен пра ўсё ведаць"[19]), для якога гэтыя творы, відавочна, цікавыя. Заўважым, што пра "*Іліяду*" ў сваёй кнізе Я. Баршчэўскі наогул не згадвае. Пра аблогу Троі яго герой расказвае коратка, бо без гэтай гісторыі не будзе зразумелай ні "*Адысея*", ні "*Энеіда*", але самі ваенныя падзеі не распісвае, бо разумее, што яны будуць занадта складанымі і нецікавымі для яго слухачоў (менавіта пасля гэтага кароткага агляду старажытнагрэчаскай міфалогіі служкі пачынаюць перашэптвацца, што "басня" "дужа цяжкая").

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[14] Я. Баршчэўскі, Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях [у:] Я. Баршчэўскі, Выбраныя творы, Мінск 1998, с. 90.
[15] Я. Баршчэўскі, Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях [у:] Я. Баршчэўскі, Выбраныя творы, Мінск 1998, с. 91.
[16] Я. Баршчэўскі, Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях [у:] Я. Баршчэўскі, Выбраныя творы, Мінск 1998, с. 91.
[17] Я. Баршчэўскі, Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях [у:] Я. Баршчэўскі, Выбраныя творы, Мінск 1998, с. 91.
[18] Я. Баршчэўскі, Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях [у:] Я. Баршчэўскі, Выбраныя творы, Мінск 1998, с. 110.
[19] Я. Баршчэўскі, Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях [у:] Я. Баршчэўскі, Выбраныя творы, Мінск 1998, с. 91.

Пытанне наконт папулярнасці Гамера і Вергілія ў XIX ст. – неадназначнае. Пры ўсіх вартасцях гераічнага эпасу Гамера, ён, як аўтар, верагодна, мусіў быць не такім вядомым. Напрыклад, у эпоху Сярэднявечча Гамер наогул быў незаслужана забыты і вярнуўся да чытачоў толькі ў эпоху Рэнесансу. Затое Вергілій карыстаўся папулярнасцю нават тады, калі многія аўтары знаходзіліся ў цені. Гэта звязана з асаблівым стаўленнем нават не да творчасці, а да асобы аўтара (магчыма, менавіта таму ў беларускай літаратуры мы маем не што-небудзь кшталту “*Іліяда навыварат*”, а “*Энеіду навыварат*”). З наступленнем хрысціянства Вергілій стаў вельмі вядомым, дзякуючы таму, што яму прыпісвалі прароцкія здольнасці (прадказаў нараджэнне цудоўнага немаўля ў “*Буколіках*”), якасці чараўніка, абаронца гарадоў і цэлых народаў. Нездарма менавіта Вергілій суправаджае героя Дантэ ў “*Боскай камедыі*” пры падарожжы ў пекла і чысцец. Вальтэр лічыў Вергілія лепшым за Гамера. “І толькі з Лесінга пачынаюцца крытычныя адносіны да Вергілія як да паэта, пазбаўленага гамераўскай натуральнасці, паэта празмерна штучнага”[20]. Наогул можна бясконца спрачацца наконт пераваг таго або іншага аўтара.

Адзначым, што пародыі на “*Іліяду*” не маюць такой моцнай прывязкі да свайго часу (маюцца на ўвазе не часы Гамера, а час напісання твора), як пародыі на “*Энеіду*”, у якіх сумяшчаюцца два часавыя пласты: эпоха Антычнасці і XVI (XVII ці XIX) ст. (у залежнасці ад таго, калі ўзнікла пародыя). Бо ў шматлікіх “Энеідах навыварат”, “*Вергіліях навыварат*” ці “*Вергіліевых Энеідах*” адлюстраваны сучасныя аўтару рэаліі, што праяўляецца, напрыклад, у выкарыстанні аўтарамі шматлікіх анахранізмаў (у П. Скарона Анхіз носіць акуляры, Эней у выніку шлюбу атрымлівае пятнаццаць тысяч ліўраў рэнты; Дыдона абзывае Энея “швейцарцам”; а ў беларускай “*Энеідзе навыварат*” Дыдона патрабуе “пашпорты”, Эней працуе “канторшчыкам”, траянцы просяць запісаць іх у “крэпасць” і г.д.). Прывязаныя “*Энеіды навыварат*” і да месца: у творах фігуруюць спецыфічныя словы, назвы, этнаграфізмы, якія ўказваюць на тое, дзе насамрэч адбываецца дзеянне (толькі ўмоўна гэта – старажытныя Троя, Карфаген, зямля Лаціна). Усё гэта робіць кожную “*Энеіду навыварат*” выключна французскай або ўкраінскай, або беларускай. Пародыі на “*Энеіду*” адрозніваюцца не толькі геаграфічнымі назвамі, мясцовымі асаблівасцямі, традыцыямі і інш. Варта згадаць і пра тое, што аўтары, калі пісалі пародыю, ставілі перад сабой розныя мэты. Напрыклад, П. Скарон, ствараючы “*Вергілія навыварат*”, імкнуўся (паводле версіі Б. Фантанэля[21]) паказаць, наколькі блізкія вялікае і смешнае, даказаць, што яны знаходзяцца зусім побач і адно лёгка можа стаць іншым, дастаткова ўсяго змяніць пункт погляду. Пародыі ж В. Равінскага і І. Катлярэўскага павінны былі пры дапамозе вядомага твора засведчыць адметнасць нацыянальнай культуры і мовы.

[20] А.Ф. Лосев, Античная литература: Учебник для высшей школы, 7-е изд., Москва 2008, с. 388.

[21] В.Я. Бахмутский [и др.], Комментарий [в:] Спор о древних и новых, Москва 1985, с. 438.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З’яўленне шматлікіх пародый (у тым ліку беларускай) менавіта на “*Энеіду*” Вергілія абумоўлена: 1) аўтарытэтам Вергілія як аўтара і выключнага чалавека, яго папулярнасцю ў еўрапейскіх краінах; 2) магчымасцю выкарыстання вядомага твора (яго сюжэту і вобразаў), як абалонкі, у якую можна ўкласці новы сэнс; 3) складваннем пэўнай традыцыі стварэння пародый менавіта на гэты твор (розныя варыянты пародый маюць шмат падобных рыс).

**6. Мадэрнізацыя літаратурнай класікі з выкарыстаннем сюжэта, герояў, якія, аднак, жывуць у сучасным свеце** (адрозніваецца ад пародыі, бо ў такіх творах адсутнічае камічны эфект ад таго, што старажытныя героі асучасніваюцца). Гэтаму спосабу мадэрнізацыі літаратурнай класікі мы таксама аддадзім больш увагі.

Для разумення такіх тэкстаў часта важным з’яўляецца прачытанне твора-асновы. Недарма пры каменціраванні рамана Д.Джойса “*Уліс*” могуць дадавацца цэлыя табліцы для таго, каб была магчымасць параўнаць адпаведныя эпізоды з “*Адысеі*” Гамера з эпізодамі твора, які стаў энцыклапедыяй мадэрнізму. Адсылае свайго чытача да тэксту І.В.Гётэ “*Фаўст*” і назва рамана Т. Мана “*Доктар Фаўстус*”. Перш чым пазнаёміцца з “*Антыгонай*” ці “*Медэяй*” Ж. Ануя варта пачытаць адпаведныя трагедыі Сафокла і Еўрыпіда, а драматычныя эксперыменты С. Кавалёва нашмат лепш успрымаюцца, калі чытачу (ці гледачу, бо яго п’есы ўсё ж такі разлічаны на тое, што іх будуць ставіць у тэатры) вядомыя творы К. Марашэўскага, Я. Баршчэўскага, С. Пільштыновай, Я. Купалы і інш. Многія такія творы сваёй наяўнасцю сведчаць пра актуальнасць і надзённасць праблем, прадстаўленых у вядомых тэкстах.

Назва твора М. Танка “*Без Тараса на Парнасе*” прымушае чытача згадаць вядомую беларускую паэму. Але гэта –не пародыя на тэкст XIX ст. У гумарыстычным творы “*Без Тараса на Парнасе*” (быў апублікаваны ў часопісе “Вожык” у 1946 г.) М. Танк працягвае літаратурныя традыцыі XIX ст. У паэме К. Вераніцына “*Тарас на Парнасе*” даследчыкі (напрыклад, Г. Кісялёў[22], М. Лазарук[23]) заўважалі паралелі з травесційнымі творамі, памфлетамі і сатырычнымі вершамі XIX ст. Асобна варта адзначыць сувязь паэмы з творам А. Ваейкава “*Вар’яцкі дом*”, у аснове сюжэта якога сон, дзе аўтар наведвае вар’яцкі дом з пацыентамі – рускімі літаратарамі.

“*Тарас на Парнасе*” і “*Без Тараса на Парнасе*”, творы XIX і XX ст., маюць шэраг падобных рыс. Гэтыя тэксты аб’ядноўваюць:

**а) Назва.** М. Танк “перавярнуў” назву паэмы К. Вераніцына, што, з аднаго боку, указвае на вядомы твор, а з іншага боку падкрэслівае адрозненні паміж творамі (нібы аўтар гаворыць: гэта нешта іншае, новае; і сапраўды, героі – пісьменнікі ўжо не XIX, а XX ст.). У дадзеным выпадку дарэчы будзе згадаць іншыя сатырычныя творы XIX ст., напрыклад, паэму “*Энеіда навыварат*”, загаловак якой таксама ўказвае на твор-першакрыніцу – “*Энеіду*” Вергілія. Праўда, у дадзеным выпадку мы не можам казаць менавіта пра традыцыі

[22] Г. Кісялёў, Пошукі імя: манаграфія, Мінск 1978, с. 105 – 118.
[23] М.А. Лазарук, Станаўленне беларускай паэмы (жанр паэмы і некаторыя асаблівасці развіцця беларускай літаратуры ў першай палавіне XIX ст.), Мінск 1968, с. 175 – 179.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

XIX ст., бо “перавернутыя” “*Энеіды*” існавалі і ў XVII, і ў XVIII ст. (напрыклад, “*Вергілій навыварат*” П. Скарона).

**б) Сюжэт.** М. Танк выкарыстоўвае прадстаўленую ў паэме К. Вераніцына камічную сітуацыю, у якую трапілі пісьменнікі: адны аўтары маюць права прайсці на Парнас, паколькі заслужылі сабе месца сваім талентам (Я. Колас, П. Броўка, П. Глебка, А. Куляшоў і г.д.), іншыя з усіх сіл імкнуцца туды трапіць, але не могуць, бо за ўваходам пільна сочаць К. Крапіва і М. Лынькоў. Пры гэтым апісанне дзеянняў і першых, і другіх выклікае ўсмешку. Напрыклад, “пільнейшы брамнік” М. Лынькоў нагадвае адначасова і апостала Пятра, які стаіць пры ўваходзе ў рай і трымае ключ ад яго, і ўзброенага (ключ нагадвае браўнінг), цалкам зямнога ахоўніка, якога хвалююць матэрыяльныя каштоўнасці: “Што вы, чады? // Трэба ведаць вам парадак: // Тут, за гэтымі дзвярымі, // Па пяцьсот рублёў ліміт, // Прамтавары, ганарары, // Скураных пальто па пары, // Шафы для бібліятэкі, // Лекі з лепшае аптэкі, // Непрадбачаныя фонды, // Дапамогі ад Літфонда...”[24]). А К. Крапіва заклікае “не верыць на слова” і прапускаць толькі тых, у каго ёсць адпаведныя дакументы. Тое, што менавіта М. Лынькоў з’яўляецца ў творы брамнікам, не выпадкова, паколькі з 1938 па 1948 гг. пісьменнік быў старшынёй праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

У сюжэтах твораў XIX і XX стст. ёсць падабенства, аднак у М. Танка няма такога злоснага высмейвання аўтараў, як у К. Вераніцына. У паэме “*Тарас на Парнасе*” літаратары апісваюцца нібыта звонку, аднак, разам з тым вымалёўваюцца іх якасці як пісьменнікаў і як людзей: “Гляджу сабе – аж гэта сівы, // Кароткі, тоўсты, як кабан, // Плюгавы, дужа некрасівы, // Крычыць, як ашалелы, пан. // Нясе вялікі мех пан гэты, // Паўным-паўнюсенька набіт. // Усё там кніжкі ды газеты, // Ну, як каробачнік які!”[25]. Гэта можна патлумачыць тым, што М. Танк як-ніяк апісвае сваіх жывых сучаснікаў (ужо былі выпадкі, калі “зубры з рознымі ганаровымі, навуковымі і духоўнымі званнямі”[26] крыўдзіліся на М. Танка з-за сатырычных вершаў і эпіграфаў). Пад вершам была прыпіска: “*Рэпартаж з Пленума Саюза Савецкіх Пісьменнікаў Беларусі*”. М. Танк пералічвае толькі жывых літаратараў. Напрыклад, не згадваюцца Я. Купала, К. Чорны і інш. У М. Танка паказваецца “Парнас” “зямны”, з усімі зямнымі выгодамі, у К. Вераніцына – Парнас міфалагічны (зрэшты, пісьменнік змешвае Парнас і Алімп). На вялікі жаль, у дзённіку М. Танка за 1946 г. няма асаблівых згадак пра падзеі, якія можна было б звязаць з творам “*Без Тараса на Парнасе*” (М. Танк піша: “Закінуў свой дзённік. Не ведаю, ці варта мне да яго і вяртацца”[27].) Аднак, адну заўвагу, зробленую 15.VI.1946, адзначым: “Усё больш крытычна адношуся да сучаснай нашай паэзіі. Пакуль што найбольш абнадзейваюць А. Куляшоў і П. Панчанка. Цікава, што чакае нас за небасхілам

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

[24] М. Танк, “Без Тараса на Парнасе” [у:] М. Танк, Збор твораў у 13 тамах, т. 2. Вершы (1939 – 1954), Мінск 2006, с. 427.
[25] Тарас на Парнасе: народная паэма, рэд. А. Пісьмянкоў, Мінск 2003, с. 14.
[26] М. Танк, Збор твораў у 13 тамах, т. 9. Лісткі календара. Дзённікі (1941–1959), Мінск 2009, с. 266.
[27] М. Танк, Збор твораў у 13 тамах, т. 9. Лісткі календара. Дзённікі (1941–1959), Мінск 2009, с. 389.

іх паэзіі?"[28]. У вершы "*Без Тараса на Парнасе*" М. Танк таксама згадвае гэтых пісьменнікаў: "Хто там новы ўзышоў? // Едзе, едзе Куляшоў! // На "*Цымбалах*" гучна грае, // "*Сцяг брыгады*" ўздымае, // Выязджае на Парнас // На карове-перадойцы, // З малаком у кожнай дойцы"[29]. "Вылез Панчанка з вагону, // І не зняў яшчэ пагоны, // Ды, шукаючы папас, // Прэцца проста на Парнас"[30].

Прадстаўленая ў паэме К. Вераніцына праблема імкнення пасрэдных пісьменнікаў заняць месца сярод літаратурных геніяў хвалявала М. Танка. Калі ў гумарыстычным творы "*Без Тараса на Парнасе*" беларускі аўтар выкарыстоўвае мяккі гумар (ён не кідае нейкіх абвінавачванняў), то ў іншых вершах, у тых, дзе ён не згадвае канкрэтных асобаў, дастаткова злосна высмейваюцца вобразы бяздарных, але фанабэрыстых людзей. Напрыклад, верш "*Эпітафія*": "Тут закончыў свой шлях, дзякуй богу, // Пад плітою магільнай ляжыць // Графаман, пры жыцці якога // Было можна толькі хваліць"[31]. Ці верш "*Вучань класікаў*": "У Гамера ён вучыўся быць сляпым, // У Байрана – кульгаць, // У Поля Фора – донжуаніць, // У Хемінгуэя – піць віскі... // І дзівіцца: чаму яго // Не лічаць класікам"[32].

**в) Ананімнасць.** Доўгі час існавала пытанне, звязанае з аўтарствам "*Тараса на Парнасе*". Змяшчаючы верш "*Без Тараса на Парнасе*" ў часопісе "Вожык", М. Танк не імкнуўся раскрыць сябе, як аўтара, таму твор быў падпісаны псеўданімам Янка Лупаты, якім, акрамя самога М. Танка, карысталіся Я. Брыль, М. Лужанін, П. Панчанка. Ды і ў вершы пісьменнік паспрабаваў адвесці ад сябе падазрэнні, прадставіўшы ў камічным свеце самога сябе: "Ажно цёмна стала ранкам, // Аж гара раве пад танкам, // Аж дыміць, гарыць трава, // Аж здзівіўся Крапіва: // Ці не пахне зноў вайною? // Прэцца Танк праз небасхіл // На 120 конскіх сіл // І крычыць "*Вастрыце зброю*"! // Нарабіў ён столькі пылу, // Проста вочы засляпіла "[33].

**г) Выкарыстанне фальклору.** Паэма "*Тарас на Парнасе*" мае казачны сюжэт, падарожжа героя на Парнас можна параўноўваць з падобнымі фантастычнымі падарожжамі ў іншасвет, якія сустракаюцца ў фальклорных тэкстах. Верш М. Танка мае традыцыйны для фальклорных тэкстаў канец: "Я там з краю пастаяў, // Сэнс прамоў занатаваў // І ў вершы пераклаў, // Хоць гарэліцы не піў, // Але вусны памачыў"[34]. Разам з тым, заканчэнне твора вяртае чытача да паэмы XIX ст. (можна параўнаць фіналы верша М. Танка і паэмы К. Вераніцына: "Дык вось што бачыў наш Тарас, // К багам узлезшы на

[28] М. Танк, Збор твораў у 13 тамах, т. 9. Лісткі календара. Дзённікі (1941–1959), Мінск 2009, с. 388.
[29] М. Танк, "Без Тараса на Парнасе" [у:] М. Танк, Збор твораў у 13 тамах, т. 2. Вершы (1939 – 1954), Мінск 2006, с. 426.
[30] М. Танк, "Без Тараса на Парнасе" [у:] М. Танк, Збор твораў у 13 тамах, т. 2. Вершы (1939 – 1954), Мінск 2006,с. 428.
[31] М. Танк, "Эпітафія" [у:] М. Танк, Збор твораў у 13 тамах, т. 3. Вершы (1954 – 1964), Мінск 2007, с.198.
[32] М. Танк, "Вучань класікаў" [у:] М. Танк, Збор твораў у 13 тамах, т. 4. Вершы (1964 – 1972), Мінск 2007, с. 190.
[33] М. Танк, "Без Тараса на Парнасе" [у:] М. Танк, Збор твораў у 13 тамах, т. 2. Вершы (1939 – 1954), Мінск 2006, с. 426-427.
[34] М. Танк, "Без Тараса на Парнасе" [у:] М. Танк, Збор твораў у 13 тамах, т. 2. Вершы (1939 – 1954), Мінск 2006, с. 430.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Парнас. // Ён гэта мне апавядаў, // А я ў паперку запісаў”[35].). Акрамя таго, толькі напрыканцы верша М. Танка нарэшце згадваецца Тарас, які некалі таксама быў на Парнасе.

**д) Атмасфера своеасаблівага па-карнавальнаму ўпарадкаванага хаосу.** Карнавал дазваляе вольна абіраць сабе маску, якая не абавязкова залежыць ад індывідуальнасці чалавека. У паэме “*Тарас на Парнасе*” героі нібы носяць маскі. Некаторыя спрабуюць выдаць сябе за таленавітых, вартых павагі пісьменнікаў, аднак іх сутнасць становіцца відавочнай праз іх паводзіны. Тарас, як чалавек старонні і неабцяжараны залежнасцю ад пісьменніцкага асяроддзя (яму не трэба друкавацца ў часопісах і, як цёмны селянін-невук, ён можа дазволіць сабе выказацца непаважна пра знакамітых людзей), вельмі тонка прыкмячае пэўныя асаблівасці пісьменнікаў і знаходзіць для кожнага пацешныя і чыста сялянскія параўнанні. Увесь антураж ля падножжа Парнаса нагадвае кірмаш з яго прыцэньваннем, штурханінай, крыкамі, гандлем і жаданнем найхутчэй збыць свой тавар (у дадзеным выпадку гэта – талент, кніжкі).

Калі пісьменнікі становяцца падобнымі да гандляроў, то багі апранаюць маскі сялян. Ці нават хутчэй наадварот: сяляне носяць маскі багоў. Імёны ў багоў, як і належыць, старажытнагрэчаскія альбо старажытнарымскія. Аднак простыя паводзіны, сялянскі побыт і выгляд багоў ніяк не стасуюцца з важкімі і гучнымі зеўсамі, марсамі, венерамі і г. д. У паэме перавернута традыцыйнае ўяўленне пра стан рэчаў у сусвеце: сяляне жывуць на Парнасе, у той час як паны-“пісацелі” стаяць недзе ля падножжа гары і ўсёй душой прагнуць трапіць на вяршыню. Пры гэтым у багоў-сялян адсутнічае панская ўладарнасць, пагарда да “чорнай” працы. Нязванага госця Тараса яны прымаюць вельмі добра, кормяць і нават дахаты адпраўляюць з суправаджэннем. Прыраўноўванне багоў да сялян смяшыць, але ніколькі не прыніжае іх. Нягледзячы на тое, што багі толькі імёнамі, а не ладам жыцця, нагадваюць жыхароў Алімпа, асноўныя функцыі кожнага адпавядаюць міфалагічным. Селянін Зеўс, галоўны над багамі, як і належыць яму, кіруе, сялянка Геба ўсіх корміць і г. д. Імёны герояў і ёсць іх маскі, якім яны спрабуюць адпавядаць. Між іншым, гэтая карнавальнасць паэмы з яе зменай масак, своеасаблівым пераапрананнем і прымерваннем чужога статусу была выдатна прыкмечаная драматургам С. Кавалёвым пры напісанні сучаснай п’есы “*Тарас на Парнасе*”.

Атмасфера своеасаблівага па-карнавальнаму ўпарадкаванага хаосу пануе і ў вершы М. Танка. Пісьменнікі мітусяцца, хвалююцца, выкарыстоўваюць пэўныя сродкі, каб патрапіць на Парнас. А. Куляшоў грае на “*Цымбалах*”, нясе “*Сцяг брыгады*”. М. Танк едзе на танку. “Ілля Гурскі не прарок, // А гнілля шмат навалок. // Спляжыў лесу дзесяціну, // Пер’я з двух гусей спісаў // І атраманту кварцінай // Стог паперы змарнаваў. // Гарадзіў ён, гарадзіў – // Полк салдатаў напладзіў[36]. Тое, з чым з’яўляюцца літаратары на Парнас, звязана непасрэдна з іх творчасцю, з тым, пра што яны пісалі, але аўтар малюе дастаткова абсурдную карціну, бо атрымліваецца, што героі ці прадметы з

[35] Тарас на Парнасе: народная паэма, рэд. А. Пісьмянкоў, Мінск 2003, с. 25.

[36] М. Танк, “Без Тараса на Парнасе” [у:] М. Танк, Збор твораў у 13 тамах, т. 2. Вершы (1939 – 1954), Мінск 2006, с. 429.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

твораў пераходзяць мяжу паміж рэальнасцю і мастацкім светам і дапамагаюць свайму бацьку-аўтару. Напрыклад, Я. Колас не толькі напісаў паэму, ён жыве ў "*Новай зямлі*". Уяўленне пра паэтычны свет, як пра па-карнавальнаму ўпарадкаваны хаос характэрна для некаторых твораў М. Танка. Можна, напрыклад, згадаць верш "*У доме творчасці і адпачынку*": "Кожны дзень пад гітару пяе // Нейкая Дэздэмона Пятроўна, // А зайздросны Атэла яе // Ноччу звоніць ёй па тэлефоне. // Класікі граюць шумна ў казла. // Жонкі іх абмяркоўваюць творы. // Пад акном – хрыплы лямант асла, // Ды злуецца бяссоннае мора. // За сцяною – гармідар, садом. // Дзеляць славу, праўляюць памінкі? // І які чорт назваў гэты дом // Домам творчасці і адпачынку!" [37].

М. Танк, выкарыстоўваючы паэму XIX ст., па-сутнасці паказаў, што з таго часу мала што змянілася, хіба няма ўжо Тараса, які некалі выпадкова патрапіў на Парнас. На сучасным для М. Танка Парнасе выпадковых няма, бо ўсе пісьменнікі праходзяць толькі па адпаведных дакументах. Верш "*Без Тараса на Парнасе*" з'яўляецца своеасаблівым звяном у ланцужку сатырычных твораў пра пісьменнікаў. Пазнейшы твор, "*Сказ пра Лысую гару*" таксама працягвае традыцыі беларускай літаратуры XIX ст. Арыентуючыся на вядомыя тэксты XIX ст., аўтары XX ст. не толькі выкарыстоўваюць мастацкія знаходкі мінулага, але і ствараюць нешта арыгінальнае. Дзякуючы такім творам, як верш М. Танка "*Без Тараса на Парнасе*", чытач можа паглыбіцца ў літаратурны свет сярэдзіны XX ст.

Літаратурная класіка не страчвае сваёй актуальнасці. Яе мадэрнізацыя – доказ гэтаму. Сапраўдны мастацкі тэкст – бясконцы для прачытання. Наяўнасць новых інтэрпрэтацый, спробы адаптаваць тэкст да пэўнай аўдыторыі, да пэўнага часу выкліканы найчасцей неабходнасцю звярнуцца да знакамітых тэкстаў, данесці важныя ідэі, праблемы, якія прадстаўленыя ў творах, да сучаснікаў.

Тычына С.М. )

## ВОБРАЗ ПЛАЧКІ Ў ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

У паэмах і вершах Янкі Купалы ("Сон на кургане", "Ваўкалак", "Хохлік", "Ў вечным боры", "Русалка", "На Дзяды", "Зімою" і інш.) сустракаюцца звышнатуральныя істоты, паходжанне якіх звязана з беларускімі фальклорам і міфалогіяй: русалка, хохолік, вадзянік, лесавік, відма, чорны, ваўкалак, здань, цемнатвор і інш. Некаторыя з іх з'яўляюцца на старонках твораў паэта ў тым жа самым абліччы, у якім іх можна сустрэць у фальклорных тэкстах (ваўкалак, русалкі, хохлік). У іншых жа вобразах толькі ўгадваюцца рысы міфалагічных персанажаў. Напрыклад, у вершы "Ў вечным боры…" ўзнікаюць вобразы "цемнатвораў", якія ўвасабляюць вар'яцтва, нястрыманую і дзікую весялосць, цёмны бок быцця: "Ў вечным боры цемнатворы // Скачуць, плачуць, весяляцца;

[37] М. Танк, "У доме творчасці і адпачынку" [у:] М. Танк, Збор твораў у 13 тамах, т. 3. Вершы (1954 – 1964), Мінск 2007, с. 288.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

// Жнуць, збіраюць дзіва-жніва // Ў сонным полі, ў горкай долі” [4, с. 54]. Даследчык М. Грынчык адзначаў, што дадзеныя вобразы дазволілі паэту выказаць свае рэвалюцыйныя настроі ва ўмовах жорсткай цэнзуры: “Малюнак дзікай начной оргіі “цемнатвораў” успрымаецца як перамога антынародных сіл, якія святкуюць часовую перамогу над “яснаглядамі”. /…/ Жыццёвы сэнс алегорый надзвычай выразны і актуальны, ён адлюстраваў дэмакратычныя, рэвалюцыйныя настроі передавой часткі беларускай творчай інтэлігенцыі, яе непрыняцце царскай палітыкі тэрору і палітычнай рэакцыі пасля задушэння Рэвалюцыі 1905-07. Выкрывальны пафас верша не абмяжоўваецца паказам падзей і мінулага – шырокі грамадскі рэзананс твор атрымліваў ад імкнення твора асудзіць прыгнечанне і дыктат, як бесчалавечныя прынцыпы” [3, с. 604]. Несумненна, вобразы верша з’яўляюцца складанымі і неадназначнымі. Калі, напрыклад, з цемнатворамі больш ці менш зразумелая сітуацыя (яны ўяўляюць сабой сілы зла), то пытанне, хто такія “яснагляды”, на наш пагляд, застаецца адкрытым, бо ў творы няма ніякіх намёкаў (акрамя самой назвы “яснагляды”) на тое, што яны – станоўчыя сілы, якія супрацьпастаўляюцца “цемнатворам”: “Ночай ходзяць, днём заводзяць, // Твораць, мораць яснагляды; // Веюць, сеюць плесні ў песні // На палаці ў кволай хаце” [4, с. 54]. Калі аўтар меў на ўвазе тое, што цемнатворы мораць яснаглядаў (супрацьлеглыя сілы), то чаму ён напісаў: “Твораць, мораць яснагляд**ы** [вылучана С.Т.]” [4, с. 54]? Можа быць яснагляды ў вершы – гэта не іншыя сілы, а хутчэй здольнасць ясна бачыць і правільна меркаваць пра падзеі (бачыць праўду)? Наогул у гэтым вершы амаль што кожнае слова патрабуе пэўнага тлумачэння. Напрыклад, словы “днём заводзяць” можна разумець як “кіруюць днём” ці “пачынаюць днём”. А як можна патлумачыць словы “твораць”, “мораць”? Ствараюць і знішчаюць? Здзяйсняюць нейкія дзеянні, можа, злачынствы і забіваюць ці даводзяць да стомы, усыпляюць? У творы прысутнічае шмат аўтарскіх аказіяналізмаў. Аўтар выкарыстоўвае словы не ва ўласцівых ім значэннях, што ўскладняе разуменне асобных радкоў твора. Па-сутнасці, у гэтым вершы любое слова становіцца таямнічым, бо аўтар укладвае ў яго свой асаблівы сэнс.

Некаторыя фантастычныя персанажы ў творах Я. Купалы не маюць імёнаў, але іх можна суаднесці з пэўнымі фальклорнымі вобразамі. Так у паэме “На Дзяды” сустракаецца вобраз журботнай здані, якую можна пабачыць на кургане. У гэтай здані ўгадваюцца рысы Плачкі (“жаночая міфалагічная постаць, вядомая пераважна з тэрыторыі паўночнай і паўночна-заходняй Беларусі” [7, с. 382]) – таямнічай кабеты, якая наракае на свой лёс або аплаквае нейкае гора. Вобраз Плачкі беларускаму чытачу знаёмы дзякуючы літаратурнай апрацоўцы паданняў, якую здзейсніў у сваім творы “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” Я. Баршчэўскі. Вобразы з твораў Я. Купалы і Я. Баршчэўскага маюць шмат агульнага. Па-першае, гэта кабеты, якія з’яўляюцца ў знакавых месцах (руінах, курганах), што дазваляе меркаваць пра тое, што яны нешта ахоўваюць, магчыма, скарбы (прычым, можа мецца на ўвазе не матэрыяльны скарб, а нацыянальная каштоўнасць, памяць пра нейкія падзеі або людзей). Праўда, у Я. Купалы няма канкрэтных указанняў на тое,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чаму Плачка з яго твора знаходзіцца на кургане (у творах беларускага пісьменніка гэтае месца набывае сімвалічны сэнс, дастаткова згадаць назвы твораў: “Сон на кургане”, “Курган”, “Курганы”). Калі суаднесці сімвал кургана ў гэтым творы і ў паэме “Курган”, то можна выказаць меркаванне наконт таго, што там, магчыма, была пахаваная жанчына, якая пазней стала Плачкай. Тым болей, што ў гусляра з паэмы “Курган” падобны да Плачкі лёс (у дачыненні да яго, як і ў дачыненні да Плачкі з паэмы Я. Купалы, была здзейснена несправядлівасць) і ён таксама час ад часу з’яўляецца на сваім кургане: “Лет за сотню звёў час, ці і болей мо лет, // Зацвілі пераказы ў народзе; // Кажуць людзі: ў год раз ночкай з гуслямі дзед // З кургана, як снег, белы выходзе. // Гуслі строіць свае, струны звонка звіняць. // Жменяй водзіць па іх абамлелай, // І ўсё нешта пяе, што жывым не паняць, // І на месяц глядзіць, як сам, белы” [5, с. 58].

Другое, што яднае вобразы жанчын-зданяў з твораў Я. Купалы і Я. Баршчэўскага, – гэта скаргі, якія чуюць ад Плачкі людзі. У Я. Баршчэўскага Плачка з’яўляецца ў розных месцах і аплаквае многіх (загінулых, памерлых, закатаваных), смуткуе, што людзі сталі хцівыя, прагныя да грошай і золата, не разумеюць, што сапраўдны скарб – гэта не матэрыяльнае багацце (пры гэтым шчодра адорвае грошамі тых, хто падаўся ёй добрым чалавекам). Аднак людзі чулі ад яе словы, што яна гаруе з-за сваіх дзяцей: “Былі і такія цікаўныя, што, чуючы лямант дзіўнае кабеты, падышлі ў вечаровым змроку да яе і са слоў, якія пачулі, зразумелі, што нейкая нешчаслівая маці плача па сваіх дзецях” [1, с. 167]. Прычынай слёз Плачкі з паэмы Я. Купалы таксама з’яўляюцца дзеці. Згодна з фальклорнымі традыцыямі іх у гераіні паэмы было трое: двое сыноў былі кепскія, а трэці – добры (праўда, добрым аказаўся не малодшы, а старэйшы сын): “Працавітага быў першы // Складу і нагібу, // Так, здаецца, што й памершы // Ўсё араў, касіў бы. // За другім была ахвота // К лежні, к панаванню; // За чужой бы жыў работай, // Спаў бы да змяркання. // Трэці ўсіх бы толькі мучыў – // Склад меў быці катам, // З паганякаю на ўзруччы // К здзекам быў заўзятым” [5, с.76]. На першы погляд здаецца, што ў Я. Баршчэўскага пад дзецьмі, з-за якіх бядуе Плачка, разумеюцца розныя людзі, не спалучаныя кроўнымі сувязямі, беларусы ў цэлым, у той час як у Я. Купалы гутарка ідзе якраз пра сямейныя стасункі, пра родных дзяцей і братоў. Аднак, далейшы трагічны лёс Плачкі і яе старэйшага сына, а таксама занадта жорсткія, бесчалавечныя ўчынкі малодшых дзяцей (сярэдні брат “ў плуг запрог свайго браточка // Навек, да сканання, // А мяне асенняй ночкай // Выгнаў на бадзянне” [5, с. 77]; малодшы брат “над старэйшым братам ставіў // Стражы і запоры, // Цела ранамі крывавіў, // Здзекаваўся ў горы /…/” [5, с.77] , над маці ўчыніў суд, пазбавіўшы яе статусу маці (“я – не я ўжо” [ 5, с.77]), і распяў на крыжы), даюць падставы меркаваць, што вобразы трох братоў, трох дзяцей – гэта сімвалы, а вобраз самой Плачкі ўяўляецца шырэй, чым вобраз пакрыўджанай дзецьмі жанчыны.

У артыкуле “Паэт і казачнік з азёрнага краю” даследчык М. Хаўстовіч выказвае меркаванне, што Плачка ў творы “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” – гэта ўвасабленне самой Беларусі, якае смуткуе з-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

за сваіх дзяцей – беларусаў: “Забытая амаль усімі Плачка-Беларусь мусіць апрануць сялянскі строй, бо вышэйшыя класы беларускага грамадства адвярнуліся ад Яе, ім непатрэбна Яе Жывая вада, што, пэўна, не аднаму б абудзіла ягоную нацыянальную самасвядомасць. Паны і шляхта нічога не хочуць ведаць пра Плачку, пагардліва глядзяць на сялянскую сірату. Наадварот, яны звязваюцца з Чарнакніжнікамі, аддаюць свой край пад уладу Белае Сарокі, гаспадыні Паўночнае краіны (выдатны алегарычны вобраз Кацярыны ІІ!), а самі ў вобліку мядзведзяў вартуюць яе багацці; яны наводзяць на Беларусь асташоў, якія нішчаць нашу прыроду ды псуюць норавы люду” [8, с. 22]. Усе вышэйадзначаныя словы слушныя і ў дачыненні да твора Я. Купалы. Нягледзячы на тое, што Плачка сцвярджае, што яна – княжацкага роду, старэйшы сын займаецца сялянскай працай. Пазней яна апавядае, што дзеці зрабілі з яе “сірату” (як у Я. Баршчэўскага: “Няўжо гэта тая самая Плачка, якую бачылі ў ваколіцах Полацка і ў іншых кутках Беларусі, прыходзіць у абліччы сялянскае сіраты” [1, с.173].). Паны і шляхта ў творы Я. Купалы былі паказаны праз вобразы малодшых дзяцей. Мяркуецца, што аўтар невыпадкова не пайшоў за фальклорнай традыцыяй, згодна з якой найчасцей самым добрым і разам з тым самым пакрыўджаным аказваецца малодшае дзіця. Пісьменнік паказвае, што старэйшы брат (а значыць галоўны, першы) – селянін – больш працавіты, больш прывязаны да роднага дому. Гэта сын, які паважае сваю маці, і з яго павінны браць прыклад малодшыя (г.зн. паны і шляхта), павінны слухацца яго. Жорсткасць малодшых братоў тлумачыцца аўтарам тым, што, як і ў Я. Баршчэўскага, шляхта павярнулася ў бок “чужых”: “пайшлі к салодшай ласцы без прычыны”, “утапілі ў чужаніцы душы” [5, с. 76].

Такім чынам, вобраз Плачкі ў паэме “На Дзяды”, як і ў творы “Шляхціц Завальня”, можна супаставіць з вобразам Беларусі, якая аплаквае сваіх мужных, працавітых, пакрыўджаных дзяцей, а таксама свой горкі лёс, які склаўся нешчасліва, дзякуючы намаганням дзяцей-здраднікаў. Наогул, многія жаночыя вобразы, якія сустракаюцца ў творчасці Я. Купалы, маюць непасрэдную сувязь з вобразам Беларусі. Як адзначае П. Васючэнка ў манаграфіі “Беларуская літаратура ХХ стагоддзя і сімвалізм” у Я. Купалы “жанчына – *Маці, Жонка, Нявеста* [тут і далей вылуч. аўт. – С.Т.] – увасабленне *Беларусі* ў розных часавых вымярэннях (мінуўшчына, сучаснасць, будучыня)” [2, с. 62]. Там жа даследчык піша: “Жанчына, як ужо адзначалася, у Купалы з’яўляецца то ў абліччы *Маладой* (Паўлінка, Аленка, Зоська), то *Старой* (Ганулля, Марыля). *Вяселле* ў гэтым кантэксце выглядае як свята і Маладой Беларусі (вызваленне, незалежнасць, шчасная будучыня) і Старой (магчымасць адрадзіцца, паўтарыцца ў дзецях, у нашчадках, перадаць ім *спадчыну*, *скарб*) [2, с. 63].

Несумненна, вобразы Плачкі ў творах Я. Баршчэўскага і Я. Купалы маюць шмат агульнага. Прычым, згодна з меркаваннем М. Хаўстовіча, у Я. Баршчэўскага гэты таямнічы вобраз узнікае ў выніку пераасэнсавання галоўнага вобразу “Трэнасу” М. Сматрыцкага, у той час як вобраз з паэмы “На Дзяды” верагодна з’яўляецца ў тым ліку дзякуючы гэтаму пераасэнсаванню. Несумненным бачыцца і тое, што праз гэтыя вобразы аўтары імкнуліся

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

перадаць у першую чаргу тыя праблемы, якія іх вельмі турбавалі, – гэтыя праблемы былі звязаныя з лёсам Беларусі, з яе далейшым шляхам, а таксама з яе "дзецьмі", якія здольныя загубіць, знішчыць свой край і свой народ не горш за чужынцаў.

## Спіс літаратуры


8. Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі // Укладанне, прадмова і каментарыі М. Хаўстовіча. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1998. – 480 с.
9. Васючэнка, П.В. Беларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм/ П.В. Васючэнка. – Мінск: МДЛУ, 2004. – 155 с.
10. Грынчык М.М. "Ў вечным боры…" / М.М. Грынчык // Янка Купала: Энцыклапедычны даведнік/ БелСЭ. – Мінск: БелСЭ, 1986. – С. 604.
11. Купала, Я. Ў вечным боры… / Я. Купала // Поўны збор твораў: У 9 т. Т. 3. Вершы, пераклады 1911 – 1914 // Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1997. – С. 54.
12. Купала, Я. Поўны збор твораў: У 9 т. Т. 6. Паэмы. Пераклады // Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1999. – 430 с.
13. Купала, Я. Чаму плача песня наша? / Я. Купала // Поўны збор твораў: У 9 т. Т. 8. Артыкулы, нататкі, выступленні. Калектыўныя творы. – Мінск: Маст. літ., 2002. – С. 26-28.
14. Санько, С. Плачка / С. Санько // Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч [і інш.]. – Мінск, 2004. – С. 163-166.
15. Хаўстовіч, М.В. Паэт і казачнік з азёрнага краю / М.В. Хаўстовіч // Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / Укладанне, прадмова і каментарыі М. Хаўстовіча. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1998. – С. 5-28.



**Тычына С.М.**


## АСАБЛІВАСЦІ СПАЛУЧЭННЯ РЫС РОЗНЫХ ПЛЫНЯЎ У ТВОРЧАСЦІ ЯНКІ КУПАЛЫ

Сусветны літаратурны працэс першай паловы XX ст. вызначыўся разнастайнымі мастацкімі эксперыментамі, якія тычыліся як формы, вобразаў, так і зместу твораў. У гэты час ўзнікалі шматлікія мастацкія плыні, якія суіснавалі, узаемаўзбагачаліся і дапамагалі аўтару намацаць свой уласны творчы шлях. Яскравыя прыклады спалучэння рыс розных мастацкіх плыняў ў беларускай літаратуры можна назіраць у творчасці пісьменнікаў пачатку XX ст.: Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, З. Бядулі, М. Гарэцкага і інш.

У мастацкіх тэкстах Я. Купалы беларускія даследчыкі адзначалі рысы рамантызму, рэалізму і сімвалізму. Найбольш увагі літаратуразнаўцы ўдзялялі праявам рамантызму ў тэкстах беларускага класіка. Пра што сведчыць і артыкул "Рамантызм творчасці Янкі Купалы" ў энцыклапедычным даведніку 1986 года, у той час як іншым плыням асобнага месца ў манументальнай працы не знайшлося. Тым не менш у тым жа артыкуле гутарка ідзе і пра рэалізм, які ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творчасці Я. Купалы цесна знітаваны з рамантызмам: "У К. амаль няма вобразаў, створаных чыста рэаліст. сродкамі тыпізацыі: адметны, вельмі своеасаблівы купалаўскі рэалізм амаль заўсёды ідзе побач з рамантызмам, з "матэрыялізацыяй" суб'ектыўнага пачатку, які не можа знайсці апоры ў тыповасці характараў і абставін" [6, с. 524]. Сімвалізм, як блізкі паэту напрамак, не згадваецца ў даведніку наогул (у артыкуле "Сімвал у творчасці Янкі Купалы" У. Конан адзначае, што сімволіка беларускага аўтара арганічна спалучае рэалістычныя і рамантычныя пачаткі [3, с. 558]), што тлумачыцца асаблівасцямі развіцця літаратуразнаўства ў той час, бо І. Навуменка, аўтар артыкула "Рамантызм творчасці Янкі Купалы" ўжо ў раздзеле "Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя" (1999 г.), які быў прысвечаны творчасці паэта, піша: "Янка Купала не прайшоў міма пэўных мастацкіх форм, выпрацаваных паэтамі-сімвалістамі і імпрэсіяністамі, яны мелі на яго бясспрэчны ўплыў" [7, с. 132]. Надзвычай цікавае даследаванне, прысвечанае праявам сімвалізму ў творчасці Янкі Купалы, было праведзена П. Васючэнкам у манаграфіі "Беларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм".

Наогул, калі разглядаць літаратурную спадчыну Янкі Купалы з пункту погляду асаблівасцей той або іншай плыні, вынікае, што значная частка яго твораў ўтрымлівае адначасова рысы розных кірункаў. Так, рамантызм праявіў сябе ў:

- сувязі з фальклорам (напрыклад, фальклорныя вобразы з'яўляюцца ў паэмах "Сон на кургане", "На Дзяды");
- з'яўленні спецыфічнага рамантычнага героя-бунтара (такія героі сустракаюцца ў паэмах "Курган", "Бандароўна" і інш.);
- мастацкім максімалізме (героі мусяць зрабіць выбар паміж ганьбай і смерцю, падзяляюцца на станоўчых і адмоўных, як, напрыклад, у вышэйадзначаных паэмах);
- цікавасці да нацыянальнай гісторыі (паэма "Гарыслава");
- прадстаўленні ў творах іерархічнай карціны свету, дзе матэрыяльнае падпарадкоўваецца духоўнаму (у творах "Курган", "Бандароўна" паказана, што праўда, справядлівасць, годнасць, прынцыпы, жыццёвыя пазіцыі больш каштоўныя чым золата і для герояў яны важней нават за ўласнае жыццё);
- цікавасці да пачуццяў і перажыванняў чалавека (вершы "Маё цярпенне", "Быў гэта сон");
- ідэалізацыі (гераіня паэмы "Бандароўна" з'яўляецца ўвасабленнем ідэалу вонкавай і ўнутранай прыгажосці);
- з'яўленні двух светаў (у драматычнай паэме "Сон на кургане" гэтыя светы суіснуюць).

Рэалізм у творчасці Янкі Купалы выявіўся ў:

- прытрымліванні ў некаторых творах прынцыпу жыццёвай праўды (аўтар, несумненна, робіць акцэнт на жыццёвай сітуацыі, калі апісвае праблемы сям'і Зяблікаў у драме "Раскіданае гняздо");
- сацыяльным аналізе і гістарызме мыслення (Янка Купала імкнуўся звярнуць увагу на праблемы, якія існуюць у грамадстве і якія ўзніклі ў сувязі з



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пэўнымі сацыяльна-гістарычнымі абставінамі; гэта знайшло адлюстраванне, напрыклад, у яго творах, прысвечаных беларускаму мужыку (“Мужык”, “Што ты спіш?”, “Пашкадуй мужыка””));

– крытычных адносінах да існуючых праблем (беларускі аўтар не толькі прадстаўляе праблему, але і засяроджваецца на выкрыванні заганных бакоў жыцця, чалавечых дзеянняў, несправядлівасці і г.д. як, напрыклад, у п’есе “Тутэйшыя”, паэме “Калека”);

– паказе ўзаемадзеяння чалавека і грамадства, якое можа зламаць чалавека, вымушае яго падпарадкавацца, прыняць законы, па якіх жыве большасць людзей (гэта выяўляецца ў творы “Раскіданае гняздо”, напрыклад, у эпізодах, звязаных са старэйшым пакаленнем: Лявона Зяблікам, які заканчвае жыццё самагубствам, і Марыляй Зяблік, якая шые сваім дзецям торбачкі);

– з’яўленні негераічнага героя (ці, інакш кажучы, звычайных, нічым не адметных, не здатных да подзвігаў людзей, якія можна сустрэць, у прыватнасці, у п’есах Я. Купалы).

З такой характарыстыкай рэалізму як тыпізацыя, як ужо адзначаў І. Навуменка, ёсць пэўныя праблемы. З аднаго боку, большасць галоўных герояў Я. Купалы з’яўляюцца яркай індывідуальнасцю, гэта людзі са сваімі поглядамі і меркаваннямі, яны выбіваюцца з шэрагу іншых людзей, з іншага – аўтар часцей выбірае прадстаўнікоў пэўнага асяроддзя (напрыклад, сялян) і на іх прыкладзе паказвае спецыфіку жыцця і фарміравання характару чалавека з пэўнага сацыяльнага слоя. У п’есе “Тутэйшыя” найбольш выявілася схільнасць пісьменніка да тыпізацыі ў вобразах Мікіты Зноска, Насты Пабягунскай, Заходняга і Усходняга вучоных і г.д.

Існуе яшчэ адзін момант, які яднае творчасць Янкі Купалы з творчасцю пісьменнікаў-рэалістаў: цікавасць да дзіцячых вобразаў і вобразаў падлеткаў як самастойных асоб, не статычных, а актыўных, дзейсных персанажаў. Справа ў тым, што да XIX ст., да з’яўлення твораў рэалістаў Ч. Дзікенса, Ф. Дастаеўскага, Л. Талстога ў літаратуры вельмі мала ўвагі ўдзялялася менавіта дзецям, жыццё і характары якіх фактычна не разглядаліся падрабязна. Не былі прадстаўлены і праблемы, звязаныя з эксплуатацыяй, здзекамі з дзяцей. Менавіта аўтары-рэалісты найбольш поўна прадставілі праблему пакрыўджанага безабароннага дзіцёнка, які поўнасцю залежыць ад дарослых пры тым, што дзіця з’яўляецца ўжо асобай. Такі пункт погляду (дзіця і падлетак – гэта асоба) прадстаўлены ў творы Янкі Купалы “Раскіданае гняздо”. У драме мы сустракаем чатырнаццацігадовага Данілку, які здаецца мудрэйшым і разумнейшым за дарослых, ад якіх залежыць яго жыццё і нават тое, будзе ён іграць на скрыпачцы ці не. У першадруку аўтар ахарактарызаваў яго наступным чынам: “Данілка – 14 г. Разумны хлопец не па сваіх гадах, чамусьці лічаць яго скарэй за дурнаватага, чымся за разумнага. Цікавіцца ўсім чыста, але часта неўпапад задае пытанні. Яму ўсе патураюць, мала зварочваюць на яго асобу ўвагу” [5, с. 387]. Данілка мірыцца са сваім статусам “дзіця” і не крыўдуе, калі да яго слоў не прыслухоўваюцца. Але, трэба сказаць, ігнаруюць яго цалкам не апраўдана. Значная частка па-жыццёваму мудрых выказванняў, назіранняў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заўваг належыць менавіта гэтаму герою. У яго свая пазіцыя, свой погляд на ўсё. Яму бракуе вопыту і ён спрабуе дабіцца ў людзей адказу на пытанні, якія яму падаюцца важнымі (“Мусіць, вялікі, дзедка, свет гэты? Ці канец яму ёсць дзе, ці няма? Я ні ў каго не магу гэтага даведацца” [5, с. 254]). Пры гэтым ён разумее, што ў дарослых не на ўсё ёсць адказ, што дарослыя яшчэ болей заблыталіся ў пытаннях, у жыцці, чым дзеці, для якіх усё дастаткова проста. У кароткіх заўвагах Данілкі сканцэнтравана вельмі багата інфармацыі. Напрыклад, у канцы драмы старац бачыць Зоську і з жахам выгукае: “Божа! Божа! Што з яе асталося?” [5, с. 259]. Данілка адказвае яму: “Толькі цень ды вянок з лісця” [5, с. 259]. Ён адразу разумее, што старац найперш мае на ўвазе не вонкавы выгляд дзяўчыны, а яе душэўны стан. Ад вясёлай дзяўчыны, якая верыла ў прыгожыя сны і шчасце, не засталося нічога.

Цікава, што вобраз Данілкі адначасова звязвае творчасць Янкі Купалы не толькі з рэалізмам, але і з сімвалізмам. У Данілкі ёсць свая мэта ў жыцці і для дарослых яна выглядае дастаткова несамавіта – зрабіць добрую скрыпачку і іграць на ёй. Але, як слушна заўважае П. Васючэнка ў манаграфіі “Беларуская літаратура ХХ стагоддзя і сімвалізм”, шэраг нібыта выпадковых рэчаў, якія сустракаюцца ў творах Я. Купалы, з’яўляюцца вобразамі-сімваламі: “...тапор у руках Сама (драматычная паэма “Сон на кургане) або Сымона (“Раскіданае гняздо”), гуслі на грудзях у аднаго з ганцоў у паэме “На Куццю”, скрыпка, якую майструе Данілка (“Раскіданае гняздо”), славутая балалайка, што вісіць на сцяне ў кватэры калежскага рэгістратара Мікіты Зноска (“Тутэйшыя”). Спарадычнасць гэтых артэфактаў нібыта навідавоку. Але ў мастацкай сістэме Купалы гэтыя вобразы, нягледзячы на іх лакальнасць і рэчыўнасць, займаюць значнае месца. Тапор сімвалізуе змаганне і гвалт, скрыпка – нерэалізаваную прагу гармоніі і хараства, гуслі – вобраз мастацтва і адвечнае, неўміручае красы” [2, с. 60]. Данілка трымаецца за сваю скрыпку, як за нешта, больш каштоўнае за яго асабістае жыццё. Таму ён просіць брата лепш пасячы яго самога на дробныя кавалачкі, але скрыпкі не чапаць. Тут трэба адзначыць наступны момант: як гармонію і шчасце разбурае гвалт і злосць, так скрыпачка Данілкі ўвесь час знаходзіцца пад пагрозай знішчэння ад гневу блізкіх. Першапачатковы варыянт скрыпкі (можа быць, не такі і ўдалы) бацька са злосці паламаў. Калі Данілка рабіў новую, то сапсаваў вярхнік з-за Сымона. Разам з тым, са скрыпкай Данілка нейкім чынам звязвае сваё прызначэнне на зямлі: “Ну, але затое калі і зраблю, дык вот жа зайграю – цэлы свет дзіву дасца!” [5, с. 205]. Словы Данілкі можна суаднесці з вершам Ф. Багушэвіча “Мая дудка”: “Эх, скручу я дудку! // Такое зайграю, // Што ўсім будзе чутка // Ад краю да краю!” [1, с. 18].

Пра сувязь творчасці Янкі Купалы з сімвалізмам сведчыць не толькі наяўнасць шматзначных сімвалаў, якія павінныя дапамагчы пранікнуць у сутнасць чалавечага быцця, схаваных з’яў, але і надзвычайная музычнасць твораў паэта, якія здольныя ўразіць чытача не толькі вобразамі, сэнсам, але і гучаннем. Напрыклад, у вершы “Смейся!” праз руплівы падбор слоў аўтар дасягае асаблівага эфекту: “Смейся смехам-сычэннем праз скрогат //



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Перадсмертны зубоў і рассейся” [4, с.8]. Яшчэ адна асаблівасць сімвалізму – выяўленне ў творах адчування варожасці гэтага свету, страху, бяссілля – таксама знайшла адлюстраванне ў творчасці паэта (напрыклад, у вершы “Паязджане”).

Такім чынам, у творах Янкі Купалы можна выявіць рысы розных плыняў, якія цесна спалучаюцца і пераплятаюцца адна з адной. Цікавасць да розных спосабаў выяўлення жыццёвых фактаў, чалавечых гісторый, сваіх уласных назіранняў, перажыванняў, думак, ідэй сведчыць пра складаныя творчыя пошукі аўтара, які, несумненна, здолеў знайсці свой арыгінальны, непаўторны, адметны творчы стыль.

**Спіс літаратуры**

16. Багушэвіч, Ф. Творы: Вершы, паэма, апавяданні, артыкулы, лісты / Ф. Багушэвіч / Уклад., прадм. Я. Янушкевіча; Камент. У. Содаля, Я. Янушкевіча. – Мінск: Маст. літ., 1991. – 309 с.
17. Васючэнка, П.В. Беларуская літаратура ХХ стагоддзя і сімвалізм. – Мінск: МДЛУ, 2004. – 155 с.
18. Конан, У.М. Сімвал у творчасці Янкі Купалы // У.М. Конан // Янка Купала: Энцыклапедычны даведнік/ БелСЭ. – Мінск: БелСЭ, 1986. – С. 558-559.
19. Купала, Я. Поўны збор твораў: У 9 т. Т. 4. Вершы, пераклады 1915 – 1929 // Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 2001. – 446 с.
20. Купала, Я. Поўны збор твораў: У 9 т. Т. 7. Драматычныя паэмы і п’есы // Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 2001. – 399 с.
21. Навуменка, І.Я. Рамантызм творчасці Янкі Купалы // І.Я. Навуменка // Янка Купала: Энцыклапедычны даведнік/ БелСЭ. – Мінск: БелСЭ, 1986. – С. 523-525.
22. Навуменка, І.Я. Янка Купала // І.Я. Навуменка // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ ст.: У 4 т. Т. 1 / Нац. акад. навук Беларусі. – Мінск: Беларуская навука, 1999. – С. 121-175.

Тычына С.М.

## АСАБЛІВАСЦІ СПАЛУЧЭННЯ РЫС РОЗНЫХ ПЛЫНЯЎ У ТВОРЧАСЦІ М. ГАРЭЦКАГА

Мастацкія плыні – дастаткова складаная з’ява. З аднаго боку тое, што напрамкі ўзнікаюць у розных літаратурах у пэўнай паслядоўнасці і прыкладна ў адзін і той жа перыяд, сведчыць пра іх міжнацыянальны характар, з іншага боку – асаблівасці праяўлення таго або іншага напрамку ў розных краінах могуць быць настолькі рознымі, што аднесці іх да аднаго тыпу вельмі цяжка. Акрамя таго, плыні часта не існуюць адасоблена адна ад другой, яны могуць не проста кантактаваць, але і пераплятацца ў творчасці (і нават у межах канкрэтнага твора) аднаго і таго ж пісьменніка. Адны і тыя ж рысы могуць быць уласцівыя розным мастацкім кірункам, што робіць праблематычным вызначэнне прыналежнасці нават невялікага па сваім аб’ёме твора да адной

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пэўнай плыні. Так, напрыклад, пра вершы французскага паэта П. Верлена могуць пісаць у кантэксце і сімвалізму, і імпрэсіянізму.

Аўтары знаходзяцца ў пастаянным пошуку, мяняюць свае погляды, імкнуцца да адкрыцця аптымальных спосабаў выяўлення сваіх думак. Таму мы можам назіраць, як рамантык становіцца імпрэсіяністам, пасля імпрэсіяніст пераходзіць да натуралізму, які завяршае свой творчы шлях рэалістам (напрыклад, нешта падобнае можна назіраць у творчасці тэарэтыка натуралізму Э. Заля). Ці значыць гэта, што аўтар поўнасцю пачынае адмаўляцца ад сваіх першапачатковых творчых шляхоў? Калі параўнаць рысы розных мастацкіх плыняў, то можна з упэўненасцю сказаць, што яны настолькі могуць супярэчыць адна адной, што іх сустрэча ў межах аднаго твора здаецца абсурднай. Напрыклад, для рэалізму характэрны прынцып жыццёвай праўды, у рамантызме выкарыстоўваецца фантастыка і падзел светаў на некалькі, што не надта стасуецца з вышэйадзначанай рысай рэалізму, а гэта значыць, што суіснаваць у адным тэксце яны не павінны. Тым не менш у літаратуры гэта магчыма, бо плыні не накладваюць на аўтара нейкія абавязкі, яны наадварот падпарадкоўваюцца аўтарам, якія імкнуцца да творчай свабоды нават тады, калі абставіны часу і гісторыі гэтаму не спрыяюць.

Праяўленне ў творчасці пісьменніка рыс новай плыні не абазначае, што ён поўнасцю адмаўляецца ад таго, што было ў яго творчасці раней. Тое, што аўтар пачынае ў пэўны час аддаваць перавагу прыёмам, якія характэрныя для нейкага кірунку, можна растлумачыць рознымі прычынамі. Асаблівасці, характэрныя для пэўнага напрамку, больш дакладна дазваляюць перадаць ідэі, думкі, адчуванні, перажыванні аўтара, таму ён можа адысці на нейкі час ад звыклай для яго манеры выкладання падзей (напрыклад, пра творчасць А. Адамовіча звычайна гавораць у кантэксце рэалізму, аднак у яго аповесці “Карнікі” свядома выкарыстаны прыёмы літаратуры плыні свядомасці, з дапамогай якіх аўтар паспрабаваў пранікнуць у падсвядомасць людзей, якія пераступілі праз запаведзь “не забі”, таму ў творы факты і дакументальныя звесткі пераплятаюцца з думкамі і адчуваннямі, фантазіямі і страхамі герояў, з якіх складаецца агульны пачварны малюнак іх душ). Паколькі мастацкія плыні з’яўляюцца своеасаблівым адлюстраваннем поглядаў і наогул спецыфікі свайго часу і гісторыі, атрымліваецца, што для таго, каб паказаць у творы сучаснасць, аўтар так ці інакш мусіць прыйсці да “актуальнай” на той момант плыні (ці можа стаць ініцыятарам узнікнення новай плыні, якая, на яго погляд, будзе лепш паказваць свой час). Акрамя таго, літаратурная спадчына аўтарытэтных пісьменнікаў становіцца часам першапачатковай асновай, на якую апіраецца ў сваіх творчых пошуках малады пісьменнік, з іншых твораў аўтары чэрпаюць сваё натхненне.

Непарыўнасць і ўзаемасувязь сусветнага літаратурнага працэсу абумоўлівае ўплыў адной літаратуры на іншую (напрыклад, даследчык П. Васючэнка вызначае чатыры крыніцы ўздзеяння еўрапейскага сімвалізму на беларускую літаратуру: “Гэта французскі сімвалізм, прадстаўлены творчасцю “праклятых паэтаў”, іх папярэднікаў, спадарожнікаў і паслядоўнікаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(Ш. Бадлера, П Верлена, А. Рэмбо, С. Малармэ ды інш.); паўночны сімвалізм, рэпрэзентаваны асобамі Г. Ібсена, К. Гамсуна, А. Стрындберга, а таксама нямецкі (Г. Гаўптман), бяльгійскі (М. Метэрлінк, Э. Верхарн); польская (кракаўская) школа (С. Выспянскі, С. Пшыбышэўскі); рускі сімвалізм (творчасць А. Блока, В. Брусава, Л. Андрэева, А. Белага ды інш.)" [1, с. 43].

Асабліва часта спецыфічнае спалучэнне разнастайных мастацкіх плыняў, наяўнасць гібрыдных форм [3, с. 233] можна назіраць у літаратуры тых краін, дзе адбываўся паскораны працэс развіцця прыгожага пісьменства (як, напрыклад, у Беларусі). "Фарміраванне нацыянальных асноў беларускай літаратуры, якое адбывалася ў цяжкіх умовах падаўлення духоўных магчымасцей краю, складвалася з двух асноўных працэсаў, якія паступова збліжаліся: запазычання багатага вопыту літаратур братніх славянскіх народаў і выпрацоўкі нацыянальных вобразна-стылявых сродкаў мастацкага выяўлення свядомасці на аснове традыцыйных народных уяўленняў і звароту да фальклорных твораў. Гэтыя працэсы былі надзвычай складаныя. Яны адбываліся ў спецыфічных абставінах грамадскага развіцця і мелі свае асаблівасці: паскоранасць, адсутнасць адзінага творчага метаду і выразнага нацыянальнага вобліку" [4, с. 202].

Асабліва яскравыя прыклады спалучэння рыс розных мастацкіх плыняў ў беларускай літаратуры можна назіраць у творчасці пісьменнікаў пачатку XX ст.: Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, З. Бядулі, М. Гарэцкага і інш. У мастацкіх тэкстах М. Гарэцкага, згодна з даследаваннямі літаратуразнаўцаў, сустракаюцца:

– рэалізм ("У пераважнай большасці апавяданні ранняй пары напісаны з пазіцый асветніцкага рэалізму" [5, с.382], "Лічачы сябе пераемнікам вопыту мастакоў-рэалістаў, М. Гарэцкі актыўна падтрымаў так званую народніцкую літаратуру" [5, с. 394].);

– сімвалізм ("Рэфлексійнасць і дапытлівасць, пераўтваральны пачатак, зачараванасць "патаёмным" – гэтыя якасці творчай асобы пісьменніка актуальныя і сёння. Яны выспеліліся дзякуючы творчаму пераасэнсаванню майстрам мастацкага вопыту сімвалізму. У змаганні з ірацыянальнымі, варожымі для чалавека праявамі быцця варта спадзявацца адначасова на веру і веды, інтуіцыю і творчасць, як гэта рабіў Максім Гарэцкі" [1, с. 144].);

– экзістэнцыялізм ("Экзістэнцыялізм – з'ява агульнай еўрапейскай культуры. Гэта падцвярджае адначасовы яго ўсплеск у творах С. К'еркегора, Ф. Цютчава, Ф. Кафкі, Л. Андрэева, А. Белага, Янкі Купалы, Максіма Гарэцкага і іншых філосафаў і мастакоў прыгожага пісьменства" [6, с.103].

Сімвалізм праяўляецца ў ранніх апавяданнях М. Гарэцкага ("Патаёмнае", "Што яно?", "Стогны душы", "Сумная дзяўчынка" і інш.), у якіх адлюстравана адчуванне складанасці сусвету і немагчымасці спасцігнуць чалавечае быццё, страх і захапленне наваколлем і людзьмі. Героі часта не з'яўляюцца канкрэтнымі людзьмі са сваёй гісторыяй, сям'ёй, канкрэтным аблічам і становішчам у грамадстве. Нават калі аўтар піша, здаецца, пра пэўнага чалавека, якога можна сустрэць на вуліцы ў любы час, з-за спецыфікі перадачы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

асаблівасцей гэтага героя, складваецца ўяўленне, што для М. Гарэцкага гэты вобраз нешта большае чым звычайны чалавек; ён можа аказацца адлюстраваннем страху, які пануе на зямлі, ці прыгажосці, ці таямніцы. Так, напрыклад, вобраз з апавядання “Сумная дзяўчынка” найбольш набліжаны да прыцягальнага для пісьменнікаў-сімвалістаў вобраза таямнічай жанчыны, якая з’яўляецца ўвасабленнем прыгажосці свету і быцця. Сумная дзяўчыка не мае імя, нічога не вядома пра яе мінулае. Аўтар піша, што яна хацела б быць вясёлай, бо сама любіць вясёлых людзей, але ў яе нічога не атрымліваецца. Зусім нязначныя рэчы (напрыклад тое, што маладзіца мые шыбы) прымушаюць яе задумвацца і твар яе пры гэтым робіцца засмучаным. Яе вобраз – вельмі далікатны, жаноцкі. Сум яе ідзе з самай глыбіні душы, таму ўяўная весялосць робіць яе “вялікаю дуроніцаю” [2, с.133]. Дзяўчынка не мае ўлады над самой сабой, над сваёю журбою, яна знаходзіцца ў палоне сваіх “нявыказаных, адзінокіх думак” [2, с.132]. Яе ціхі, засмучаны выгляд вабіць людзей. Калі яна ўдае весялосць, то становіцца звычайнай, зямной (яна і стараецца быць “як усе”: жартаваць, кпіць, смяяцца, цешыцца і цікавіцца тым, чым і яе сяброўкі). Але нават “наўмыснаю вясёласцю не змагла яна свайго невядомага, прыгожага засмучэння, толькі зрабіла яго яшчэ танчэйшым, яшчэ далікатнейшым” [2, с.132]. Смех з’яўляецца чужым яе натуры, бо ён робіць яе падобнай да іншых дзяўчат. Аўтар паказвае, што яе памкненне весяліцца – гэта падман, спроба згубіцца ў натоўпе, а між тым яна – іншая, дзіўная, асаблівая ў сваёй журбе. Сум надзяляе яе арэолам таямнічасці, асаблівай прыгажосці, якая нібы асвятляе яе знутры. Менавіта гэтым яна і падабаецца людзям, а самой сабе – і падабаецца, і не. М. Гарэцкі не апісвае вонкавы выгляд сваёй гераіні. Адзінае, на чым ён робіць акцэнт – на надзвычайнай прыгажосці сумнага выгляду дзяўчынкі, якая нібы не ўпэўненая ў сваіх сілах, сваіх здольнасцях прываблівацъ людзей. Дзяўчынка знаходзіцца на той стадыі, калі дзіця (ці падлетак) ператвараецца ў дзяўчыну і жанчыну (адсюль і выкарыстанае аўтарам трапнае параўнанне гераіні з маладой перад сваім вяселлем, ўжыванне вобраза блізкай вясны). Яна нібы стаіць на раздарожжы і спрабуе абраць свой шлях. Яна хоча быць з усімі і не можа змагацца з самою сабой. Тым болей, што ў яе душы хаваецца сапраўднае хараство, якое яна спрабуе адкінуць (усё роўна, што зламаць сябе), бо баіцца аддзяліцца ад усіх. Яна не разумее сама сябе і нават свае думкі не можа патлумачыць самой сабе. Сумная дзяўчынка з’яўляецца ўвасабленнем прыгажосці і таямніцы жыцця, якое можа аднначасова напаўняць сэрца і шчасцем, захапленнем, і сумам, журбою. Яна – няпэўнае, няўлоўнае адчуванне набліжэння нечага незвычайнага, асаблівага. Яна – загадка жыцця, прыроды і чалавечай душы, сутнасць якой застаецца незразумелай і нявытлумачанай. І ўсё ж яна – звычайная дзяўчынка, незнаёмка, якую можна ўбачыць на вуліцы, а можна і не заўважыць сярод такіх жа дзяўчат. У душы сумнай дзяўчынкі жыве нешта такое, што немагчыма спасцігнуць і патлумачыць пры дапамозе розуму, а можна толькі адчуць. Яна і сама не ведае, што гэта такое. Уяўленне пра існаванне ў свеце нечага таямнічага, дaступнага выключна пачуццям і інтуіцыі чалавека, адлюстроўваецца ў многіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

апавяданнях М. Гарэцкага, што падкрэслівае цесную сувязь мастацкай спадчыны беларускага пісьменніка з сімвалізмам. Загадкавасць свету і чалавечага жыцця прымушае герояў і самаго аўтара задаваць пытанні: “Што яно?”, “Нашто яно?” і падобныя. “Пісьменнікі-сімвалісты часта не знаходзілі тэрміна, каб вызначыць стунасць загадкавай субстанцыі, і называлі яе з дапамогай займеннікаў: “яно”, “нешта”, “тое”” [1, с.138]. Вобразы Незнаёмак, якія часта сустракаюцца ў творах М. Гарэцкага, маюць сувязь з гэтым таямнічым “яно”, бо яны хаваюць у сэрцы, у думках і нават у сваім абліччы невядомае, непадуладнае логіцы, навуцы.

Рэалізм у творчасці М. Гарэцкага таксама мае сваю спецыфіку. Справа ў тым, што нават у чыста рэалістычных творах беларускі празаік пакідае месца для ўмоўнасці, недаказанасці, няпэўнасці, таямніцы, характэрных для сімвалізму. Напрыклад, у “Сібірскіх абразках” сабраныя не толькі і нават не столькі гісторыі рэальных людзей, факты, якія аўтар фіксаваў падчас падарожжа. Гэта больш адчуванні, уражанні, перажыванні і думкі. Напрыклад, у замалёўцы “Максімава зязюля” падзей зусім ніякіх няма, тут аўтар перадае думкі, успаміны і меркаванні пра свой лёс і будучыню. Зрэшты, у гэтым заключаецца асаблівасць рэалізму ХХ ст. наогул: рэалізм цесна супрацоўнічае з іншымі плынямі і ўбірае ў сябе іх рысы.

У М. Гарэцкага рэалізм спалучаецца не толькі з сімвалізмам, але і з натуралізмам. Дастаткова часта тэрмін “натуралізм” выкарыстоўваюць як сінонім рэалізму. Важнымі рысамі натуралізму з’яўляюцца фактаграфічнасць, дакладнасць адлюстравання жыцця, цікавасць да тых тэм, якія раней у літаратуры не закраналіся (напрыклад, да паталогій) і інш. Гэтыя рысы сустракаюцца ў многіх творах М. Гарэцкага: “Тамашы”, “Скапцы”, “Кветкі зла”, “Бязногая бабуля” і інш. У сваіх тэкстах беларускі празаік не абыходзіць “вострыя” тэмы, не імкнецца іх завуаляваць, для яго не існуе таго, пра што гаварыць забаронена ці не прыстойна: хваробы, спецыфічныя стасункі, незвычайныя традыцыі, якія людзям з іншага грамадства могуць падацца пачварнымі і г.д. (напрыклад, адразанне грудзей у жанчын, падрабязнае апісанне выгляду хворай на пранцы жанчыны, гвалт і забойства). Важная асаблівасць натуралізму, якая адрознівае яго ад рэалізму, заключаецца ў тым, што аўтар стараецца не даваць ацэнку таму, што ён апісвае, не асуджае герояў за іх учынкі, але спрабуе зрабіць выснову, што магло прывесці чалавека да пэўных дзеянняў. Часцей за ўсё ў творах М. Гарэцкага няма бясстраснасці, якая вылучае чыста натуралістычны твор, ён вельмі востра рэагуе на чужы боль, несправядлівасць, але тым не менш часта яго ацэнка не з’яўляецца відавочнай, паколькі ў аўтара прысутнічае разуменне складанасці жыцця, якое не дазваляе адназначна асуджаць чалавека, бо свет не можа дзяліцца толькі на добрых і злых людзей, кожны чалавек спалучае ў сабе самыя розныя якасці.

Такім чынам, у прозе М. Гарэцкага можна выявіць рысы розных плыняў, якія цесна спалучаюцца і пераплятаюцца адна з адной. Цікавасць да розных спосабаў выяўлення жыццёвых фактаў, чалавечых гісторый, сваіх уласных назіранняў, перажыванняў, думак, ідэй сведчыць пра складаныя творчыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пошукі аўтара, які, несумненна, здолеў знайсці свой арыгінальны, непаўторны, адметны творчы стыль.

**Спіс літаратуры**

1. Васючэнка, П.В. Зачарованасць патаёмным. Максім Гарэцкі і сімвалізм / П.В. Васючэнка // Беларуская літаратура ХХ стагоддзя і сімвалізм. – Мінск: МДЛУ, 2004. – 155 с.
2. Гарэцкі, М. Збор твораў у чатырох тамах / М. Гарэцкі.– Мінск: Мастацкая літаратура, 1984. – Т. 1. Апавяданні (1913 – 1930). – 446 с.
3. Гуревич, А.М. Направление и течение // А.М. Гуревич / Литературный энциклопедический словарь; под ред. В.М. Кожевникова и др. – М.: Советская энциклопедия, 1987. – С. 232–233.
4. Каваленка, В.А. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. Развіццё беларускай літаратуры ХІХ – ХХ стагоддзяў / В.А. Каваленка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1975. – 336 с.
5. Мушынскі, М.І. Максім Гарэцкі // М.І. Мушынскі / Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: У 4 т. Т. 1 / Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т літаратуры імя Я.Купалы. – Мінск: Беларуская навука, 1999. – Т.1. – С. 381–426.
6. Тарасава, Т.М. Гарэцкі і А.Камю: экзістэнцыяльная трактоўка свабоды і несвабоды ў апавяданнях “Прысяга” і “Маўчанне” // Т.М. Тарасава / Американистика как предмет научного познания: материалы II Междунар. науч. конф., г.Минск, 12–14 мая 2004 г. / Бел. гос. пед. ун-т им. М.Танка; редкол. Т.Е. Комаровская. – Минск: БГПУ, 2006. – С. 103–106.

С.М. Тычына

## СЦЫФІКА ВОБРАЗНАГА МЫСЛЕННЯ М. БАГДАНОВІЧА І А. РАЗАНАВА

У 1911 годзе ў газеце “Наша ніва” (№3—5 , 20 і 27 студзеня, 3 лютага) з’явіўся крытычны артыкул, прысвечаны разгляду творчасці тагачасных беларускіх аўтараў. У ім зазначалася: “Што да Багдановіча, то і ў ім непрыкметна шпаркага развіцця, хоць асобнасці яго таленту выступаюць ужо даволі ясна. Гэта паэт-маляр. Слабы як лірык, ён усю сваю ўвагу звяртае на абразнасць зместу вершаў і разам з тым клапоціцца аб згушчонасці яго, спадзяваючыся прыдаць ім праз гэта асаблівую сілу, але, сціснутыя паводлуг такіх заходаў, вершы іншы раз заміж малюнка даюць якісь абрывак яго. Што варта гэтая праца, сказаць пакуль што цяжка, а таму, адзначыўшы даволі шырокі круг тэм у гэтых вершах і бледнасць мовы іх, я пераходжу да другарадных паэтаў” [2, с.190]. Артыкул, як вядома, належаў самаму Максіму Багдановічу. Можна было б адзначыць самакрытычнасць аўтара (праўда, ёсць меркаванне, што гэтыя радкі маглі быць упісаны кім-небудзь з супрацоўнікаў рэдакцыі [2, с. 514]), аднак, хацелася б звярнуць увагу на іншае. Аўтару дастаткова складана меркаваць пра ўласную творчасць і тым болей рабіць прагнозы наконт таго, ці прынясе яна плён. Мы ж цяпер можам адназначна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

казаць пра непаўторную творчую спадчыну М. Багдановіча, пра непадпарадкаванасць яго таленту часу, бо і сёння яго вершы не губляюць сваёй актуальнасці, цікавяць чытачоў, з'яўляюцца прывабным аб'ектам даследавання, а таксама натхняюць многіх мастакоў нашага часу. У манаграфіі Г. Кісліцынай "Алесь Разанаў: Праблема мастацкай свядомасці" адзначаецца несумненны ўплыў творчасці М. Багдановіча на "фарматворчыя пошукі паэта" [4, с. 34]. Падобныя меркаванні выказаны і іншымі даследчыкамі (А. Кабаковіч, А. Івашчанкам). Некаторыя вобразы з вершаў М. Багдановіча пераклікаюцца з вобразамі, якія згадваюцца ў А. Разнава.

Мяжой паміж дзвюх светаў для М. Багдановіча бачыцца люстэрка ці паверхня вады (возера – тое самае люстэрка). Гэта мяжа паміж ўяўным і рэальным, паміж "гэтым" і "тым" светам ("Дзве смерці", "Возера"). "Багдановіч бачыць свет у адзінстве адлюстраванняў. Праз лесунова люстэрка ён сузірае Беларусь – "зачараванае царства", якое не памерла, а застыла ў часе. Краіна не загінула, яна – ў забыцці /.../ [3, с. 135]. Застыласць свету, які знаходзіцца ў глыбіні возера, звязана з тым, што возера ў параўнанні з ракой больш спакойнае. Яно нібы хавае нешта ў сабе, у ім не заўважаецца руху, імклівасці, яно замкнёнае. Напэўна, нездарма легенды пра з'яўленне таго ці іншага возера расказваюць у асноўным пра тое, што на іх месцы некалі стаяў горад (вёска, царква), які праваліўся (напрыклад, пра гэта апавядае легенда пра возера Свіцязь, якая ў свой час захапіла А. Міцкевіча і Т. Зана). Прычым, гэты горад працягвае існаваць пад вадой, але паколькі само яго знікненне трэба ўспрымаць як праклён, пакаранне, то жыццё ў тым падводным горадзе спынілася ў той момант, калі ён перайшоў у іншы ("азёрны") свет. Рух і застыласць разглядаецца ў вершаказе А. Разанава "Рэчка і возера". Рэчка ў паэта з'яўляецца ўвасабленнем часу, возера – гэта адсутнасць часу. Нягледзячы на многія адрозненні, яны ўяўляюць сабой адно і тое ж, бо яны з аднаго рэчыва.

У возеры-люстэрку М. Багдановіча знаходзіцца гісторыя, мінулае: "Як у нязнаны свет акно, // Ляжыць, халоднае, яно, // Жыццё сабою адбівае// І ўсё, што згінула даўно, // У цёмнай глыбіні хавае" [1, с.53]. Спробу ўбачыць мінулае ў люстэрку робіць і А. Разанаў у "Паэме пагашаных люстэрак": "Што вам згадваецца, // раздарожжы? // Што вы памятаеце,// платы?// Зазіраю ў люстэркі:// можа,// у якім засталася ты?!" [6, с.68–69]. У творах абодвух паэтаў у люстэрках можа быць схавана нешта надзвычай дарагое, ад чаго засталіся толькі ўспаміны. Чаму менавіта ў люстэрках? Верагодна, таму, што ў свет люстэрка (нават калі ў яго ролі выступае вада, возера), не так і лёгка трапіць (на гэтае здатная хіба Аліса, гераіня Л. Кэрала), але тое, што бачыцца, між тым падаецца такім блізкім, як успаміны, якія не хочацца адпускаць: "Успаміны// тлумачаць нешта, // прагнуць будучыняю ўзысці.// Каб успомніць цябе дарэшты, мушу зноўку цябе знайсці" [6, с. 69]. Што тычыцца возера, то ў яго можна паглыбіцца, але ў такім выпадку будзе парушаная спакойная паверхня люстэрка, а, значыць, чалавек усё адно не патрапіць у той перавернуты свет, які адлюстроўвае вада. Акрамя таго, вада можа ператварацца ў лёд, які, паводле А. Разанава, уяўляе сабой сон вады: "Вада ўтрымлівае ў сабе лёд як сваю



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

іпастась, як сваю патаемную патэнцыю, як свой летаргічны сон і ўсялякі раз, калі "прыціскаюць" абставіны, пералітоўваецца ў яго" [8, с. 45].

Возера, рака, крыніца, дождж, слёзы (і ўсё гэта – вада) – таямнічыя вобразы ў М. Багдановіча і А. Разанава. У М. Багдановіча з вады, з дажджу, пляцецца павуціннe: "Дзесь у хмарах жывуць павукі, // Што снуюць павучыну дажджа. // Кожны тлусты і мяккі такі,// Скура слізкая, як у вужа; // Ў целе стыгне халодная кроў, // Злосць бясцэльная ў мутных вачах...// Чуеш! Во шорах ног павукоў, // Аплятаючых сцены і дах" [1, с. 68]. Хмарных павукоў з гэтага верша даследчык П. Васючэнка ў манаграфіі "Беларуская літаратура ХХ стагоддзя і сімвалізм" параўнаў з кінакашмарамі Альфрэда Хічкока [3, с. 136]. Цяжка патлумачыць, чаму ў свядомасці М. Багдановіча ўзнік вобраз злосных, агідных павукоў. У беларускай міфапаэтычнай традыцыі, напрыклад, павук часцей звязваецца з працавітасцю, з пераважна добрымі прадказаннямі і нават з ідэальным станам Сусвету, са знітаванасцю ўсіх істот і іх Стваральніка [5, с.350–351]. Дарэчы, менавіта такі станоўчы вобраз павука-працаўніка сустракаецца ў вершаказе А. Разанава "Павуціна": "Колькі б разоў ні рвалася павуціна, столькі разоў павук яе аднаўляе, даючы прыклад і павучанне ўсім ваярам, усім працаўнікам" [8, с. 65].

Дождж у вершы М. Багдановіча – гэта вынік працы павукоў. У павуціну павукі звычайна ловяць сваю ахвяру, абкручваюць яе і яна не здольная вырвацца (у вершаказе А. Разанава: "Павуціна як ціна: хто ў яе трапіць, таго яна аблытвае і палоніць" [8, с. 65]). У М. Багдановіча ахвярамі могуць стацца людзі, бо павуціна дажджу аплятае жытло чалавека. Сувязь дажджу і павуцінкі відавочная: дождж – гэта шматлікія вадзяныя ніткі, павуціна таксама сплятаецца з "ніткі". Калі ідзе дождж, то чалавек аказваецца нібы закрытым у сваім доме, звычайна абмяжоўваюцца перамяшчэнні. Параўнанне гукаў, якія чуюцца, калі ідзі дождж, з шоргатам ног павукоў з'яўляецца вельмі арыгінальным і трапным: кропель шмат, у павукоў багата ножак; кроплі падаюць часта, павукі бегаюць хутка, імгненна перастаўляючы ножкі. Аднак, чаму паэт апісвае павукоў менавіта як варожых істот? Прычым, злосць іх "бясцэльная". Ці не ідзе тут гутарка пра нематываванае зло, якое невядома чаму існуе ў свеце і можа нечакана нарадзіцца ў душы чалавека (напрыклад, падобныя перараджэнні адлюстроўваў у сваіх творах амерыканскі рамантык Э.А. По)? Ці М. Багдановіч мае на ўвазе варожасць свету наогул? Уяўленні пра тое, што нешта незразумелае, неспасцігальнае і захапляльна-страшнае акружае чалавека адлюстраваныя ў спадчыне еўрапейскіх пісьменнікаў-сімвалістаў (у творчасці М. Багдановіча даследчыкі А. Лойка, І. Навуменка, Г. Адамовіч, І. Багдановіч, Е. Лявонава, П. Васючэнка і інш. таксама заўважаюць рысы сімвалізму і імпрэсіянізму). Напрыклад, героі знакамітага драматурга М. Метэрлінка часта перажываюць страх перад невядомым знешнім светам, які можа ўварвацца ўнутр (у жыццё чалавека, у яго душу) і парушыць гармонію, зламаць чалавека, парваць яго сувязі з блізкімі, адабраць у яго тое, што з'яўляецца для яго самым каштоўным, знявечыць яго. Тое, што звонку – варожае, тое, што ўнутры – крохкае і кволае. Гэтак сама і ў вершы



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

М. Багдановіча страх напаўняе тых, хто знаходзіцца ў доме (“Чуеш!” – зварот да таго, хто знаходзіцца побач, хто таксама прыслухоўваецца да таямнічых шолахаў). Павукі пакуль аплятаюць сам дом, аднак, жах заключаецца не толькі ў тым, што яны могуць пранікнуць унутр, але і ў тым, што яны могуць не выпусціць тых, хто знаходзіцца ў доме. Ізноў жа паказваецца вобраз замкнёнай прасторы, з якой нельга вырвацца (як у выпадку з возерам, дзе пахавана нешта незвычайнае, што нельга дастаць).

Вада ў А. Разанава – тое што можа наталіць смагу. Вада і смага – шматзначныя сімвалы. Вада – гэта працяг жыцця, гэта веды, гэта адлюстраванне рэальнасці, быццё (“Студня”, “Дождж”, “Рэчка і возера”). Смага – гэта не толькі жаданне паспытаць вады (у творчасці А. Разанава наогул звычайныя дзеянні і назіранні за звыклымі нібыта штодзённымі малюнкамі заўжды маюць патаемны, філасофскі сэнс). Смага – гэта чаканне, гэта выпрабаванне, гэта таксама, як і вада, жыццё, патэнцыял: “Я веру вартаўніку,// я веру студні,// я веру свайму нераспазнанаму прызначэнню – // і гатовы трываць, колькі трэба трываць, // і гатовы гарэць на нябачным вогнішчы смагі, колькі трэба гарэць, каб споўніць, што мушу і што магу...” [7, с. 51]. Паколькі жыццё асацыіруецца з вадой, то зразумелым становіцца выкарыстанне ў творчасці А. Разанава вобразу падводнага плыўца – гэта чалавек, якога імчыць плынь жыцця, які злучаны з ёю.

У творчасці М. Багдановіча і А. Разанава, прадстаўнікоў беларускай філасофскай лірыкі, сімвалы люстэрка, возера, вады, дажджу, павуціны, павука з’яўляюцца шматзначнымі, але менавіта магчымасці шматлікіх інтэрпрэтацый звязваюць гэтыя вобразы ў адно цэлае. Аўтары пры дапамозе блізкага і зразумелага рэчыўнага свету паказаць свет іншы – той, які немагчыма ўбачыць вачыма, але можна спасцігнуць пры дапамозе ўнутранага зроку, гэта свет думак, адчуванняў, гэта своеасаблівае ўспрыняцце быцця чалавека.

### Літаратура


1. Багдановіч М. Поўны збор твораў. У 3 т. Т. 1. Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 752 с.
2. Багдановіч М. Поўны збор твораў. У 3 т. Т. 2. Маст.проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 600 с.
3. Васючэнка, П.В. Сімволіка сну ў творах Янкі Купалы / П.В. Васючэнка // Беларуская літаратура ХХ стагоддзя і сімвалізм. – Мінск, 2004. – 155 с.
4. Кісліцына, Г.М. Алесь Разанаў: Праблема мастацкай свядомасці // Г.М. Кісліцына. – Мінск: Беларуская навука, 1997. – 143 с.
5. Лобач У., Санько С. Павук / У. Лобач, С. Санько // Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч [і інш.]. – Мінск, 2004. – С. 350 –352.
6. Разанаў А. Каб мелі шчасце ўваскрасаць і лётаць/ А. Разанаў. –


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск: І.П. Логвінаў, 2006. – 168 с.
7. Разанаў А. Лясная дарога/ А. Разанаў. – Мінск: Выдавец І.П. Логвінаў, 2005. – 200 с.
8. Разанаў А. Пчала пачала паломнічаць/ А. Разанаў. – Мінск: І.П. Логвінаў, 2009. – 132 с.

С.М. Тычына

## НЕГЕРАІЧНЫ ГЕРОЙ У БЕЛАРУСКАЙ І ЯПОНСКАЙ ЛІТАРАТУРАХ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ТВОРАЎ Ю. СТАНКЕВІЧА І Я. ЦУЦУІ)

Нягледзячы на тое, што Беларусь і Японію падзяляюць шмат кіламетраў, існуе ўзаемная цікавасць пісьменнікаў і даследчыкаў да іншаземнай культуры і літаратуры. Напрыклад, Максім Танк, які заўжды імкнуўся бліжэй пазнаёміцца з жыццём людзей з розных краін, у шэрагу вершаў згадвае Японію (“Фудзіяма”, “Хоку”, “У Хірасімскім музеі”, “Цвіце сакура” і інш.). У артыкуле “Максім Багдановіч па-японску” даследчык і перакладчык з Токіа Кэн Сібата адзначае падабенства паміж беларускай і японскай паэзіяй, сувязь паміж М. Багдановічам і японскімі паэтамі [1, с. 34]. Пра беларуска-японскія культурныя і літаратурныя сувязі, пра пераклады беларускіх твораў на японскую мову і наадварот згадвалі Г. Янкута і С. Кіясава.

Меркаванне пра тое, што ў беларусаў і ў японцаў ёсць шмат агульнага, могуць пацвердзіць раман Ю. Станкевіча “Любіць ноч – права пацукоў” (1998) і аповесць Я. Цуцуі “Мой гранпа” (1999), якія з’явіліся прыкладна ў адзін час. Гэтыя творы аб’ядноўваюць:

1. **Сюжэт.** У беларускім і японскім творах назіраецца падабенства сюжэтаў, у аснове якіх ляжыць барацьба аднаго чалавека супраць зграі (па-іншаму і не назавеш) злачынцаў. У абодвух выпадках гэта людзі, якія імкнуцца навязаць усім свае парадкі і правілы жыцця. Гэта, безумоўна, не падабаецца мясцовым жыхарам, але тым не менш яны не спяшаюцца адкрыта выказаць сваё незадавальненне, бо імі валодае страх, жаданне закрыць на ўсё вочы і перачакаць, калі ўсё само вырашыцца. Праўда, у адрозненне ад твора Я. Цуцуі, у беларускага аўтара ў якасці злачынцаў выступаюць “чужынцы”, носьбіты іншай культуры. У рамане “Любіць ноч – права пацукоў” дакладна не сказана, хто яны такія. Але вонкавы выгляд, імя “Карым” і іншая мова дазваляюць зрабіць пэўныя высновы. Зрэшты, наконт мовы “чужынцаў” могуць узнікнуць пытанні, паколькі мармытанне і незразумелы набор гукаў, якімі замяняе Ю. Станкевіч гутарку прышэльцаў, выкарыстоўваюцца аўтарам і тады, калі трэба падвергнуць цэнзуры грубую лаянку герояў.

2. **Шматлікасць адмоўных персанажаў.** Па-сутнасці, героі змагаюцца не з адной бандай, ворагаў занадта шмат і на першы погляд здаецца, што само змаганне – безнадзейная справа. У Ю. Станкевіча паказана, што праблема не толькі ў сям’і чужынцаў, але і ў тых, хто іх падтрымлівае: следчы Кузін, блатны Эмір, эксгібіцыяніст Сярожа. У тым, што расце ўлада “чужынцаў” вінаватыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таксама і людзі, якія раўнадушна сузіраюць ўсё, што адбываецца, і спадзяюцца, што іх гэта не закране. Галоўны герой Я. Цуцуі, дзядуля Кэндза, таксама вымушаны змагацца з усімі адразу: мафіяй, якая імкнецца прысвоіць сабе чужыя землі, бандай, якая збірае з уладальнікаў бараў даніну, і нават школьнымі хуліганамі. Дарэчы, метады злачынцаў у абодвух творах вельмі падобныя: яны дзейнічаюць пры дапамозе нахабства і запалохвання. У абодвух выпадках існуе пагроза жыццю, асабістай недатыкальнасці (у аповесці Я. Цуцуі злачынцы намякаюць на магчымы гвалт непаўналетняй Тамака Гадай, у рамане Ю. Станкевіча адбываецца згвалтаванне пятнаццацігадовай Рэгіны, у творах апісваюцца здзекі з тых, хто аказваецца слабейшым і безабаронным). Акрамя таго, нават мэта злачынцаў у творах беларускага і японскага аўтараў супадае – яны хочуць выжыць людзей з іх дамоў і сцвердзіць сваю ўладу над усімі.

3. **Пасіўнасць большасці персанажаў**. Людзі, якія назіраюць нахабныя паводзіны "чужынцаў", нічога не робяць, каб іх спыніць. Маці баяцца за сваіх дзяцей і ўсведамляюць сваю безабароннасць перад злачынцамі, паколькі дапамогі няма адкуль чакаць, але калі Даніла ў творы "Любіць ноч – права пацукоў" прапаноўвае ўсім разам сабрацца і паказаць чужынцам, што незадаволеных іх паводзінамі шмат і што разам людзі могуць быць моцнымі, ніхто яго не падтрымлівае, хіба на словах. У аповесці "Мой гранпа" нават калі гутарка ідзе пра напады групы падлеткаў на дзяўчынку, дарослыя, якія аказваюцца побач, робяць выгляд, што нічога не заўважаюць. Калі спатрэбілася падтрымаць гаспадара бара "Жасмін", які адмовіўся плаціць крымінальнікам даніну, былыя наведвальнікі проста перасталі туды заходзіць. Кэндзо, як і Даніла, разумее, што гвалту можна супрацьстаяць толькі прадэманстраваўшы сваю сілу, таму ён чакае былых наведвальнікаў пасля работы на станцыі і прапаноўвае ім ісці ў "Жасмін" разам. Паколькі наведвальнікі – гэта мужчыны, то ім удаецца адстаяць сваё права адпачываць там, дзе яны хочуць, не пытаючы на гэта дазволу ў злачынцаў (але ізноў жа гэта адбылося толькі дзякуючы Кэндза, бо калі б ён спалохаўся пагрозаў "боса" ці хоць трохі саступіў, то наведвальнікі ўрэшце адмовіліся б хадзіць у бар). У рамане Ю. Станкевіча галоўны герой таксама не абыходзіцца без падтрымкі збоку (праўда, дапамагаць яму асмеліўся толькі адзін мужны чалавек). Яго паплечнікам у барацьбе становіцца стары Антон Кніга.

4. **Негераічны герой.** Што можа зрабіць адзін чалавек? Асабліва калі гэты чалавек не з'яўляецца супермэнам, не валодае звышнатуральнымі здольнасцямі, фізічнымі перавагамі, неверагоднымі магчымасцямі, не займае нейкія ключавыя месцы ў грамадстве і г.д. Большасць герояў у творах Я. Цуцуі і Ю. Станкевіча прызналі б: нічога. Таму людзі з акружэння Кэндза і Данілы збольшага імкнуцца не ўлазіць у канфлікты. Сапраўды, галоўныя героі ў творах – гэта звычайныя людзі, якіх хутчэй за ўсё не заўважыш у натоўпе. Кэндза Гадай – гэта чалавек у гадах (яго унучка-падлетак ходзіць у школу). Пятнаццаць гадоў ён правёў у турме, дзе, як ён прызнаўся, зарабляў на існаванне тым, што вышываў. Даніла Прусак таксама ўжо немалады чалавек, працуе ў канструктарскім бюро. Гэта людзі, якія нічым асаблівым не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вылучаюцца. Нягледзячы на тое, што адзін герой – беларус, а другі – японец, у іх шмат агульнага. Гэта:

а. Адсутнасць страху смерці. Галоўны сярод “чужынцаў”, гледзячы на Данілу адзначае: “в том и причина, что ты смерти не боишься /…/ ты сумасшедший – так, у тэбя с головой проблема” [2, с. 323] [асаблівасці перадачы мовы персанажа захаваныя – С.Т.]. Пра героя “Мой гранпа” гаворыць яго ўнучка Тамака: “Он как будто искал смерти. Когда якудза пригрозили, что убьют его, у него было такое необыкновенно радостное лицо… Потому он и не боялся опасности. Ещё дедушка говорил Токунаге-куну, что если человек готов умереть, то для него нет ничего невозможного. Он пытался сделать все, что в его силах, не боясь при этом отдать свою жизнь” [3, с. 55]. Жонка Кэндза адмаўляецца з ім жыць менавіта па гэтай прычыне: у мужа няма ніякіх абмежаванняў, калі гутарка ідзе пра тое, каб адстойваць справядлівасць, ён не адступіць і заўжды гатовы да самага горшага варыянту развіцця падзей, а яна не можа да гэтага прызвычаіцца, ёй страшна за яго.

б. Пачуццё ўласнай годнасці. У Данілы і Кэндза няма вялікіх пасад, асаблівага становішча ў грамадстве, прывілей і пераваг перад іншымі, але яны не адчуваюць сябе “маленькімі”, слабымі людзьмі, якія нічога не могуць змяніць у свеце. Наадварот, яны перакананыя, што супраціўленне злу хоць і не можа знішчыць яго цалкам, але не дае яму стаць валадаром свету. Героі разумеюць, што калі саступіш у дробязі, то будзеш вымушаны саступаць увесь час (таму Даніла пастаянна вядзе вайну за паваленьі плот, а Кэндза не ідзе на здзелку з крымінальнікамі, хоць гэта магло забяспечыць яму спакой).

в. Нікчэмнасць прамога нашчадка. Дзеці (у абодвух выпадках гэта сыны) Данілы і Кэндза зусім не падобныя да сваіх моцных духам бацькоў. Сын Кэндза не можа нават загадзя патурбавацца пра сямейны адпачынак, што ўжо казаць пра тое, каб разабрацца з праблемамі і тымі, хто пагражае яго блізкім. Ён усё спадзяецца, што ўсе цяжкасці знікнуць самі ці імі зоймецца нехта іншы (напрыклад, жонка). Сына Данілы цікавіць толькі ён сам. Калі бацьку (нават не бацьку, а стрыечнаму брату, даўнёнку Улі) спатрэбілася дапамога, то ён проста праігнараваў блізкага чалавека.

г. Аднолькавыя метады. Героі разумеюць, што ў выпадку, калі закон і яго прадстаўнікі нічога не робяць ці не могуць зрабіць, часам адзіным спосабам змагання са злачынствам з’яўляецца той, якім карыстаюцца самі злачынцы. Калі крымінальнікі вышукваюць самую слабую кропку, якая ёсць нават у самага моцнага і бясстрашнага чалавека (звычайна яны дзейнічаюць праз дарагіх чалавеку людзей, пагражаючы забіць іх, скалечыць ці прычыніць ім шкоду), то гэты ж метад можна выкарыстаць і супраць іх саміх. Даніла з дапамогай Антона Кнігі выкрадае адзінага сына “галоўнага”, прымушаючы ўсю банду “чужынцаў” пакінуць Янаўск. Кэндза для таго, каб вызваліць сваю ўнучку Тамака з палону (яе ўзялі ў закладнікі), выкрадае дачку крымінальніка Хікіты.

д. Адзіная мэта змагання – блізкі чалавек. Для Кэндза самае галоўнае – гэта шчасце яго ўнучкі. А шчаслівым чалавек можа быць толькі ў бяспечным,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

справядлівым грамадстве. Кэндза спрабуе вырашыць канфлікты не толькі ў сям'і, але і ў школе Тамака (прычым, дзейнічае максімальна далікатна, паціху збіраючы карысную інфармацыю і заваёўваючы сярод людзей аўтарытэт і павагу). Для Данілы з твора Ю. Станкевіча важна не толькі паклапаціцца пра маленькага і безабароннага пляменніка, але і ўшанаваць памяць сястры, знайсці і пакараць тых, хто яе забіў. Агульным у беларускім і японскім творах з'яўляецца і тое, што ўнучка Кэндза і пляменнік Данілы на нейкі час аказваюцца ў руках злачынцаў і перажываюць здзек.

Як можна ўпэўніцца, нават у створаных незалежна адзін ад аднаго тэкстах на розных мовах могуць супадаць многія моманты. Чаму так адбываецца? Па-першае, у агульных рысах сюжэты твораў, якія мы разглядаем, не падаюцца надта арыгінальнымі. Дастаткова звярнуцца да шматлікіх кніг і фільмаў, у якіх паказваецца змаганне аднаго (звычайна супергероя) з сіламі зла (дарэчы, твор Я. Цуцуі – гэта аповесць-сцэнарый, якая была паспяхова экранізаваная ў 2003 г.). Па-другое, аўтары арыентуюцца на рэаліі жыцця (напрыклад, метады, якія выкарыстоўваюць злачынцы для дасягнення сваіх мэт, з цягам часу фактычна не змяняюцца). Па-трэцяе, нягледзячы на палітычныя, эканамічныя, культурныя і г.д. змены ў жыцці людзей, застаюцца актуальнымі агульначалавечыя каштоўнасці: любоў да блізкіх, імкненне да справядлівасці, узаемападтрымка і інш. Аднак, праз прастату сюжэта кожны аўтар ідзе да сваёй мэты. У Ю. Станкевіча асноўная мэта – паказаць, якую пагрозу нясе абыякавасць і раз'яднанасць грамадства, папярэдзіць аб наступствах, што могуць чакаць людзей, якія займаюць пазіцыю "мая хата з краю" або "мяне не чапаюць, і я не чапаю" (адсюль і пэўная незавершанасць твора – чужынцы з'ехалі з Янаўска, але яны будуць працягваць сваю справу ў іншым месцы і, магчыма, наступствы іх дзейнасці пазней паўплываюць і на Янаўск). Я. Цуцуі імкнецца прадэманстраваць, што калі за чалавекам стаіць справядлівасць і любоў да людзей, ён адзін, нават калі ён стары, можа змяніць цэлы свет, бо за ім пойдуць людзі.

Літаратура

1. Сібата, Кэн. Максім Багдановіч па-японску / Кэн Сібата // Общественные и гуманитарные науки: тезисы 80-й науч.-техн. конференции профессорско-преподавательского состава, научных сотрудников и аспирантов (с международным участием), Минск, 1–12 февраля 2016 / отв. за издание И.М. Жарский; УО БГТУ. – Минск: БГТУ, 2016. – С. 33 – 34.
2. Станкевіч, Ю. Любіць ноч – права пацукоў / Ю. Станкевіч // Апладненне ёлупа: раманы, аповесці, апавяданні. – Мінск: Рэд. газ. "Настаўн. газ.", 2005. – С. 236 – 326.
3. Цуцуи, Я. Мой гранпа / Я. Цуцуи // Иностранная литература. Специальный номер. Япония: мир в капле дождя. – 2012. – № 2. – С. 3 – 55.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# III. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ
## Спіс мастацкіх твораў па дысцыпліне “Беларуская літаратура” для студэнтаў ФІДК (дзённая і завочная форма навучання)
## Частка1

“Жыціе Е.Полацкай”.
Ф.Скарына. 2-3 прадмовы да “Біблії”.
М.Гусоўскі. “Песня пра зубра”.
Марашэўскі К. “Камедыя”
Ф.У.Радзівіл “Распуснікі ў пастцы” (ці іншы яе твор на выбар).
А.Міцкевіч. “Пан Тадэвуш”.
Я.Баршчэўскі. “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”.
Ф.Багушэвіч. Прадмовы да паэтычных зборнікаў, вершы на выбар.
В.І.Дунін-Марцінкевіч. “Ідылія”, “Пінская шляхта”.
Янка Купала. П’еса “Тутэйшыя”, паэмы “Адвечная песня”, “Сон на кургане”.
Якуб Колас. Паэма “Сымон-музыка”.
Багдановіч М. Вершы са зб. “Вянок”.
Гарэцкі М. Аповесць “У чым яго крыўда” ці апавяданні “Роднае карэнне”, “У лазні”, “Фантазія” (на выбар).
Зарэцкі М. Аповесць “Голы звер”, апавяданне “Дзіўная”.
Бядуля З. “Салавей”.
А.Мрый “Запіскі Самсона Самасуя”.
Куляшоў А. “Хамуціус”, “Варшаўскі шлях” – адна на выбар.
Панчанка П. Лірыка 40-90-х гг. – 10 вершаў розных гадоў на выбар.
Крапіва К. Сатырычныя вершы, байкі, п’есы “Брама неўміручасці”, “Хто смяецца апошнім”, “Мілы чалавек” – на выбар.
Чорны К. Апавяданні “Буланы”, “Макаркавых Волька”, “Маё дзела цялячае”.
Танк М. Вершаваныя творы са зб. 40-х гг. да 90-х гг. ХХ ст. – 10 вершаў на выбар.
Караткевіч У. Вершы на выбар. Аповесці і раманы “Ладдзя Роспачы”, “Дзікае паляванне караля Стаха”, “Зямля пад белымі крыламі”.
Быкаў В. Зб. прытчаў “Пахаджане”, “Сцяна” (аналіз 2–3 апавяданняў на выбар). Аповесці “Пакахай мяне, салдацік”, “Ваўчыная яма”, апавяданне “Труба”.
Казько В. “Да сустрэчы…”.
Брыль Я. “Муштук і папка”, зб. лірычных мініяцюр “Вячэрняе”, “На сцежцы – дзеці”, “Парастак” ці інш. – асобныя запісы з любога зборніка на выбар.
Грахоўскі С. “Зона маўчання”.
Аляхновіч Ф. “У кіпцюрох ГПУ”, Геніюш Л. “Споведзь” – твор на выбар.
Станкевіч Ю. Раман “Любіць ноч – права пацукоў”.
Жук А. “Паляванне на Апошняга Жураўля”, Казько В. “Выратуй і памілуй нас, чорны бусел”, Федарэнка А. (“Вёска” ці апавяданне “Бляха” – на выбар).
Баравікова Р. (зб. “Вячэра манекенаў” – 2-3 апавяданні на выбар), Л.Рублеўская (“Сэрца мармуровага анёла”), А.Брава (“Тапіць дзяўчынак тут дазволена”), Ю.Каляда (Invicta, альбо Галоўная памылка Афанасія) – аўтары на выбар.
Арлоў У. “Сны імператара”, “Час чумы”, Іпатава В. “Залатая жрыца Ашвінаў”, К.Тарасаў “Тры жыцці княгіні Рагнеды”, Л.Рублеўская “Сэрца мармуровага анёла” ці інш.) – твор аднаго аўтара на выбар.
Алексіевіч С. “Чарнобыльская малітва”, “Час сэканд-хэнд”.
Адамовіч А. “Апошняя пастараль”.
Разанаў А., Я.Янішчыц, А.Пісьмянкоў, С.Законнікаў – вершы на выбар.
Гілевіч Н., Барадулін Р., Вярцінскі А., Бураўкін Г. – вершы розных гадоў на выбар.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дранько-Майсюк Л. Вершы на выбар са зб. “Гаспода”, “Тут”, “Акропаль”.
Дудараў А., Петрашкевіч А., Кавалёў С., Васючэнка П., Рублеўская Л. – 2-3 п’есы розных аўтараў на выбар.
Марціновіч В. Сфагнум.

## Частка 2.

Куляшоў А. (вершы; паэмы “Варшаўскі шлях”, “Цунамі”, “Хамуціус” – 1 на выбар), Панчанка П. (вершы), Танк М.(вершы).
Лірычная проза: Я.Брыль (лірычныя мініяцюры “Ніжнія Байдуны”), М.Стральцоў (“Сена на асфальце” ці інш.) – аўтар і твор на выбар.
Проза прадстаўнікоў “ваенна-вясковай” плыні: А.Жук “Паляванне на Апошняга Жураўля”, І.Пташнікаў “Мсціжы” і інш. – аўтар і твор на выбар.
Быкаў В. “Жураўліны крык”, “Пакахай мяне, салдацік”. “Альпійская балада”, “Ваўчыная яма”, “Труба”, “Сцяна” (2 творы на выбар).
Адамовіч А. “Хатынская аповесць”, “Карнікі”, “Апошняя пастараль” – твор на выбар.
Мележ І. “Палеская хроніка”
Шамякін І. “Крывінка”, “Палеская мадонна”, “Без пакаяння”, “Сатанінскі тур” – на выбар.
Паэзія прадстаўнікоў філалагічнага пакалення – Н.Гілевіч (вершы; раман у вершах “Родныя дзеці”), Р.Барадулін (вершы), А.Вярцінскі (вершы), Я.Сіпакоў (2 балады на выбар са зб. “Веча славянскіх балад”).
Караткевіч У. Вершы і апавяданні: “Ладдзя Роспачы”, “Дзікае паляванне караля Стаха”, “Зямля пад белымі крыламі”, “Каласы пад сярпом тваім” – на выбар.
Творчасць 70-дзесятнікаў – Я.Янішчыц (вершы), А.Разанаў (вершы), С.Законнікаў (паэма “Чорная быль”), Л.Дранько-Майсюк (вершы; паэма-казка “Цацачная крама”), Р.Баравікова (вершы, 1 апавяданне на выбар: “Ты, я і Валодзя”, “Памылка Малой Галактыкі”, “Вячэра манекенаў”).
Алексіевіч С. “Чарнобыльская малітва”, “Час сэканд-хэнд”.
Казько В. “Да сустрэчы”, “Суд у слабадзе” – на выбар.
Рублеўская Л. Вершы. Аповесць на выбар: “Дзеці гамункулуса”, “Сэрца мармуровага анёла”, “Пярсцёнак апошняга імператара”.
Федарэнка А. “Вёска”, “Жэтон на метро” – твор на выбар.
Гулагаўская тэматыка: Ф.Аляхновіч “У кіпцюрох ГПУ”, Л.Геніюш “Споведзь”, С.Грахоўскі “Споведзь” – аўтар і твор на выбар.
Станкевіч Ю. Раман “Любіць ноч – права пацукоў”.
Гістарычная проза: У.Арлоў “Таямніцы Полацкай гісторыі”, “Час чумы” – на выбар, Л.Дайнека “След ваўкалака”, В.Іпатава “Залатая жрыца Ашвінаў”, К.Тарасаў “Тры жыцці княгіні Рагнеды”, А. Наварыч “Літоўскі воўк” – аўтар і твор на выбар.
Антыўтопія (В.Гігевіч “Карабель”, “Пабакі” В.Марціновіч “Мова”, “Сфагнум” – аўтар і твор на выбар).
Драматургія: А.Макаёнак “Трыбунал” ці “Зацюканы апостал”, А.Дудараў “Вечар”, “Радавыя”, “Купала” – п’еса на выбар, А.Петрашкевіч “Воля на крыжы”, С.Кавалёў “Стомлены д’ябал” ці “Францішка, або Навука кахання”.
Літаратурны працэс к. XX – пач. XXI ст.
Сучасная паэзія: А.Сыс, Э.Акулін, А.Хадановіч, В.Жыбуль – вершы на выбар 2 аўтараў.
Сучасная проза: А.Казлоў “Незламаная свечка”, В.Гапееў “Ноч цмока”, “Пазл” – на выбар, А.Глобус “Казкі” – 2-3 на выбар, А.Брава (“Тапіць дзяўчатак тут дазволена”, В. Марціновіч “Ноч”, А. Горват “Радзіва “Прудок”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс мастацкіх твораў па дысцыпліне “Беларуская літаратура”**
**для студэнтаў ФХК, ФМіХМ, ФКіСКД**
**(дзённая і завочная форма навучання)**

“Слова пра паход Ігаравы” (можна ў перакладзе Я.Купалы)

“Жыціе Еўфрасінні Полацкай” або **К.Тураўскі** “Прытча пра душу і цела”

**Ф.Скарына** (“Прадмова да ўсёй Бібліі”, “Прадмова да псалтыра”, Прадмова да кнігі Юдзіф” – 2 прадмовы на выбар)

**М.Гусоўскі** “Песня пра зубра”

**К.Марашэўскі** “Камедыя”.

**Я.Баршчэўскі** “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” (“Плачка”, “Белая сарока”, “Ваўкалак”, “Шляхціц Завальня” – 2 апавядання з кнігі)

**А.Міцкевіч** “Лілеі”, “Гражына”, “Конрад Валенрод” (2 творы на выбар)

**В.Дунін-Марцінкевіч** “Пінская шляхта”

**Ф.Багушэвіч** прадмовы да зборнікаў “Дудка беларуская” і “Смык беларускі”, 4 вершы на выбар (“Бог не роўна дзеле”, Дурны мужык, як варона”, “Свіння і жалуды”, “Афяра”, “Хрэсьбіны Мацюка”, “Мая хата” і інш.)

**М.Багдановіч** (4-5 вершаў на выбар са зб. ”Вянок” (“Возера”, “Пагоня”, “Санет”, “Зорка Венера”, “Слуцкія ткачыхі”, “Маёвая песня” і інш.), апавяданне “Музыка”).

**Я.Купала** 4-5 вершаў на выбар (“Спадчына”, “Паязджане”, “О так! Я – пралетар!”, “А хто там ідзе”, “Смейся!”, “Малітва”, “Маё цярпенне”, “Маладая Беларусь”і інш.), п’еса “Тутэйшыя” (абавязкова).

**А.Мрый** “Запіскі Самсона Самасуя”

**М.Зарэцкі** “Дзіўная”, “Голы звер” (1 твор на выбар)

**М.Гарэцкі** “Рускі”, “Роднае карэнне”, “Літоўскі хутарок”, “Чарнічка”, “Генерал”, “Сумная дзяўчынка”, “Кветкі зла” (2 апавяданні на выбар)

**З.Бядуля** “Малітва малога Габрусіка”, “Ашчаслівіла”, “Малыя дрывасекі”, “На каляды к сыну”, “Вялікодныя яйкі” – 1 апавяданне на выбар

**Я.Колас**. “Казкі жыцця” (1 казка на выбар: “Жывая вада”, “Кажух старога Анісіма”, “Балотны агонь” і інш.). Паэма “Новая зямля”.

**К. Чорны** “Млечны шлях”.

**В. Быкаў** “Мёртвым не баліць” (абавязкова), “Аблава”, “Сцяна”, “Кошка і мышка” (1 твор на выбар).

**Я.Брыль** “Муштук і папка”.

**І.Шамякін** “Крывінка”, “Без пакаяння”, “Палеская мадонна”, “Сатанінскі тур” (1 твор на выбар)

**С.Грахоўскі** “Зона маўчання”.

**У.Караткевіч** (“Чорны замак Альшанскі”, “Дзікае паляванне караля Стаха” – на выбар).

**М.Танк** 7-8 вершаў з кніг "Мой каўчэг", "Errata" на выбар

**А.Куляшоў** Вершы на выбар, паэма “Варшаўскі шлях”.

**Н.Гілевіч, П.Панчанка, Р.Барадулін**, **А.Вярцінскі, В.Зуёнак** – аўтары і вершы на выбар.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**А.Жук** (аповесць “Паляванне на Апошняга Жураўля**”) або В.Казько** (аповесць “Да сустрэчы…”) (1 аўтар, 1 твор на выбар)
**Л.Рублеўская** (“Сэрца мармуровага анёла”, “Дзеці гамункулуса”) – 1 твор выбар.
**А.Адамовіч** “Хатынская аповесць”.
**А.Разанаў, С.Законнікаў, Я.Янішчыц** – вершы розных аўтараў на выбар.
**Л.Дранько-Майсюк, А.Сыс, А. Глобус, В. Жыбуль** – вершы розных аўтараў на выбар.
**А. Макаёнак** “Зацюканы апостал”
**К. Крапіва** “Хто смяецца апошнім”, “Брама неўміручасці”
**А.Дудараў** “Вечар”, **С.Кавалёў** “Стомлены д’ябал” – 1 аўтар 1 твор на выбар.
**В.Гігевіч** “Карабель”
**Ю.Станкевіч** “Любіць ноч – права пацукоў”.
**А. Горват** “Радзіва “Прудок”

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэматыка семінарскіх заняткаў па дысцыпліне “Беларуская літаратура” для студэнтаў ФІДК (дзённая форма навучання)**

ТЭМА 1. ЛІТАРАТУРА ЭПОХІ СЯРЭДНЯВЕЧЧА І ПАЧАТКУ АДРАДЖЭННЯ.

1. Падрыхтаваць канспект адказу паводле плана: што азначае тэрмін “агіяграфія”? гістарычныя постаці агіяграфічных твораў; перакладныя і арыгінальныя жыціі XII-XVII стст. – прывесці прыклады; адметнасць героя жыційнага твора; асаблівасці структуры жыція; прызначэнне такіх твораў.
2. Прачытаць “Аповесць жыцця і смерці Еўфрасінні Полацкай” і “Жыціе Аўрамія Смаленскага”, параўнаць іх і запоўніць калонкі табліцы, выкарыстоўваючы <u>цытаты</u> з тэкстаў (гл. Дадатак 1).
3. Які твор можна назваць летапісам? Гісторыя летапісання:
- “Аповесць мінулых гадоў” – гістарычная энцыклапедыя жыцця ўсходніх славянаў. Падзеі і факты беларускай гісторыі ў творы.
- Беларус.-літоўскія летапісы, іх структура і змест (гл. Дадатак 2).
- Трансфармацыя летапіснага жанру (на прыкладзе “Баркулабаўскай хронікі”).

4. Гістарычная аснова, сюжэт, вобразы “Слова…”, яго беларускія матывы.
5. Ф.Скарына як заснавальнік беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання.
6. Скарынінскія традыцыі ў асветніцкай дзейнасці паслядоўнікаў.

Літаратура

<u>Тэксты:</u> “Аповесць мінулых гадоў”. “Жыціе Еўфрасінні Полацкай”, “Жыціе Аўрамія Смаленскага”. “Слова пра паход Ігаравы”. “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх” ці “Хроніка Быхаўца” (урыўкі пра Палямона, заснаванне г. Вільні, унутрыпалітычную барацьбу князёў Кейстута, Вітаўта і Ягайлы, паход князя Альгерда на Маскву, Грунвальдскую бітву і інш.). Ф.Скарынаа (3-4 прадмовы на выбар студэнта). В.Цяпінскі “Прадмова” да Евангелля.

<u>Асноўная:</u>

1. Гісторыя беларускай літаратуры : Старажыт. перыяд: падруч. для філал. спец. пед. выш. навуч. установ / М.М.Грынчык, У.А.Калеснік, У.Г.Кароткі і інш.; Пад агул. рэд. М.А.Лазарука, А.А.Семяновіча. – Мінск : Выш. шк., 1996. – 351 с.
2. Гісторыя беларускай літаратуры, XI – XIX стст. : у 2 т. / НАН Беларусі, Ін-т імя Я. Купалы; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2006—2007. – Т. 1.

<u>Дадатковая:</u>

1. Арлоў, У. Еўфрасіння Полацкая / У.Арлоў. - Мінск: Маст. літ., 1992. — 220 с.
2. Старажытная беларуская літаратура (XII–XVII стст.) / уклад., прадм., камент. І.Саверчанкі. – Мінск : Кнігазбор, 2007. – 608 с.
3. Старажытная беларуская літаратура : Зборнік : Для ст. шк. узросту / уклад. Л.С.Курбека; аўт. прадм. У.Г.Кароткі. – Мінск : Юнацтва, 1990. – 350 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Казбярук У. Францішак Скарына: навукова-папулярны нарыс / У.Казбярук. – Мінск: Маст. літ., 2003. – 174 с.
5. Кароткі У. Беларускія прадмовы і пасляслоўі др. пал. XVI-перш. пал. XVII ст. // Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Ф. Скарыны. -- Мн., 1991. – С.6--22.
6. Парэцкі Я.І. Сымон Будны / І.Я.Парэцкі. – Мінск: БДУ, 1975. – 167 с.
7. Саверчанка І.В. Сымон Будны : Гуманіст і рэфарматар / І.В.Саверчанка. – Мінск: Універсітэцкае, 1993. — 224 с.
8. Скарына і яго эпоха / [В. А. Чамярыцкі і інш.]; Акад. навук Беларус. ССР, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 479 с.
9. Францыск Скарына і яго час: Энцыклапедычны даведнік. – Мінск: "БСЭ імя П.Проўкі", 1988. – 688 с.
10. Францыск Скарына на мовах народаў свету / [укладанне, пасляслоўе А.Карлюкевіча ; прадмова А. Сушы]. – Мінск : Звязда, 2014. – 133 с.
11. Чамярыцкі, В.А. Жыватворная спадчына : выбранае / В.А.Чамярыцкі ; прадм. Г.Кісялёў. – Мінск: Чатыры чвэрці, 2017. – 552 с.

ТЭМА 2. СТАРАБЕЛАРУСКАЯ ПАЭЗІЯ, ЯЕ ВІДЫ І ЖАНРЫ

1. "Пруская вайна" Я.Вісліцкага (гуманістычны змест і праблематыка паэмы – пазнаёміцца па падручніку).
2. "Песня пра зубра" М.Гусоўскага як узор лацінамоўнай рэнесансавай паэзіі Беларусі XVI ст. Гісторыя стварэння паэмы. Творчая задача і звышзадача.
- Мастацкая рэалізацыя творчай задачы: вобраз зубра ў паэме і яго сімвалічнае значэнне (прывесці прыклады з тэксту, дзе дадзена апісанне знешнасці, паводзінаў, жыцця зубрынага статку, асаблівасцяў палявання і інш.).
- Мастацкая рэалізацыя творчай звышзадачы праз стварэнне вобразаў радзімы (апісанне прыроды, характарыстыка сацыяльна-палітычнага становішча, выяўленне грамадска-культурных праблем часу – на аснове цытат і прыкладаў з тэксту), князёў Вітаўта і Сігізмунда.
- Мастацкая своеасаблівасць паэмы (арыгінальнасць кампазіцыі і прасторава-часавых планаў твора, паэтыка).
3. Лямант, дэкламацыя, эпіграма – спецыфіка вершаваных формаў.
4. Творы Андрэя Рымшы.
5. Жыццё і творчасць Сімяона Полацкага. Разнастайнасць тэматыкі яго вершаў (прывесці па 2-3прыклады на кожную з тэмаў). Барочныя традыцыі ў яго паэзіі. Фігурныя вершы С.Полацкага.
6. Ф.У.Радзівіл – нясвіжская "Сапфо" (растлумачыць, чаму так ахарактарызавалі аўтара за яе спробы ў паэзіі).

Літаратура

<u>Тэксты:</u> "Песня пра зубра" М.Гусоўскага. Вершы на гербы А.Рымшы. Сімяон Полацкі (6-10 вершаў living рознай тэматыкі).

<u>Асноўная:</u>

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Гісторыя беларускай літаратуры : старажыт. перыяд: падруч. для філал. спец. пед. выш. навуч. устаноў / М.М.Грынчык, У.А.Калеснік, У.Г.Кароткі і інш.; Пад агул. рэд. М.А.Лазарука, А.А.Семяновіча. – Мінск : Выш. шк., 1996. – 351 с. (адпаведны раздзел).
2. Гісторыя беларускай літаратуры, XI–XIX ст.ст. У 2 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы; навук. рэд. тома В. А. Чамярыцкі. – 2-е выд. – Мінск : Бел. навука, 2006–2007. – Т. 1. – С. 309-357.
Дадатковая:
1. Дорошкевич В.И. Новолатинская поэзия Белоруссии и Литвы: Первая половина XVI в. – Минск, 1979.
2. Кавалёў, С. Літаратура Вялікага Княства Літоўскага XVI – пачатку XVII ст. : феномен культурнага памежжа / С.Кавалёў. – Мінск : Кнігазбор, 2011. – 344 с.
3. Калеснік У. Тварэнне легенды. – Мінск, 1987. – С. 123-197.
4. Саверчанка, І.В. Старажытная паэзія Беларусі / І.В.Саверчанка. – Мінск : Беларус. навука, 1992. – 254 с.
5. Старажытная беларуская літаратура (XII–XVII стст.) / уклад., прадм., камент. І.Саверчанкі. – Мінск : Кнігазбор, 2007. – 608 с.

## ТЭМА 3. ЛІТАРАТУРА БАРОКА І ЭПОХІ АСВЕТНІЦТВА (драматургія)

1. Батлейкавы тэатр на Беларусі, характар прадстаўленняў, асаблівасць тэматыкі, рэпертуар – канспект з падручнікаў.
2. Інтэрмедыя і яе герой, месца інтэрмедый у драматургіі таго часу.
3. Гісторыя бытавання школьнага тэатра, яго функцыі і роля ў развіцці тэатральнага мастацтва. Аналіз “Камедыі” К.Марашэўскага ў параўнанні з сучасным рымейкавым варыянтам – п’есай С.Кавалёва “Стомлены д’ябал”.
4. Прыдворныя тэатры на Беларусі. Асоба Ф.У.Радзівіл, агульная характарыстыка яе драматургіі. Аналіз п’есы С.Кавалёва “Францішка, або Навука кахання”.

Літаратура

Тэксты: “Камедыя” К.Марашэўскага, п’есы С.Кавалёва “Стомлены д’ябал” і “Францішка, або Навука кахання”. Адна інтэрмедыя на выбар.

Асноўная:
1. Гісторыя беларускай літаратуры, XI–XIX ст.ст. У 2 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы; навук. рэд. тома В. А. Чамярыцкі. – 2-е выд. – Мінск : Бел. навука, 2006–2007. – Т. 1 – с. 748-784, 855-875.
2. Літаратура XVII–XVIII стагоддзяў / Уклад. А.У.Бразгунова, С.Л.Гараніна; навук. рэд. В.А.Чамярыцкі. – Мінск : Маст. літ., 2012. – 830 с. – (Залатая калекцыя беларускай літаратуры).
3. Радзівіл, Ф.У. Выбраныя творы: Перакл. з пол. і фр. / Уклад. С.Кавалёва. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2003. – 448 с.
Дадатковая:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Мальдзіс А. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 352 с. - С. 320—335.
2. Некрашэвіч-Кароткая Ж., Русецкая Н. Асветніца з роду Радзівілаў // Радзівіл Ф.У. Выбраныя творы: Перакл. з пол. і фр. / Уклад. С.Кавалёва. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2003. – 448 с. – С. 5-24.

## ТЭМА 4. ЯН БАРШЧЭЎСКІ

1. Жыццёвы лёс і творчая біяграфія. Беларускамоўныя творы і іх змест.
2. Балады Я.Баршчэўскага. Ідэі рамантызму і іх выяўленне ў названым жанры – канспект з падручнікаў.
3. “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”:
- тэма Радзімы, яе гістарычнае мінулае і сучаснае ў кнізе;
- хрысціянска-міфалагічныя матывы;
- характар беларуса ў мастацкім выяўленні Я.Баршчэўскага;
- кампазіцыя і мастацкі стыль кнігі.
4. Мастацкі міфалагізм, маральна-этычная і сацыяльна-грамадская праблематыка ў аповесці “Душа не ў сваім целе”.
5. Мастацкі рамантызм і яго асаблівасці ў творчасці Я.Баршчэўскага.
6. Ацэнка творчасці Яна Баршэўскага Я.Падбярэскім і сучаснай крытыкай.

Літаратура

Тэксты: “Кніга “Шляхціц Завальня…” – абавязкова. Аповесць “Душа не ў сваім целе” – па жаданні.

Асноўная:

1. Гісторыя беларускай літаратуры XI—XIX стагоддзяў. У 2 т. Т. 2: Новая літаратура: др.пал. 18—19 ст / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т імя Я.Купалы; навук. рэд. тома У.І.Мархель, В.А.Чамярыцкі. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – С. 151—177.
2. Хаўстовіч, М. Гісторыя беларускай літаратуры 30-40-х гг. XIX ст.: дапаможнік для студэнтаў філал. спец. вышэйш. навуч. установ. – Мінск: БДУ, 2001. – 171 с.
3. Хаўстовіч, М. Творчасць Яна Баршчэўскага ў кантэксце жанрава-стылёвых пошукаў у польскамоўнай літаратуры 20-40-х гг. XIX ст. // Весн. Бел. Дзярж. Ун-та. Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 1999. - № 3. – С. 16-20.
4. Хаўстовіч, М. Паэт і казачнік з азёрнага краю: Ян Баршчэўскі // Слова пра літаратуру і літаратараў: Літ.-крытыч. арт. па беларускай літаратуры: У 2 кн. – Мінск: Юнацтва, 2001. – Кн. І.: XIX – пач. XX ст. – С. 61-91.
5. Хаўстовіч, М. На парозе забытае святыні: Творчасць Яна Баршчэўскага. – Мінск: ВТАА «Права і эканоміка», 2002. – 186 с.
6. Хаўстовіч, М. Мастацкі метад Яна Баршчэўскага. – Мінск: БДУ, 2003. – 204 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ТЭМА 5. В.І.ДУНІН-МАРЦІНКЕВІЧ

1. Паэтычны эпас В.І.Дуніна-Марцінкевіча (“Купала”, “Вечарніцы”, “Шчароўскія дажынкі”, “Гапон”, “Халімон на каранацыі”, “Славяне ў XIX ст.”):
- фальклорна-этнаграфічны матэрыял у творах;
- спецыфіка перадачы гістарычных падзей у паэтычным эпасе;
- элементы сентыменталізму, рамантызму і рэалізму ў гутарках.

2. “Ідылія” (“Сялянка”):
- праблематыка, сістэма вобразаў, ідэйны змест;
- праявы сентыменталізму ў творы.

3. Сатырычна-выкрывальны пафас “Пінскай шляхты”:
- Кручкоў і Пісулькін як увасабленне расійскага чыноўніцкага самавольства пасля паўстання 1863 г.;
- канцэпцыя вобраза шляхецкага саслоўя, маладое пакаленне беларусаў у творы;
- жанр твора. Актуальнасць гучання, сучаснае тэатральнае ўвасабленне на сцэне.

4. Крытычны паказ становішча беларускай паслярэформеннай вёскі ў “Залётах”:
- Антон Сабковіч як новы сацыяльны тып;
- вобраз ідэальнай шляхты і яго роля ў творы.

5. Ацэнка творчасці В.І.Дуніна-Марцінкевіча сучасным літаратуразнаўствам.

Літаратура

Тэксты: (“Купала”, “Вечарніцы”, “Шчароўскія дажынкі”, “Гапон”, “Халімон на каранацыі”, “Славяне ў XIX ст.” – 2-3 на выбар), “Ідылія”, “Пінская шляхта”, “Залёты”.

Асноўная:

1. Гісторыя беларускай літаратуры XI—XIX стагоддзяў. У 2 т. Т. 2: Новая літаратура: др.пал. 18—19 ст / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т імя Я.Купалы; навук. рэд. тома У.І.Мархель, В.А.Чамярыцкі. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – С. 198—234.

Дадатковая:

1. Кісялёў, Г. Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча: спроба навуковай сістэматызацыі дакументаў і матэрыялаў / Г. В. Кісялёў. – Мінск: Універсітэцкае, 1988. – 159 с.
2. Навуменка, І.Я. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч / І.Я.Навуменка. – Мінск : Бел. навука, 1992. – 216 с.
3. Янушкевіч, Я. Беларускі Дудар: праблема славянскіх традыцый і ўплываў у творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча / Я.Я.Янушкевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 141 с.

ТЭМА 6. ЯНКА КУПАЛА (Іван Луцэвіч, 1882–1942)

1. Ранні перыяд творчасці. Зборнікі “Жалейка”, “Гусляр”, “Шляхам жыцця”.
2. Літаратурна-творчая і грамадская дзейнасць Я.Купалы ў гады грамадзянскай вайны і акупацыі Беларусі (1917–1920).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Зборнік "Спадчына" – праблематыка, агульны пафас. Сацыяльна-філасофская, нацыянальна-патрыятычная, інтымная, пейзажная лірыка Я.Купалы.
4. Паэмы Я.Купалы ("Зімою", "На куццю", "Адплата кахання", "Нікому", "Яна і я", "Тарасова доля").
5. Тэма Бацькаўшчыны ў паэмах "Адвечная песня", "Сон на кургане", "Безназоўнае".
6. Роля Я.Купалы-прарока нацыі ў гісторыі беларускай літаратуры, развіцці нацыянальнай духоўнай культуры, музыкі, тэатра, мастацтва.
7. Спадчына Купалы ў асвятленні сучасных крытыкаў, літаратуразнаўцаў і культуролагаў.

**Літаратура**

***<u>Асноўная</u>***

Гісторыя беларускай літаратуры : ХХ стагоддзе (1920–1950–я гг.) : Падруч. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей ВНУ / У.В.Гніламёдаў, В.В.Казлова, М.А.Лазарук і інш. – 2–е выд., дапрац. і дап. – Мінск : Выш. шк., 2000. – 510 с.
Гісторыя беларускай літаратуры ХХ ст. (1920–1950-я гады). – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск : Выш. шк., 2000. – 188 с.
Гісторыя беларускай літаратуры ХХ ст.: У 4 т. – Мінск : Бел. навука, 1999–2003. – 583 с.
Беларуская літаратура ХІХ–пач. ХХст. : Хрэстаматыя. – Мінск : Маст. літ., 1975. – 475 с.
Беларускія пісьменнікі: Бібліяграфічны слоўнік: У 6 т. – Мінск : Маст. літ.,1992–1995.
Гніламёдаў, У.В. Янка Купала : Жыццё і творчасць / У.В.Гніламёдаў. – Мінск : Бел. навука, 2002. – 237 с.
Колас, Г. Д. Карані міфаў : Жыцце і творчасць Я.Купалы / Г.Д.Колас. – Мінск : БГАКЦ, 1998. – 346 с.
Пяцьдзесят чатыры дарогі : Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. – Мінск : Маст. літ., 1963. – 310 с.
Янка Купала : Энцыкл. давед. / Бел. сав. энцыкл. – Мінск : Бел. сав. энцыкл., 1986. – 670с.

## ТЭМА 7. ЯНКА КУПАЛА
(драматургія)

1. Традыцыі нацыянальнай драматургіі ў п'есе "Прымакі".
2. "Паўлінка" як трагікамедыя.

* Гісторыя напісання. Прататыпы вобразаў. Сцэнічнае жыццё.
* Супаставіць з п'есай К.Каганца "Модны шляхцюк": што агульнае ў іх? Чым адрозніваюцца творы?
* Вобраз Паўлінкі – вобраз Маладой Беларусі.

3. Сімволіка-рамантычная драма "Раскіданае гняздо".

* Гісторыя стварэння.
* "І ўсё ж мы дойдзем, дойдзем мы да Беларусі...": Вобраз-сімвал шляху ў п'есе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Шлях Лявона – трагедыйны шлях беларуса-працаўніка.
Шлях Марылі – шлях маці, якая імкнецца да захавання будучага.
Шлях Данілкі – шлях мастака.
Шлях Зоські як самы трагічны вобраз-сімвал Беларусі, разбурэнне любові і кахання.
Шлях Сымона – шлях у цемру.
Вобразы Старца і Незнаёмага і іх значэнне ў творы.
4. Ідэйна-мастацкі змест п’есы “Тутэйшыя”.
*Сцэнічны лёс твора.
* Характарыстыка вобраза Мікіты Зносака.
* Янка Здольнік – таксама тутэйшы?
*Рэнегаты, злачынцы – Усходні і Заходні вучоныя, “прафесар” Спічыні, інш.
* Асаблівасці жанру твора. Праблематыка і яе акутальнасць.

ЛІТАРАТУРА

Тэксты: “Паўлінка”, “Раскіданае гняздо”, “Тутэйшыя”.
Асноўная:
1. Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. У 4 т. / НАН Беларусі: Інстытут літаратуры Я. Купалы. – Мн., 2001-2003. – Т. 1. – С. 121 – 175.
2. Васючэнка, П. Драматургічная спадчына Янкі Купалы: Вопыт сучаснага прачытання. – Мн., 1994.
Дадатковая:
1. Журомская, Л. Песні беларускай валадар: Урок-роздум па драме Я.Купалы “Раскіданае гняздо” // Роднае слова. 1996. № 8.
2. Дрозд, С. Аб тутэйшых ... // ЛіМ. 2000. 29 верасня.
3. Казбярук, У. Драматургія ЯнкіКупалы. Творчае пераасэнсаванне традыцый // Казбярук У. Рамантычны пошук. – Мн., 1983. – С. 150–162.
4. Платонаў, Р. Зноў пра “Тутэйшых”: Дакументальная хроніка забароны Купалавай п’есы // ЛіМ. 1995. 10 лістап.
5. Петрушкевіч, А. Пры творы і творцаў. – Слонім, 2002.
6. Кабржыцкая, Т. Драматургічны геній Я. Купалы // Полымя. – 2001. – № 11. – С. 166–180.

## ТЭМА 8 ІДЭЯ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДРАДЖЭННЯ Ў ТВОРЧАСЦІ ЯКУБА КОЛАСА

1. Жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа. Прасачыць шляхі фарміравання Я. Коласа як чалавека і пісьменніка.
2. “Казкі жыцця” Я. Коласа: спецыфіка, філасафічнасць, мастацкія вартасці (кожнаму студэнту прачытаць па адной казцы (розныя!)).
3. “Новая зямля” Я. Коласа – энцыклапедыя сялянскага жыцця. Ідэя, вобразы.
4. Праблема мастака і мастацтва ў паэме “Сымон-музыка”. Актуальнасць паэмы, мастацкія асаблівасці.
5. Развагі над сутнасцю чалавечнай душы, праблемы асобы ў паэтычнай спадчыне Я. Коласа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Літаратура

Тэксты: Якуб Колас “Новая зямля”, “Сымон-музыка”, “Казкі жыцця”

Асноўная:

1. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : У 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я.Купалы; Навук. рэд.: І.Я.Навуменка, В.А.Каваленка. – Мінск : Бел. навука, 1999–2015. – т. 1.
2. Лойка, А. А. Гісторыя беларускай літаратуры: дакастрычніцкі перыяд: падручнік для філал. фак. выш. навуч. Устаноў БССР: у 2 ч. / А. А. Лойка. – Мінск: Выш. школа, 1977–1980. – ч. 2.

Дадатковая:

1. Казбярук У. “...Як промень волі і свабоды”: [ Аб паэме Я.Коласа “Новая Зямля”] // Полымя. – 1994. – № 12; яго ж: “А праўда мне ўсяго даражай...”: Перачытваючы “Новую зямлю” Коласа // Роднае слова. – 1995. – № 8, 9, 10.
2. Мушынскі М. Якуб Колас: летапіс жыцця і творчасці / М. І. Мушынскі. – Мінск : Маст. літ., 1982. – 543 с.
3. Навуменка І.Я. Якуб Колас: Нарыс жыцця і творчасці / Іван Навуменка. – 2-е выд., са зменамі. – Мінск : Нар. асвета , 2003. – 205 с.
4. Шаладонава Ж. Фарбы быту і быцця ў паэме Якуба Коласа “Новая зямля”. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 102 с.

ТЭМА 9 . МАКСІМ ГАРЭЦКІ

1. Жыццёвы і творчы шлях М.Гарэцкага.
2. Літаратура ранняга перыяду творчасці: тэма інтэлігенцыі і народа ў апавяданнях “У лазні”, “Роднае карэнне”, інш.; распрацоўка гістарычнай тэматыкі (“Лірныя спевы”).
3. Перыяд вайны і рэвалюцыі. Гуманістычны пафас твораў “Літоўскі хутарок”, “Рускі”, “Генерал”, “На імперыялістычнай вайне” (агляд).
4. Проза савецкага перыяду:
- мастацкая ўмоўнасць сюжэту ў апавяданні “Фантазія”. Праблема гістарычнага лёсу беларускага народа; ідэйная абгрунтаванасць звароту да панскага мінулага ў апавяданнях “Панская сучка”;
- інтэлігенцыя і народ, асоба і гісторыя, месца асобы ў пераломныя гістарычныя моманты паводле “крамольнай” аповесці “Дзве душы”. Вобраз Ігната Абдзіраловіча.
- “Скарбы жыцця”: адметнасць жанру, алегарычна-сімвалічны змест, трагізм лёсу апавядальніка;
5. Зварот да драматургіі.
- праблема духоўнага жыцця чалавека ў драматызаванай аповесці “Антон”;

Літаратура

Тэксты: у адпаведнасці са спісам літаратуры, дзе прадстаўлены выбар; аб тых творах, якія застаюцца па-за выбарам – кароткі канспект з падручнікаў.

Асноўная:

1. Беларуская літаратура ХХ ст.: Вучэб. дапам. / М.І.Мішчанчук, І.С.Шпакоўскі. – Мн.: Выш. шк., 2001. – С. 150–167.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ ст. У 4 т. / НАН Беларусі: Інстытут літаратуры Я. Купалы. – Мн., 2001-2003. – Т. 1. – С. 192 – 206.
3. Мушынская, Т.Ф. Беларуская літаратура 20–40-х гг. – Мн., 1994.
Дадатковая:
1. Бугаёў, Д. Максім Гарэцкі. – 2-е выд., выпраўленае і дапоўненае. – Мінск: Беларус. навука. - 2003. – 237 с.
2. Васючэнка, П. Чаму двоілася душа? // Полымя. – 1989. – № 7.
3. Мушынскі, М. Максім Гарэцкі: Нявысветленыя старонкі. Аповесць "Дзве душы" і іншыя "рэпрэсаваныя творы" // Мушынскі, М. Літаратура ХХ стагоддзя: Спроба пераасэнсавання. – Мн., 1996.
4. Чыгрын, І. Паміж былым і будучым: Проза Максіма Гарэцкага. – Мн., 1994. (Ці: "Полымя". – 1994. – № 5. – С. 227–245; № 6. – С. 220–236).
5. Чыгрын, І. У пошуках саміх сябе, або Хто такі Ігнат Абдзіраловіч? // Роднае слова. – 1994. – № 4.

## ТЭМА 10. ДЗЕЙНАСЦЬ М. БАГДАНОВІЧА НА НІВЕ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДРАДЖЭННЯ І Ў ЕЎРАПЕЙСКІМ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІМ КАНТЭКСЦЕ.

1. "Ён быў, як месяц, адзінокі…". Загадка Максіма Багдановіча.
2. Ідэя нацыянальнага адраджэння ў паэзіі М. Багдановіча. Вобраз Беларусі і яго мастацкае выяўленне.
3. М. Багдановіч – стваральнік жанраў класічнага верша ў беларускай паэзіі (знайсці прыклады санета, трыялета, рандо, рандэля і раскрыць іх змест).
4. Пытанне эстэтыкі ў апавяданнях ("Апокрыф", "Музыка", інш.)
5. Мадэрнісцкія плыні (імпрэсіянізм, сімвалізм) ў творчасці М. Багдановіча (на матэрыяле вершаў "Зімою", "Слуцкія ткачыхі", Маёвая песня", цыкл "У зачараваным царстве").
6. Вобраз Мадонны ў аднаіменным вершаваным цыкле ("Вераніка", "У вёсцы").
7. Максім Багдановіч – публіцыст і перакладчык

Тэксты: зб. "Вянок", апавяданне "Музыка".

- *выступленні студэнтаў пра тое, што найбольш уразіла ў асобе, жыцці, творчасці М. Багдановіча.*

**Літаратура**

Асноўная:
1. Гісторыя беларускай літаратуры (акадэмічнае выданне). У 4 т. -2002. – Т. 1 (раздзел "Максім Багдановіч")
2. Конан У. Святло паэзіі і цені жыцця. Лірыка М. Багдановіча – мн. 1991
3. Навуменка І. Я. Максім Багдановіч. – Мн. 1997.
4. Максім Багдановіч: Энцыклапедыя /склад. І У Саламевіч, М. В. Трус; рэд. кал. :Т. У. Бялова (гал. рэд.) і інш. – Мн., 2011.- 608с.
Дадатковая:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Міклашэўскі Я., Каханне і смерць, або лёс Максіма Багдановіча – Мн., 1995.
2. Грынчык М. Наватар беларускага верша // ЛіМ. 4.12.1981.
3. Лойка А. Максім Багдановіч. – Мн., 1966.
4. Федарцова Т. “Так вершы ззяюць даўняю красой…”: да праблемы станаўлення класічнага верша ў творчасці М. Багдановіча //Зборнік дакладаў: Матэрыялы дакладаў і паведамленняў Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (2001г.) “Макксім Багдановіч і іншанацыянальныя літаратуры” // Літаратурны музей М. Багдановіча. Склад. І. В. Мышкавец. – Мн., 2003. 174 с.

## ТЭМА 11. КАНДРАТ КРАПІВА

1. Тэматыка і праблематыка сатырычных вершаў і баек К.Крапівы:
- “ідыятызм” вясковага жыцця (плёткі, п’янства, нізкі ўзровень бытавой культуры, т.п. – падабраць па 3-5 твораў на кожную з тэм і прааналізаваць змест);
- антырэлігійная тэма (выбраць 4-5 вершаваных твораў);
- палітычная тэма і яе адлюстраванне (падабраць творы з розных перыядаў – ранняга савецкага, перыяду Вялікай Айчыннай вайны, пасляваеннага);
- асэнсаванне савецкай мадэлі культурна-грамадскага жыцця (“Ціт заводзіць новы быт”, “Ты не лайся, дзядзя, пры савецкай уладзе…”, “Балет” і інш.);
- мастацтва як скразная тэма ў творчасці (падабраць звыш 10 прыкладаў твораў на працягу ўсёй творчасці і вызначыць асноўныя аспекты закранутай тэмы).
2. Мастацкі змест паэм “Біблія” і “Хвядос – Чырвоны нос”.
3. Драматургія К.Крапівы (“Хто смяецца апошнім?”, “Мілы чалавек”, “Брама неўміручасці”): сатырычны тыпаж і праблематыка п’ес, эвалюцыя вобраза-тыпу прыстасаванца, жанравыя асаблівасці драматычных твораў, майстэрства драматурга-сатырыка.
4. Гуманістычна-сатырычная аснова прозы К.Крапівы (канспект падручніка).

Літаратура

<u>Тэксты:</u> Сатырычныя вершы і байкі – на выбар; паэма “Хвядос – Чырвоны нос”, п’есы “Хто смяецца апошнім?”, “Мілы чалавек”, “Брама неўміручасці”; 1 артыкул на выбар.

<u>Асноўная:</u>

1. Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. У 4 т. / НАН Беларусі: Інстытут літаратуры Я. Купалы. – Мн., 2001-2003. – Т. 2. С. 282—330.
*2.* Гісторыя беларускай літаратуры: XX ст (20-я—50-я гг.): Падручнік / Пад агул. рэд. М.А.Лазарука, А.А.Семяновіча. – Мн., 2000. – С. 381–411.
*3.* Гісторыя беларускай савецкай літаратуры: 1917 – 1940 гг: Падручнік / пад аг. рэд. Лазарука М.А., Семяновіча А.А. – Мн., 1981. – С. 311 – 347.

<u>Дадатковая:</u>

1. Бугаёў, Дз.Я. Талент і праца. – Мінск: Маст. літ.., 1979. – 349 с. – С. 50 – 109.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Бугаёў, Д. Я. Зброяй сатыры, зброяй праўды : Творчы шлях К. Крапівы / Д. Я. Бугаёў. — Мінск : Навука і тэхніка, 1971. — 231 с. (2004 — 2-е выд.).
3. Гніламёдаў, У. На шляху да "Брамы неўміручасці": К.Крапіва і яго роля ў белар. літаратуры // Роднае слова. – 1997. - № 12. – С. 4 – 18.
4. Лаўшук, С. Крапіва і белар. драматургія / С.Лаўшук. – 2-е выд. – Мінск: Навука і тэхніка, 2002. – 250 с. – С. 21 – 248.
5. Сабалеўскі, А. Кандрат Крапіва: Постаць і творы. — 2-е выд., дапрац. і дап. — Мінск: Нар. асвета, 2003. – 221 с.

## ТЭМА12. РЭПРЭСАВАНАЯ ЛІТАРАТУРА

1. Мадэрніцкія кірункі ў беларускай паэзіі пач. XX ст. (імажынізм у паэзіі Я. Пушчы, інтэлектуалізм паэзіі У. Дубоўкі, у. Жылкі – творы розных аўтараў на выбар)
2. Вобраз новага чалавека ў мастацкім выяўленні Андрэя Мрыя "Запіскі Самсона Самасуя", М. Зарэцкага "Дзіўная", "Голы звер" (аўтар на выбар)
   - Хто і што з'яўляецца аб'ектам высмейвання ў рамане? Дакажыце значнасць аб'екта сатырычнага выкрыцця.
   - Сутнасць натуры Самасуя: адмоўнае і станоўчае ў ёй?
   - Дайце характарыстыку "культурнай дзейнасці" Самасуя. Чаму ні адно з яго мерапрыемстваў не мела станоўчага выніку?
   - Прывядзіце прыклады сатырычных сродкаў, выкарыстаных аўтарам (пародыя, гратэск, іронія, каламбур, інш.).
   - Жанравая форма рамана і яго кампазіцыя як сродкі выяўлення аўтарскай задумы.
   - З'ява самасуеўшчыны, яе актуальнасць.
   - Чаму ўспрымаецца дзіўнай галоўная гераіня апавядання "Дзіўная" Блонскім? Якія праблемы закрануў аўтар у апавяданні? Ці актуальны змест твора сёння?

Прынцыпы, мэта, стыль жыцця Яроцкага з аповесці "Голы звер"? Чым небяспечны для кожнага індывіда падобны грамадскі тып? Пры дапамозе якога біблейскага архетыпу аўтар падкрэсліў сутнасць зла ў асобе Яроцкага? Як можна змагацца з падобнай праявай зла?

3. Шматграннасць таленту М. Гарэцкага. Пытанні асветы і культуры ў творах пісьменніка ("У лазні", "Роднае карэнне", "У чым яго крыўда". "Фантазія", інш.)
4. Маштаб таленту К. Чорнага. Праблема "жывога чалавека" у яго прозе "Макаркавых Волька", "Справа Віктара Лукашэвіча"

<u>Літаратура</u>

**<u>Асноўная:</u>**

Гісторыя беларускай літаратуры (акадэмічнае выданне). У 4 т. – 2002. – Т. 1, 2 (адпаведныя раздзелы).
Баршчэўскі Л. П., Васючэнка П. В., Тычына М. А.. Беларуская літаратура і свет ад эпохі рамантызму да нашых дзён. – Мн., 2006

**<u>Дадатковая:</u>**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Беларуская літаратура XX ст.: Вучэб. дапам. / М.І.Мішчанчук, І.С.Шпакоўскі. – Мн.: Выш. шк., 2001. – С. 50-91, 150–167.
2. Бугаёў Дз. Максім Гарэцкі. – Мн., 2002.
3. Мушынская Т.Ф. Беларуская літаратура 20–40-х гг. – Мн., 1994.

## ТЭМА 13. ВАСІЛЬ БЫКАЎ

1. Жыццёвы і творчы лёс Васіля Быкава (паводле падручнікаў ці аўдыёкнігі “Доўгая дарога дадому”).
2. Вобраз вайны ў аповесцях “Мёртвым не баліць”, “Круглянскі мост”, “Пайсці і не вярнуцца”, “Трэцяя ракета” – твор на выбар. Паняцце “быкаўскай” аповесці.
3. Экзістэнцыяльныя матывы ў творчасці 80-90х гг. XX стагоддзя.
   - Праблема героя ў творах В. Быкава гэтага перыяду. Хто з персанажаў становіцца “чужаніцай” (А. Камю) таму грамадству. у якім жыве, і чаму?
   - Абсурд як асноўная характарыстыка быцця чалавека ў сучаснай рэальнасці
   - Параўнальны аналіз апавяданняў “Сцяна” В. Быкава і “Мур” (“Сцяна”) Ж. П. Сартра.
4. Быкаўская праўда ў аповесці “Пакахай мяне, салдацік” праз вобраз героя-вызваліцеля, канцэпцыю трагізму чалавечага жыцця, пафас адмаўлення зла ва ўсіх яго праявах.
5. Сімвалічны вобраз Беларусі, асэнсаванне гістарычна-палітычнага і духоўнага становішча нацыі ў аповесці “Ваўчыная яма”.
6. Ідэйна-мастацкі змест апавядання “Труба”. Сімвалізм твора.
7. Згодна з айчыннай крытыкай, В. Быкаў зрабіў такія адкрыцці ў рэчы экзістэнцыялізму. якіх няма ў сусветнай літаратуры. Як вы думаеце, якія яшчэ досвед унёс беларускі пісьменнік у сусветную літаратуру?
8. Творы В. Быкава ў кінематографе (падрыхтоўка прэзентацыі па жаданню студэнта ) і іншых відах мастацтва.

Літаратура

<u>Тэксты:</u> “Доўгая дарога дадому”, “Сцяна”.
Аповесці “Мёртвым не баліць”, “Пакахай мяне, салдацік”, “Круглянскі мост”, “Пайсці і не вярнуцца”, “Трэцяя ракета” – на выбар.
Творы 80-90-х гг. “Ваўчыная яма”, “Труба”.

<u>Асноўная:</u>
1. Гісторыя беларускай літаратуры (акадэмічнае выданне). У 4 т. – Мн., 2002. – Т. 3 (адпаведны раздзел).

<u>Дадатковая:</u>
1. Бугаёў, Д. Спавядальнае слова: Літ.-крытыч. артыкулы. – Мн., 2001.
2. Дедков, И.А. Василь Быков: повесть о человеке, который выстоял / И.А.Дедков. – М.: Сов. Писатель, 1990. – 187 с.

## ТЭМА 14. ФІЛАЛАГІЧНАЕ ПАКАЛЕННЕ (ПАЭЗІЯ)

1. Паэзія прадстаўнікоў філалагічнага пакалення:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Грамадзянскі пафас лірыкі Н.Гілевіча, шматграннасць асобы аўтара.
3. Адметнасць паэзіі Р.Барадуліна.
4. “Веча славянскіх балад” Я.Сіпакова.
5. “Паэт думкі” А.Вярцінскі.

Заняткі праводзяцца ў форме абароны падрыхтаваных студэнтамі прэзентацый ці літаратурных партрэтаў пра творчасць аднаго з аўтараў. У выступленні неабходна падаць:

- кароткія біяграфічныя звесткі;
- назваць асноўныя паэтычныя зборнікі;
- прачытаць выразна творы;
- выказаць думку – якія ўразілі, захапілі;
- паведаміць якія з вершаў сталі песнямі;
- прыдумаць рэкламу творчасці паэта.

Літаратура

Тэксты: Р. Барадулін “Неруш”, “Свята пчалы”, “Евангелле ад мамы”, “Ксты”. Я.Сіпакоў “Веча славянскіх балад”. Н. Гілевіч раман у вершах “Родныя дзеці”, вершы “Актавы”, “Жыта, сосны, валуны”, “На высокім алтары”. А. Вярцінскі “Тры цішыні”, “Чалавечы знак”.

Асноўная літаратура:

1. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : У 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я.Купалы; Навук. рэд.: І.Я.Навуменка, В.А.Каваленка. – Мінск : Бел. навука, 1999–2015. – Т. 4, Кн. 1-2.
2. Бельскі, А. Г. Сучасная беларуская літаратура: стаўленне і развіццё творчых індывідуальнасцей. Вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў / А.І. Бельскі.— Мн.: Нар. асвета, 1997.— 254 с.

Дадатковая:

З росных сцяжын: аўтабіяграфіі пісьменнікаў Беларусі / уклад. М. Мінзер. – Мінск: «Літаратура і Мастацтва», 2009. – 460с.

## ТЭМА 15. ФІЛАЛАГІЧНАЕ ПАКАЛЕННЕ (ПРОЗА)

1. Адметнасць творчасці А.Адамовіча, аналіз твораў “Хатынская аповесць”, “Карнікі”, “Апошняя пастараль” – адзін для абавязковага прачытання, змест астатніх ведаць па крытыцы.
2. Падрыхтаваць выставу кніг у электроннай форме – для 130, 131 груп; завочную экскурсію, якая б знаёміла з роднымі мясцінамі і творчасцю, поглядамі пісьменніка на тыя ці іншыя грамадска-культурныя праблемы – для 150Т групы. Аўтар на выбар – В.Адамовіч, М.Стральцоў, І. Шамякін, В.Казько.

Матэрыял павінен быць праілюстраваны, насычаны цікавай інфармацыяй, сістэматызавана пададзены, павінен утрымліваць цытаты аўтара, навукоўцаў і т.п., абавязкова прыкладаецца спіс самастойна падабраных і выкарыстаных матэрыялаў.

Літаратура

Тэксты: у адпаведнасці са спісам літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўная:

1. Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. У 4 т. / НАН Беларусі: Інстытут літаратуры Я. Купалы. – Мн., 2001-2003. – Т. 4. Кн. 1 (адпаведныя манаграфічныя раздзелы).

Дадатковая:

1. Каваленка, В. Чорныя бездані слабых душ [пра аповесць “Карнікі”] // Каваленка В. Покліч жыцця / В. Каваленка. – Мінск, 1987. – С. 46–160.
2. Каваленка, В. Я ведаў яго зблізку : Развагі пра жыццё і творчасць А.Адамовіча / В. Каваленка // Полымя. 1997. – № 1. – С. 273–293.
3. Афанасьеў, І. Месца, якое ёсць... : Аргументы антыутопіі [пра аповесць “Апошняя пастараль”] / І. Афанасьеў // Будзем садзіць сад... / І.Афанасьеў.– Мінск, 1991. – С. 72–82.
4. Беларускія пісьменнікі; [пад рэдакцыяй А. В. Мальдзіса]: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы Акад. навук Рэсп. Беларусь, Беларус. энцыкл. – Мінск : БелЭн, 1992–1995. – 6 т.
5. Васючэнка П. Пошукі страчанага дзяцінства: Беларус. празаікі “сярэдняга пакалення” аб Вялікай Айчыннай вайне. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 147 с.
6. Тычына, М. Называць усё сваімі імёнамі: Пра А.Адамовіча // Роднае слова. – 2002. – № 9, 10.

## ТЭМА 16. АСОБА У.КАРАТКЕВІЧА Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. У.Караткевіч як паэт: лірык, гумарыст, рамантык, філосаф, інш. (паводле зб. “Мая Іліяда”, “Быў. Ёсць. Буду.” – вершы на выбар студэнта).
2. Спецыфіка адлюстравання гістарычных падзей у прозе У.Караткевіча (аналіз прачытаных твораў на выбар студэнтаў).
3. У.Караткевіч як вялікі падарожнік. Вобраз Беларусі і беларусаў у нарысе “Зямля пад белымі крыламі”.
4. У.Караткевіч-драматург (“Званы Віцебска”, “Маці Урагану”, “Кастусь Каліноўскі”, “Млын на Сініх Вірах”, “Калыска чатырох чараўніц”) – канспект падручніка.
5. Казкі У.Караткевіча для дзяцей.
6. Зварот да творчасці У.Караткевіча кампазітараў, мастакоў, пісьменнікаў, людзей іншых відаў мастацтва (прывесці прыклады).

**Літаратура**

**Тэксты:** Вершы на выбар. Зб. “Мая Іліяда”, “Быў. Ёсць. Буду.”Аповесці і раманы “Ладдзя Роспачы”, “Сівая легенда”, “Дзікае паляванне караля Стаха”, “Чорны замак Альшанскі” ці інш., нарыс “Званы ў прадоннях азёр” (урыўкі), 1-2 казкі.

**Асноўная:**

1. Гісторыя беларускай літаратуры (акадэмічнае выданне). У 4 т. – 2002. – Т. 4. Кн. 1. – С. 361–391.
2. Верабей А. Абуджаная памяць: нарыс жыцця і творчасці Уладзіміра Караткевіча / А. Л. Верабей. – Мн., 1997. – 256 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Ішчанка Г. М. Уладзімір Караткевіч. – Мінск: Аверсэв, 2005. – 207с.

<u>**Дадатковая:**</u>

1. Русецкі, А. Уладзімір Караткевіч: праз гісторыю ў сучаснасць / А.У.Русецкі. – Мн., 2000. – 300 с.
2. Электронны рэсурс: http://www.uladzimir-karatkevich.com/krit/verabei2.html
3. Уладзімір Караткевіч. Быў. Ёсць. Буду! : успаміны, інтэрв'ю, эсэ / укладанне Г. Шаблінскай. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. – 517 с. – (Жыццё знакамітых людзей Беларусі : ЖЗЛБ).
4. Караткевіч вядомы і невядомы. – Мінск, 2010.
5. Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце: навук. Збор. / рэдкал. А. Мальдзіс (гал. рэд.) і інш. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2000.
6. Мальдзіс, А. Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча. – Мінск, 1998.

## ТЭМА 17. ЮРЫ СТАНКЕВІЧ

*Раман "Любіць ноч – права пацукоў":*

1. Паміж якімі персанажамі ўзнікае канфлікт у творы і чаму? Як яго спрабуюць вырашыць героі твора?
2. З якімі персанажамі у вас асацыіруецца вобраз пацукоў? Абгрунтуйце адказ.
3. Ахарактарызуйце паводзіны жыхароў Янаўска. Чаму дапамагае Данілу Прусаку толькі Антон Кніга?
4. Які падтэкст вы прачытваеце ў назве рамана? Якія яшчэ існуюць у рамане вобразы-сімвалы?
5. Што сказаў аўтар у сваім творы пра постчарнобыльскую рэальнасць і лёс Беларусі?

*Тэматычна-праблемнае поле іншых твораў пісьменніка: апавяданняў, раманаў, прытчаў.*

Літаратура

<u>Тэксты:</u> Раман "Любіць ноч – права пацукоў", прытчы "Збіральнік страху", "Хутканог", іншыя творы – па жаданні.

<u>Асноўная:</u>

Козіч, В. Сучасная літаратура і праўда жыцця / В. Козіч // Полымя. – 2000. – № 11. – С. 184–195.

<u>Дадатковая:</u>

Грышкевіч, С. Знішчаючы ідэалы: Творчасць Ю. Станкевіча / С. Грышкевіч // ЛіМ. – 2004. – 23 студзеня. – С. 7.

Шавлякова, И. Странный космос: О прозе Ю. Станкевича / И. Шавлякова // Нёман. – 2001. – № 9. – С. 241–254.

Шаладонаў, І. Экзістэнцыянальны гуманізм прозы Ю. Станкевіча / І. Шаладонаў // Роднае слова. – 2012. – № 4. – С. 23–26.

Гігевіч, Г. Пра гэты няправільны раман: раман Ю. Станкевіча "Любіць ноч – права пацукоў" / Г. Гігевіч // ЛіМ. – 1999. – № 1. – С. 7.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Грамадчанка, Т. “Не пасаваць перад сцяной…” / Т. Грамадчанка // Полымя. – 2002. – № 1. – С. 289.

ТЭМА 18. СУЧАСНЫ ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС

(Гістарычныя працэсы і падзеі ХХ ст. у асэнсаванні мастацкай літаратуры)

1. Тэма сталінскіх рэпрэсій ва ўспамінах Ф.Аляхновіча, С.Грахоўскага, Л.Геніюш.

- *аўтабіяграфізм* твораў. Якія факты з жыцця пакладзены ў аснову кожнага з твораў?
- чаму кожны з твораў можна назваць праўдзівым *дакументам* часу?
- вызначце, з якой *мэтай* пісаўся кожны з названых твораў?
- чаму трылогія С.Грахоўскага названа *“Споведзь”*? кніга Л.Геніюш?
- якім паўстае лагер у выяўленні былых вязняў? (прывесці ў прыклад эпізоды, якія вас ўразілі)
- якім паўстае ў творы аўтар-апавядальнік як чалавек, грамадзянін, пісьменнік?
- самастойна адшукайце творы беларускай літаратуры, у якіх закраналася тэма ГУЛАГу.

2. Творчасць С.Алексіевіч. Кніга “Чарнобыльская малітва”:

- Прывесці з тэксту прыклады, як успрымаюць Чарнобыльсккую аварыю людзі розных узростаў, светапогляду, прафесіі і інш.;
- “Аказваецца, мурашы бываюць і чорныя, і чырвоныя…”: як змяняюцца адносіны чалавека да прыроды пасля катастрофы? Да якіх “адкрыццяў” ён прыходзіць?
- Якімі прычынамі можна вытлумачыць непадрыхтаванасць людзей да чарнобыльскай катастрофы?
- Якія наогул змены адбыліся ў чалавеку і з чалавекам (канкрэтныя прыклады з тэксту).
- “Чаму гэта здарылася ў нас…”: які адказ знаходзяць людзі на гэта пытанне? А як думаеце вы?
- Чаму Чарнобыль – катастрофа? Якія вынікі чарнобыльскай аварыі – у сацыяльным, духоўным, культурна-нацыянальным жыцці краіны?

3. Раман Юры Станкевіча “Любіць ноч – права пацукоў”:

- Паміж якімі персанажамі ўзнікае канфлікт у творы і чаму? Як яго спрабуюць вырашыць героі твора?
- З якімі персанажамі у вас асацыіруецца вобраз пацукоў? Абгрунтуйце адказ.
- Ахарактарызуйце паводзіны жыхароў Янаўска. Чаму дапамагае Данілу Прусаку толькі Антон Кніга?
- Які падтэкст вы прачытваеце ў назве рамана? Якія яшчэ існуюць у рамане вобразы-сімвалы?
- Што сказаў аўтар у сваім творы пра постчарнобыльскую рэальнасць і лёс Беларусі?

**Літаратура**

**Тэксты:** названыя ў пытаннях семінара.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**<u>Асноўная:</u>**

1. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : У 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я.Купалы; Навук. рэд.: І.Я.Навуменка, В.А.Каваленка. – Мінск : Бел. навука, 1999–2003. – Т. 3. – С. 349 – 380; Т. 4. – Кн. 2. – С. 248–269.

**<u>Дадатковая:</u>**

1. Чабан, Т.К. Споведзь нескаронага сэрца / Т.К.Чабан // Літ. і мастацтва. – 1990. – 6 ліп. (№ 27). – С. 6–7.

2. Тарасава, Т. М. Гулагаўская тэматыка ў аўтабіяграфічнай прозе // Сучасны літаратурны працэс: тэндэнцыі і праблемы развіцця: дапаможнік / І. М. Гоўзіч, Т. К. Грамадчанка, А. С. Гурская і інш.; пад агул. рэд. Т. К. Грамадчанкі. – Мінск: БДПУ, 2010. – 104 с. – С. 93 – 102.

3. Друк, Г.М. "Споведзь" С.Грахоўскага: Духоўныя пошукі аўтара і яго героя // Міжнародныя Шамякінскія чытанні "Пісьменнік – Асоба – Час": Матэрыялы IV Міжнароднай навук.-практ. канф., Мазыр, 2 кастрычніка 2015 г. / МДПУ імя І.П.Шамякіна; Рэдкал.: А.У.Сузько (адк. рэд. [і інш.]). – Мазыр, 2015. – 163 с. – С.17-23.

## ТЭМА 19. СУЧАСНЫ ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС

Заняткі праводзяцца ў форме абароны падрыхтаваных студэнтамі прэзентацый ці літаратурных партрэтаў пра творчасць аднаго з сучасных аўтараў (размяркоўваюцца самастойна ў групе). Спіс аўтараў:

*Эдуард Акулін, Анатоль Сыс, Леанід Дранько-Майсюк, Алесь Разанаў, Адам Глобус, Міхась Скобла, Алесь Бадак, Рагнед Малахоўскі, Віктар Жыбуль, Серж Мінскевіч;*

*Іншыя творчыя постаці – пасля ўзгаднення з выкладчыкам.*

У сваім выступленні неабходна падáць:

- кароткія біяграфічныя звесткі (год і месца нараджэння, адукацыя і род заняткаў, хобі аўтара);
- назваць асноўныя паэтычныя зборнікі;
- выбраць і прачытаць на занятках тыя вершы, якія ўразілі, захапілі, выклікалі абурэнне ці інш.; растлумачыць, чаму пэўныя паэтычныя радкі "зачапілі" вашы думкі, уяўленні, пачуцці; вызначыць, якім вершам – традыцыйным ці эксперыментальным (хоку, трыялеты, вянкі санетаў, паліндромы, акравершы, рубаі і інш.) аддае перавагу аўтар, ці звяртаецца ён да "візуальнай" паэзіі; расказаць пра вершы, якія пакладзены на музыку; прыдумаць рэкламу творчасці аўтара (вітаюцца арыгінальныя творчыя формы).

**<u>Літаратура</u>**

**<u>Тэксты:</u>** На занятку падрыхтаваць выразнае (мастацкае) чытанне не менш 7 вершаў выбранага аўтара (чытанне на памяць вітаецца!).

**<u>Асноўная:</u>**

1. Бельскі, А. І. Сучасная беларуская літаратура : станаўленне і развіццё творчых індывідуальнасцяў (80–90 гг.): вучэбна-метадычны дапаможнік для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

настаўнікаў / А.І.Бельскі. – Мінск : Нар. асвета, 1997. – С. 83–188 (раздзел “Паэзія”).

**Дадатковая:**

1. Бельскі, А.І. Неадлучная ад традыцыі. Каханне, прырода, сусвет... [Текст] : паэзія часопіса "Маладосць" за 2006 / А. Бельскі // Полымя : Літаратурна-мастацкі і грамадска-палітычны часопіс. - 2007. - № 12. - С. 149-165.
2. З росных сцяжын: аўтабіяграфіі пісьменнікаў Беларусі / Уклад. М.Мінзер. – Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2009. – 460 с.
3. Федарцова Т. М. Трыялет у сучаснай беларускай літаратуры / Т. М. Федарцова / Роднае слова. – 2001. – № 4.

## ТЭМА 20. СУЧАСНЫ ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС

1. Проза сучасных аўтараў-жанчын.

- Раз’яднанне ідэалаў і рэальнасці, ідэя неабходнасці маральнага абнаўлення асобы, сям’і, грамадства ў апавяданнях Р.Баравіковай са зб. “Вячэра манекенаў”.
- Вобраз жанчыны ў творах А.Брава (“Тапіць дзяўчынак тут дазволена”, “Дараванне”, “Каменданцкі час для ластавак” ці інш. – адзін твор для прачытання, з астатнімі пазнаёміцца па крытыцы).
- падрыхтаваць рэкламны твор (ролік, малюнкі, вершаваны ці ў іншай форме) пра аповесць Ю.Каляды “Invikta, або Галоўная памылка Афанасія”.
- Творчасць Л.Рублеўскай. Аналіз твораў на выбар. Звярнуць увагу на экранізацыю твора “Авантуры Пранціша Вырвіча”.

2. Пісьмова падрыхтаваць агляд твораў А.Федарэнкі (акрамя 150Т гр.). Традыцыйнае і новае ў паказе гэтым аўтарам беларускай вёскі (для 130-х груп), мінулага беларусаў (для 150Т).

3. Праявы постмадэрнізму ў сучаснай беларускай прозе:

- падрыхтаваць індывідуальныя паведамленні: пра сучасны беларускі дэтэктыў; беларускі комікс; фантастыку на сучасным этапе развіцця.
- напісаць міні-эсэ (ці водгук) паводле выбарачна прачытаных твораў пра аднаго з аўтараў – А.Глобус, А.Бахарэвіч, С.Балахонаў.

4. Аналіз аповесці А.Наварыча “Літоўскі воўк” (толькі для 150Т групы).

### Літаратура

**Тэксты**: Р.Баравікова (апавяданні са зб. “Вячэра манекенаў” 2-3 на выбар), Л.Рублеўская (“Пярсцёнак апошняга імператара”, “Золата забытых магіл”, “Дзеці гамункулуса” ці іншы твор на выбар), А.Брава (“Тапіць дзяўчынак тут дазволена” ці інш.); Ю.Каляда (Invicta, альбо Галоўная памылка Афанасія); Федарэнка А. “Бляха”, “Вёска”, “Дзікі луг” – 2 на выбар для 130, 131; “Нічые” – для 150Т; асобныя творы іншых аўтараў на выбар для выканання заданняў).

**Асноўная:**

1. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : У 4 т. Т.4. Кн. 3 / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Цэнтр даслед. бел.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры, мовы і літ.; навук. рэд. У.В.Гніламёдаў, С.С.Лаўшук. – 2-е выд. – Мінск : Бел. навука, 2015.
2. Сінькова, Л.Д. Паміж тэкстам і дыскурсам: беларуская літаратура ХХ-ХХІ стст. : гісторыя, кампаратывістыка і крытыка (літаратурная крытыка, артыкулы, гутаркі) / Л. Сінькова. - Мінск : Паркус плюс, 2013. – 292 с.

**<u>Дадатковая:</u>**

1. Кісліцына, Г.М. Чалавек постмадэрну ў сучаснай беларускай літаратуры / Г.М.Кісліцына, навук.рэд. М.А.Тычына; Ін-т мовы і літ. імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі. – Мінск: Права і эканоміка, 2010. – 169 с.
2. Шынкарэнка, В.К. Абнаўленне жанравай прыроды сучаснага гістарычнага рамана (“Літоўскі воўк” А.Наварыча) // Славянскія літаратуры ў сусветным кантэксце: праблемы развіцця беларускай і рускай літаратур: матэрыялы VI Міжнар. навук. канф., Мінск, БДУ, 8-10 кастрычніка 2003 г. У 2 ч. Ч.2. – Мінск: РІВШ БДУ, 2003. – С. 262- 266.
3. Дасаева, Т.М. Беларуская літаратура ХХ - пачатку ХХІ стагоддзя : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях “Журналістыка міжнародная”, “Журналістыка (па напрамках)”, “Літаратурная работа (па напрамках)”, “Інфармацыя і камунікацыя”, “Беларуская філалогія” / Т.М. Дасаева. -- Мінск : РІВШ, 2016. - 263 с.

## ТЭМА 21. ДРАМАТУРГІЯ: ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ

1. Творчы шлях А.Макаёнка. Наватарства драматурга ў п’есах “Лявоніха на арбіце”, “Трыбунал”, “Зацюканы апостал” ці інш. (творы на выбар).
2. Філалагічнае пакаленне ў драматургіі:
- А.Петрашкевіч. Аналіз п’есы “Воля на крыжы”.
- М.Матукоўскі. Праблематыка і ідэйны змест п’есы “Калізей”.

*Дадаткова – толькі для 130А, М – заданне А і Б ці А і В:*

А) Падрыхтаваць буклет пра творчасць А.Петрашкевіча з кароткай анатацыяй на п’есы апошніх гадоў.

Б) Пазнаёміцца з літаратуразнаўчай ацэнкай творчасці М.Матукоўскага, выпісаць сабе 2-3 ацэначныя выказванні, якія найбош спадабаліся.

3. Творчы партрэт А.Дударава. Актуальнасць праблематыкі яго твораў – “Парог”, “Вечар”, “Радавыя”, “Адцуранне”, “Чорная панна Нясвіжа”, “Купала” (творы для аналізу на выбар).
4. Рэмейкавая драматургія С.Кавалёва.
5. Традыцыі народнай казкі ў сучаснай драматургіі (п’есы П.Васючэнкі “Страшнік Гам”, “Янук – рыцар Мятлушкі” Л.Рублеўскай, зб. казак “Шлях з Бэтлеему” С.Кавалёва) – твор на выбар.

### Літаратура

**<u>Тэксты:</u>** у адпаведнасці з пытаннямі і спісам літаратуры.

**<u>Асноўная:</u>**

1. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : У 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я.Купалы; Навук.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэд.: І.Я.Навуменка, В.А.Каваленка. – Мінск: Бел. навука, 1999–2003. – Т.4. – Кн. 2. (раздзел “Драматургія” і манаграфічныя раздзелы на с. 311-351, 649-674).
2. Васючэнка, П.В. Сучасная беларуская драматургія: дапам. для настаўнікаў / П.В.Васючэнка. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 156 с.

**Дадатковая:**

1. Сучасная беларуская драматургія: Традыцыі і наватарства / уклад. П.Васючэнка. – Мінск: Маст. літ., 2003. – 639 с.
2. Сучасная беларуская п’еса: Зб. / склад. Г.Марчук. – Мінск: Маст. літ., 1992. – 396 с.
3. Сучасная беларуская п’еса: Зб. / склад. П.Васючэнка. – Мінск: Маст. літ., 1997. – 302 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэматыка семінарскіх заняткаў па дысцыпліне “Беларуская літаратура” для студэнтаў для студэнтаў ФХК, ФМіХМ, ФКіСКД (дзённая форма навучання)**

**№ 1. Літаратура XIX ст. (Творчая спадчына Я. Баршчэўскага і В. Дуніна-Марцінкевіча)**

***Тэксты:*** *Я. Баршчэўскі* апавяданні “Ваўкалак”, “Плачка” з кнігі “Шляхціц Завальня або Беларусь у фантастычных апавяданнях”*, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч п*’еса “Пінская шляхта”.

1. Рамантызм у літаратуры XIX ст.
2. Асаблівасці структуры кнігі “Шляхціц Завальня або Беларусь у фантастычных апавяданнях” Яна Баршчэўскага.
3. Праблематыка апавядання “Ваўкалак” з кнігі “Шляхціц Завальня або Беларусь у фантастычных апавяданнях” Я. Баршчэўскага.
4. Вобраз Плачкі з апавядання “Плачка” Я. Баршчэўскага.
5. Спалучэнне рамантызму і рэалізму ў творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча.
6. Праблематыка п’есы “Пінская шляхта”

**Літаратура:**

Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі. Укладанне, прадмова і каментарыі М. Хаўстовіча. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1998. – 480 с.

*Дунін-Марцінкевіч* В. Творы. – Мн., 1994.

Перкін, Н. Абсягі думкі. Літаратурна-крытычныя артыкулы / Н. Перкін. – Мінск: Маст.літ., 1980. – 288 с.

Хаўстовіч, М.В. На парозе забытае святыні: Творчасць Яна Баршчэўскага / М.В. Хаўстовіч. – Мінск: ВТАА Права і эканоміка, 2002. – 186 с.

*Навуменка* І.Я. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. – Мн., 1992.

*Лойка, А. А.* Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд: у 2 ч. / А. А. Лойка. - Мн, 1988-1989. - Ч. І. -299 с; Ч. ІІ. - 437 с.

*Гісторыя* беларускай літаратуры XI – XIX ст. Том 2. – Мн., 2007.

**<u>№ 2. Літаратурны працэс пачатку XX ст. (творчасць Я.Купалы)</u>**

***Тэксты:*** *Я.Купала п’еса “Тутэйшыя” (абавязкова), вершы “Спадчына”, “Паязджане”, “О так! Я – пралетар!”, “А хто там ідзе”, “Смейся!”, “Малітва”, “Маё цярпенне”, “Маладая Беларусь” і інш. (3-4 вершы).*

1. Гістарычныя ўмовы развіцця літаратуры на пачатку XX ст. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. і нацыянальнае адраджэнне. Газеты “Наша доля” і “Наша ніва”.
2**.** Наватарская роля Я.Купалы ў развіцці беларускай паэзіі і драматургіі. Вытокі творчасці. Значэнне фальклору ў маральным і эстэтычным выхаванні будучага паэта. Засваенне вопыту нацыянальнай і суседніх славянскіх літаратур.
3. Сімвалізм у творчасці Я.Купалы (*вершы* “Спадчына”, “Паязджане”, “О так! Я – пралетар!”, “А хто там ідзе”, “Смейся!”, “Малітва”, “Маё цярпенне”, “Маладая Беларусь” і інш.)
4. Майстэрства Купалы-камедыёграфа. Гістарычная абумоўленасць звароту да драматургічных жанраў. Трагікамедыя “Тутэйшыя”. Час і месца дзеяння ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

п’есе. Сістэма вобразаў. Акцэнтацыя ўвагі аўтарам на трагедыі “тутэйшасці”. Сэнс назвы твора.

Літаратура:

Гісторыя беларускай літаратуры ХХ ст.: У 4 т. - Мн., 1999;
Бібліяграфічны слоўнік “Беларускія пісьменнікі”.-Мі., 1992-1995.
*Баргдановіч, І.* Янка Купала і рамантызм / І. Багдановіч. -Мн., 1989.-220 с.
*Васючэнка, П. В.* Драматургічная спадчына Янкі Купалы / П. В. Васючэнка. - Мн., 1994.
*Лойка, А. Янка* Купала: энцыклапедычны даведнік. - Мн, 1986. -727 с.
*Ярош, М. Р.* Янка Купала і беларуская паэзія / М. Р. Ярош. -Мн, 1971.- 255 с.
*Лойка А. А.* Беларуская паэзія пачатку ХХ ст. / А.А. Лойка.-Мн, 1972. -240 с.
*Колас, Г.* Карані міфаў: Жыццё і творчасць Янкі Купалы / Г. Колас. - Мн., 1998. - 346 с.

**№ 3. Літаратура 20-40-х гадоў ХХ ст. Творчасць А.Мрыя**

***Тэкст:*** *А.Мрый “Запіскі Самсона Самасуя”*

1. Літаратура 1920-х гадоў. Актывізацыя культурна-грамадскага жыцця. Стварэнне літаратурных арганізацый Маладняк”, “Узвышша”, “Полымя”, інш.). Ідэйна-эстэтычныя праграмы аб’яднанняў: стаўленне да класічнай спадчыны, вуснай народнай творчасці, погляды на выхаванне новага чалавека.
2. Творчасць Андрэя Мрыя. “Запіскі Самсона Самасуя” як першы сатырычны раман у нацыянальнай прозе. Гісторыя публікацыі. Прачытанне рамана ў 1920-я гг. і ў наш час. “Непатапляльнасць” Самасуя, тыповасць, універсальнасць адкрытага А.Мрыем вобраза. Сатырычныя вобразы другога плана (Сом, Лін, Крэйна, Мамон, Торба, інш.). Шапялёўка як мастацкая мадэль свету, створаная па законах сатырычнай літаратуры. Мажлівасць суаднясення рамана А.Мрыя з жанрам антыутопіі. Сродкі сатырычнага ўзнаўлення рэчаіснасці. Кампазіцыйныя асаблівасці.

Літаратура:

Гісторыя беларускай літаратуры ХХ ст.: У 4 т. Т.1,2.- Мн., 2002.
Бібліяграфічны слоўнік “Беларускія пісьменнікі”.-Мі., 1992-1995.
Мушынская Т.Ф. Беларуская літаратура 20-40-х гг. – Мн., 1994.
Дасаева Т. Пошукі героя: З вопыту беларускай прозы 20-х гг.- Мн.,1993.

**№ 4. Літаратура 20-40-х гадоў ХХ ст.**
**Творчасць М. Гарэцкага і М. Зарэцкага**

**Тэксты: М.Гарэцкі** “Рускі” (абавязкова), “Роднае карэнне”, “Літоўскі хутарок”, “Чарнічка”, “Генерал”, “Сумная дзяўчынка”, “Кветкі зла” (1 апавяданне на выбар), **М.Зарэцкі** (“Дзіўная”, “Голы звер” – 1 на выбар).

1. Паняцце “рэпрэсаванай” літаратуры. Агульныя біяграфічныя звесткі пра пісьменнікаў і кароткі агляд іх творчасці.
2. Шматграннасць таленту М. Гарэцкага. Пытанні асветы і культуры ў творах пісьменніка. Праблематыка твораў “Рускі” (абавязкова), “Роднае карэнне”, “Літоўскі хутарок”, “Чарнічка”, “Генерал”, “Сумная дзяўчынка”, “Кветкі зла”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Творчасць М.Зарэцкага ("Бель", "Дзіўная", "Голы звер" – на выбар). Абарона агульначалавечых каштоўнасцей у апавяданнях "Бель", "Дзіўная". Вобразы жанчын. Навізна праблематыкі, сюжэтна-кампазіцыйнае майстэрства ў творы "Голы звер".

**Літаратура**

Гісторыя беларускай літаратуры (акадэмічнае выданне). У 4 т. – 2002. – Т. 1, 2 (адпаведныя раздзелы).

Баршчэўскі Л. П., Васючэнка П. В., Тычына М. А.. Беларуская літаратура і свет ад эпохі рамантызму да нашых дзён. – Мн., 2006

Мушынскі, М.І. Няскораны талент: Праўдзівая гісторыя жыцця і творчасці Міхася Зарэцкага / М. І. Мушынскі. - Мн, 1991.-292 с.

Беларуская літаратура ХХ ст.: Вучэб. дапам. / М.І.Мішчанчук, І.С.Шпакоўскі. – Мн.: Выш. шк., 2001. – С. 50-91, 150–167.

Бугаёў Дз. Максім Гарэцкі. – Мн., 2002.

Мушынская Т.Ф. Беларуская літаратура 20–40-х гг. – Мн., 1994.

**№ 5. Творчасць Васіля Быкава**

**Тэксты: В.Быкаў** "Мёртвым не баліць" (абавязкова); "Аблава", "Сцяна", "Кошка і мышка" (1 твор на выбар).

1. Экзістэнцыялізм у літаратуры.
2. Уклад В.Быкава ў спасціжэнне рэальнай праўды пра Другую сусветную вайну. Палемічнасць яго творчасці. Праблемная навізна яго аповесцяў. Шматпланавасць паказу вайны.
3. Пашырэнне тэматычнага дыяпазону творчасці ў 1980 – 90-я гг., зварот да трагічных падзей нядаўняй гісторыі.
4. Трагедыйнасць твораў апошніх дзесяцігоддзяў.
5. Адкрыццё новых праблем і тэм празаікам. Асаблівасці стылю. Жанравая адметнасць аповесці В.Быкава.
6. Экзістэнцыялізм і творчасць В. Быкава. Праблема выбару ў яго творах (на прыкладзе прачытанага).

**Літаратура**

Гісторыя беларускай літаратуры : ХХ стагоддзе (1920–1950–я гг.) : Падруч. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей ВНУ. – 2–е выд., дапрац. і дап. – Мінск : Выш. шк., 2000. – 510 с.

Гісторыя беларускай літаратуры ХХ ст.: У 4 т. – Мінск : Бел. навука, 1999–2003. – 583 с.

.Афанасьеў, І. М. Чарнобыльскае светаадчуванне ў сучаснай беларускай літаратуры / Іван Афанасьеў. – Мінск: Бел. навука, 2001. – 128 с.

Баршчэўскі, Л. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён : папулярныя нарысы / Лявон Баршчэўскі, Пятро Васючэнка, Міхась Тычына. – Мінск : Радыёла–плюс, 2006. – 574 с.

Беларускія пісьменнікі: Бібліяграфічны слоўнік: У 6 т. – Мінск : Маст. літ.,1992–1995.

2002. – 237 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дедков, И. А. Василь Быков : Повесть о человеке, который выстоял. – М.: Сов.писатель, 1990. – 187 с.

**№ 6. Сучасны літаратурны працэс (другая палова 80-х гадоў XX ст. – пачатак XXI ст.)**

**Тэксты:** Ю.Станкевіч “Любіць ноч – права пацукоў”

1. Постмадэрнізм у беларускай літаратуры.
2. Аналіз рамана “Любіць ноч – права пацукоў”.
3. Вобразы пацукоў і чужынцаў.
4. Спосабы перамагчы зло.
5. Адкрыты фінал і праблематыка твора.
6. Традыцыі і наватарства ў сучаснай беларускай літаратуры.

**Літаратура**

Сучасны літаратурны працэс: тэндэнцыі і праблемы развіцця: дапаможнік / І.М.Гоўзіч, Т.К.Грамадчанка, А.С.Гурская і інш.; пад аг. рэд. Т.К.Грамадчанкі. – Мінск: БДПУ, 2010. – С. 41–50.

Грышкевіч, С. Знішчаючы ідэалы: Творчасць Ю. Станкевіча / С. Грышкевіч // ЛіМ. – 2004. – 23 студзеня. – С. 7.

Шавлякова, И. Странный космос: О прозе Ю. Станкевича / И. Шавлякова // Нёман. – 2001. – № 9. – С. 241–254.

Шаладонаў, І. Экзістэнцыянальны гуманізм прозы Ю. Станкевіча / І. Шаладонаў // Роднае слова. – 2012. – № 4. – С. 23–26.

Гігевіч, Г. Пра гэты няправільны раман: раман Ю. Станкевіча “Любіць ноч – права пацукоў” / Г. Гігевіч // ЛіМ. – 1999. – № 1. – С. 7.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэматыка семінарскіх заняткаў па дысцыпліне "Беларуская літаратура" для студэнтаў для студэнтаў ФХК, ФМіХМ, ФКіСКД (завочная форма навучання)**

**<u>№ 1. Літаратурны працэс пачатку ХХ ст. (творчасць Я.Купалы)</u>**

***Тэксты:*** *Я.Купала п'еса "Тутэйшыя" (абавязкова), вершы "Спадчына", "Паязджане", "О так! Я – пралетар!", "А хто там ідзе", "Смейся!", "Маё цярпенне" і інш. (3-4 вершы).*

1. Гістарычныя ўмовы развіцця літаратуры на пачатку ХХ ст. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. і нацыянальнае адраджэнне. Газеты "Наша доля" і "Наша ніва".

2. Наватарская роля Я.Купалы ў развіцці беларускай паэзіі і драматургіі. Вытокі творчасці. Значэнне фальклору ў маральным і эстэтычным выхаванні будучага паэта. Засваенне вопыту нацыянальнай і суседніх славянскіх літаратур.

3. Сімвалізм у творчасці Я.Купалы (*вершы* "Спадчына", "Паязджане", "О так! Я – пралетар!", "А хто там ідзе", "Смейся!", "Маё цярпенне" і інш.)

4. Майстэрства Купалы-камедыёграфа. Гістарычная абумоўленасць звароту да драматургічных жанраў. Трагікамедыя "Тутэйшыя". Час і месца дзеяння ў п'есе. Сістэма вобразаў. Акцэнтацыя ўвагі аўтарам на трагедыі "тутэйшасці". Сэнс назвы твора.

<u>Літаратура:</u>

Гісторыя беларускай літаратуры ХХ ст.: У 4 т. - Мн., 1999;
Бібліяграфічны слоўнік "Беларускія пісьменнікі".-Мі., 1992-1995.
*Багдановіч, І.* Янка Купала і рамантызм / І. Багдановіч. -Мн., 1989.-220 с.
*Васючэнка, П. В.* Драматургічная спадчына Янкі Купалы / П. В. Васючэнка. - Мн., 1994.
*Лойка, А. Янка* Купала: энцыклапедычны даведнік. - Мн, 1986. -727 с.
*Ярош, М. Р.* Янка Купала і беларуская паэзія / М. Р. Ярош. -Мн, 1971.- 255 с.
*Лойка А. А.* Беларуская паэзія пачатку ХХ ст. / А.А. Лойка.-Мн, 1972. -240 с.
*Колас, Г.* Карані міфаў: Жыццё і творчасць Янкі Купалы / Г. Колас. - Мн., 1998. - 346 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# IV. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## Кантралюемая самастойная работа для студэнтаў ФІДК дзённай формы навучання

### Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананню самастойнай работы

Для студэнтаў прадугледжаны разнастайныя формы выканання самастойнай работы, якія па сваім змесце скіраваны на спецыфіку профільнага навучання, інтарэсы і духоўныя запатрабаванні асобы. Заданні ўлічваюць ступень валодання вучэбным матэрыялам, уменне выкарыстоўваць веды на практыцы, магчымасць праявіць свае творчыя здольнасці. Кантралюемая самастойная работа можа быць праведзена ў форме тэста, вуснага і пісьмовага апытання, а таксама ў выглядзе напісання рэферата. Усё гэта дазволіць вызначыць ступень засвоенасці матэрыялу, уменне арыентавацца ў свеце мастацкіх з'яў і напрамкаў, аналізаваць мастацкі тэкст.

Пры ацэнцы адказу студэнта ўлічваюцца наступныя ўменні:

- успрымаць літаратурны твор ва ўзаемасувязі гісторыі і сучаснасці;
- самастойна аналізаваць мастацкі твор і творчасць пісьменніка;
- весці дыялог па дыскусійных пытаннях сусветнай літаратуры.

### Прыкладныя заданні для выканання КСР

1. Стварыць прэзентацыю па творчасці наступных пісьменнікаў (на выбар): М.Багдановіч, Я.Купала, М.Гарэцкі, З.Бядуля, Я.Колас, К. Чорны, В. Быкаў, Я.Брыль, І.Шамякін, У.Караткевіч, М.Танк, А.Куляшоў, П.Панчанка, Р.Барадулін, А. Макаёнак, К. Крапіва, А.Дудараў, С.Кавалёў.

2. Прааналізваць твор беларускага пісьменніка XX-XXI стст. (аўтары і тэксты на выбар са спіса).

3. Беларускія літаратурныя суполкі і аб'яднанні XX ст. (падрыхтаваць рэферат).

3. Падрыхтаваць паведамленне пра літаратурныя музеі беларускіх пісьменнікаў (можа быць прадстаўлена ў форме прэзентацыі, агляду ці эсэ).

4. Літаратурны турыстычны праект "Літаратурная карта майго рэгіёна".

Літаратура


1. Бельскі, А. І. Сучасная беларуская літаратура: станаўленне і развіццё творчых індывідуальнасцяў (80–90 гг.): вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў / А.І.Бельскі. – Мінск : Нар. асвета, 1997. – 254 с.
2. Васючэнка, П.В. Сучасная беларуская драматургія: дапам. Для настаўнікаў / П.В.Васючэнка. – Мінск : Мастац. літ., 2000. – 156 с.
3. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: У 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я.Купалы; Навук. рэд.: І.Я.Навуменка, В.А.Каваленка. – Мінск : Бел. навука, 1999–2015. – 4 т.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Гісторыя беларускай літаратуры, XIX – пачатак XX ст.: Падруч. для філал. спец. выш. пед. навуч. устаноў / І.Э.Багдановіч, У.В.Гніламёдаў, Л.С.Голубева і інш.; пад агул. рэд. М.А.Лазарука, А.А.Семяновіча. – Мінск : Выш. шк., 1998. – 559 с.
5. Гісторыя беларускай літаратуры: XX стагоддзе (20-50-я гг.): Падруч. для студэнтаў філал. спец. ВНУ / У.В.Гніламёдаў, В.В.Казлова, М.А.Лазарук і інш.; Пад агул. рэд. М.А.Лазарука, А.А.Семяновіча. – Мінск : Выш. шк., 2000. – 510 с.
6. Гісторыя беларускай літаратуры, XIX – пач. XX ст.: падручнік для філал. фак. пед. ін-таў БССР / Л. С. Голубева [і інш.]; пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – Мінск : Выш. школа, 1981. – 412 с.
7. Дасаева, Т.М. Беларуская літаратура XX – пачатку XXI стагоддзя : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях “Журналістыка міжнародная”, “Журналістыка (па напрамках)”, “Літаратурная работа (па напрамках)”, “Інфармацыя і камунікацыя”, “Беларуская філалогія” / Т.М. Дасаева. – Мінск: РІВШ, 2016. – 263 с.
8. Кісліцына, Г.М. Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы. Навуковае выданне. – Мінск: Логвінаў, 2006. – 415 с.
9. Музеі Беларусі: Інфарм. аб музеях сістэмы М-ва культуры Рэсп. Беларусь / Бел. ін-т праблем культуры, Бел. кам. Міжнар. савета музеяў "ICOM". – Мінск: Беларусь , 2001. – 271 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Заг. кафедры
беларускай і замежнай філалогіі

_______________А. М. Пісарэнка
«___»______________ 20__ г.

**ПЕРАЛІК ТЭАРЭТЫЧНЫХ ПЫТАННЯЎ**
для правядзення экзамену
па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская і сусветная літаратура: Беларуская літаратура»
для студэнтаў ФІДК (дзённая і завочная форма навучання)

1. Культура і літаратура старажывтнай Русі і яе выдатныя прадстаўнікі (Е. Полацкая, К. Тураўскі, П. Богша і інш.).
2. Агіяграфічная літаратура, яе віды і жанры. Характарыстыка арыгінальных агіяграфічных твораў (жыціё К.Тураўскага, Е.Полацкай).
3. “Слова пра паход Ігаравы” – унікальны літаратурны помнік, шэдэўр. прыгожага пісьменства. Беларускія матывы ў “Слове…”. Пераклады.
4. Гісторыя летапісання. “Аповесць мінулых гадоў” характарыстыка, беларуска-літоўскія летапісы як помнікі гісторыі беларускага народа, іх структура і змест. Мясцовыя летапісы (“Баркулабаўская хроніка”).
5. Ф.Скарына – заснавальнік беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання (узор паліграфіі, змест прадмоў і пасляслоўяў да кніг).
6. Скарынінскія традыцыі ў асветніцкай дзейнасці паслядоўнікаў (С. Буднага, Л. і. С. Зізаніяў, В. Цяпінскага).
7. Творчы шлях М. Гусоўскага. “Песня пра зубра”: гісторыя стварэння паэмы, рэальнасць і вымысел ў ёй. Рэнесансавыя ідэі ў творы.
8. Палемічная, публіцыстычная літаратура:умовы ўзнікнення, асноўныя жанры (“Трэнас” М. Сматрыцкага, “Дыярыуш” А. Філіповіча і інш.).
9. Старабеларуская паэзія 16-17 стст., яе віды і жанры.
10. С.Полацкі і яго роля ва ўзбагачэнні паэтыкі і жанрава-стылістычных форм беларускай паэзіі.
11. Ідэйна-мастацкі змест сатырычна-парадыйных твораў (“Прамова Мялешкі”, “Ліст да Абуховіча”).
12. “Школьная” літаратура, драматургія, тэатр. Аналіз “Камедыі” К.Марашэўскага.
13. Інтэрмедыі і іх змест. Беларуская батлейка.
14. Прыдворныя тэатры на Беларусі. Нясвіжскі тэатр і творчасць Ф.У.Радзівіл. Агляд твораў на выбар.
15. Арыгінальнасць і нацыянальны каларыт твораў “Энеіда навыварат” і “Тарас на Парнасе”.
16. Рамантызм і яго выяўленне ў творчасці прадстаўнікоў філамацка-філарэцкага руху. Праблематыка балад (Я. Чачот, Я. Баршчэўскі, А. Міцкевіч).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

17. Характар мастацкага рамантызму ў творчасці Я.Баршчэўскага (“Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” і інш.).
18. Жыццёвы і творчы лёс А.Міцкевіча. Ідэйна-мастацкі змест балад, паэм “Гражына”, “Конрад Валенрод”, “Пан Тадэвуш” (на выбар).
19. Асоба В. І.Дуніна-Марцінкевіча. Рамантычна-этнаграфічны этап у творчасці пісьменніка (“Купала”, “Вечарніцы”, “Шчароўскія дажынкі”, “Гапон”, інш. 2-3 на выбар).
20. В.І.Дунін-Марцінкевіч і станаўленне беларускага прафесійнага тэатра. Аналіз драматычных твораў (“Ідылія”, “Пінская шляхта”, “Залёты” - на выбар).
21. Беларуска-польскія пісьменнікі і іх творчасць (У.Сыракомля, В.Каратынскі і інш.).
22. Літаратурна-публіцыстычная спадчына К.Каліноўскага (газета “Мужыцкая праўда”, “Марыська, чарнаброва галубка мая…”, “Ліст з-пад шыбеніцы”).
23. Зараджэнне рэалістычнай плыні ў беларускай літаратуры XIX ст. Ф. Багушэвіч як заснавальнік крытычнага рэалізму. Тэмы, праблематыка яго вершаў.
24. Публіцыстыка Ф.Багушэвіча і яго творчыя спробы ў прозе. Ідэйны змест прадмоў да паэтычных зборнікаў.
25. Асаблівасці літаратурных працэсу канца XIX - пачатку XX ст. Газета “Наша ніва” і яе роля ў гісторыі беларускай літаратуры.
26. Асоба Цёткі. Прыход у літаратуру. Асаблівасці яе творчай манеры. Кнігі для дзяцей.
27. Творчасць М.Багдановіча ў рэчышчы нацыянальнага адраджэння і ў еўрапейскім кантэксце. Аналіз зб. “Вянок”. Музычныя формы вершаў. Наватарства аўтара.
28. Асоба Янкі Купалы. Агляд зб. паэзіі “Жалейка”, “Гусляр”, “Шляхам жыцця”, “Спадчына”.
29. Паэмы Янкі Купалы: змест, праблематыка, жанрава-стылявыя асаблівасці.
30. Якуб Колас – паэт. Мастацкая карціна жыцця беларуса ў вершах і апавяданнях нашаніўскага перыяду. Аналіз зборніка
31. Філасофія і псіхалогія “Казак жыцця”. Якуб Коласа.
32. Ідэя адраджэння Беларусі і яе рэалізацыя ў паэме Якуба Коласа “Новая зямля”.
33. Тэма мастака і мастацтва ў паэме Якуба Коласа “Сымон-музыка”.
34. Роля Янкі Купалы ў развіцці нацыянальнага рэпертуару. Мастацкі аналіз трагікамедыі “Тутэйшыя”.
35. Мастацкая разнастайнасць “малой” прозы Ядвігіна Ш. (Апавяданні “З бальнічнага ліста”,“Заморскі звер” і інш. – 2-3 на выбар).
36. Лірыка А.Гаруна (зб. “Матчын дар”). Тэмы, праблемы, ідэйна-мастацкі змест прозы (“Першы снег” і інш.).
37. Псіхалагізм твораў К.Чорнага і іх гуманістычнае гучанне (на прыкладзе апавяданняў “Буланы”, “На пероне”, “Макаркавых Волька”, “Справа Віктара Лукашэвіча” і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

38. К.Крапіва – паэт і байкапісец. Тэматычны дыяпазон вершаваных твораў, мастацкія сродкі сатыры.
39. К.Крапіва – драматург. Сатырычны тыпаж камедый, актуальнасць гучання яго твораў (“Хто смяецца апошнім”, “Брама неўмяручасці” і інш.).
40. Заходнебеларуская літаратура: прадстаўнікі, жанры, творы (У. Жылка, М. Танк, Ф. Аляхновіч).
41. Вобраз новага чалавека ў апавяданнях М. Зарэцкага “Дзіўная”, “Кветка пажоўклая”, аповесці “Голы звер”.
42. Асоба М. Гарэцкага. Жыццёвы і творчы шлях.
43. Праблема інтэлігенцыі і народа ў творах М. Гарэцкага.
44. Творчасць З. Бядулі. Эстэтыка мадэрнізму у яго творах.
45. Беларуская савецкая паэзія 20-40-х гг. Літаратурныя арганізацыі і іх дзейнасць.
46. Трагічнасць жыццёвага лёсу У. Дубоўкі. Філасофска-эстэтычны змест яго паэзіі.
47. Імажынізм у ранняй лірыцы Я. Пушчы. Праблематыка вершаванага цыкла “Лісты да сабакі”, паэмы “Цень консула”.
48. Псіхалагізм і інтэлектуалізм у беларускай прозе пачатку XX ст. (паводле твораў М. Гарэцкага, К. Чорнага, М. Зарэцкага – на выбар).
49. Сатырычная плынь у савецкай беларускай літаратуры. Ідэйна-мастацкі змест рамана А. Мрыя “Запіскі Самсона Самасуя”.
50. Літаратурныя пошукі ў беларускай прозе 30-40-х гадоў.

Выкладчык
_______________В. С. Варапаева
(подпіс)

Разгледжана на пасяджэнні кафедры
беларускай і замежнай філалогіі
пратакол № ___ ад «__» кастрычніка 20___ г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Заг. кафедры
беларускай і замежнай філалогіі
__________А. М. Пісарэнка
“ ” _______________ 20__ г.

# ПЕРАЛІК ТЭАРЭТЫЧНЫХ ПЫТАННЯЎ

для правядзення заліку
па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская літаратура”
для студэнтаў ФІДК (дзённая і завочная форма навучання)

1. Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны (на прыкладзе твораў К. Чорнага, А. Куляшова, П. Панчанкі і інш.).
2. Філасофскія аспекты паэзіі А.Куляшова. Праблема творчай асобы ў паэме “Варшаўскі шлях”.
3. Матывы і тэмы паэзіі Максіма Танка (80-90г.г. “Мой каўчэг”, “Errata ”). Паэтыка танкаўскага верлібра.
4. Творчая індывідуальнасць Пімена Панчанкі. Адметнасць вобразна-выяўленчых сродкаў яго паэзіі.
5. Творчасць У. Караткевіча. Нацыянальнае і агульначалавечае ў яго творах
6. Традыцыі У. Караткевіча ў сучаснай беларускай літаратуры (творы У.Арлова, В.Іпатавай, К.Тарасава, Л.Рублеўскай – на выбар).
7. Жыццёвы і творчы лёс Васіля Быкава. “Быкаўская праўда” вайны (“Мёртвым не баліць”, “Жураўліны крык” – творы на выбар студэнта).
8. В.Быкаў і экзістэнцыялізм. Аналіз аповесцяў “Ваўчыная яма”, “Труба”, 2-3 апавяданняў са зб. “Пахаджане” ці “Сцяна”.
9. Беларуская літаратура пра сталінскія рэпрэсіі (Я.Брыль “Муштук і папка”, Ф.Аляхновіч “У кіпцюрах ГПУ”, С.Грахоўскі “Зона маўчання“ і інш.) (аўтар і творы на выбар студэнта).
10. Праблематыка твораў І.Шамякіна 80-90г.г. XX ст. (”Палеская мадонна”, “Сатанінскі тур”, “Без пакаяння” і інш.) на выбар.
11. Своеасаблівасць мастацкага свету Янкі Брыля. Спалучэнне падзейнасці і эмацыянальнай насычанасці, тонкі псіхалагізм, лірызм.
12. Творчасць В.Казько. Вобраз творчай інтэлігенцыі і праблема лёсу нацыянальнай культуры ў аповесці “Да сустрэчы”.
13. Праблема захавання культуры і духоўнасці ў “вясковай” прозе (А.Жук “Паляванне на апошняга жураўля”, А. Федарэнка “Вёска”).
14. Мастацкі роздум над праблемай атамнай вайны ў прозе канца XX-пач. XXI ст.ст. (А.Адамовіч “Апошняя пастараль”).
15. Трагедыя Чарнобыля і яе ўвасабленне ў беларускай літаратуры (творы С.Алексіевіч, В.Быкава, С.Законнікава, А.Федарэнкі – на выбар ).
16. Творчая асоба Ніла Гілевіча. Народна-песенныя матывы, грамадзянска-публіцыстычны змест лірыкі паэта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

17. Беларуская паэзія “шасцідзесятнікаў” і яе духоўна-творчае абнаўленне (А.Вярцінскі, Г.Бураўкін, Я.Сіпакоў, В.Зуёнак – аўтар і твор на выбар)
18. Беларуская паэзія 70-х – 80-х г.г. (А.Разанаў, Я.Янішчыц, С.Законнікаў, Р.Баравікова і інш.). Вершы розных аўтараў на выбар.
19. Агляд сучаснай беларускай паэзіі А.Пісьмянкоў, А.Сыс, Л.Дранько-Майсюк, Э.Акулін, А.Разанаў і інш. Музычна-песенныя матывы ў іх творчасці.
20. Асоба Рыгора Барадуліна. Хрысціянскія матывы ў яго творчасці (зб. “Евангелле ад мамы”, “Ксты”) Спецыфічнасць барадулінскага верша.
21. Агляд беларускай сучаснай прозы (А.Федарэнка “Вёска”, “Бляха”, В.Гігевіч “Карабель”, С.Балахонаў “Імя грушы”, А.Глобус, В. Марціновіч і інш.) Тэмы , праблемы, майстэрства аўтараў.
22. Беларуская драматургія: традыцыі і наватарства (А.Дудараў, С.Кавалёў, А.Петрашкевіч, і інш.).
23. Мастацкае асэнсаванне жыцця сучаснага грамадства Ю.Станкевічам (раман “Любіць ноч – права пацукоў”).
24. Сучасная “жаночая літаратура” (Р.Баравікова, А.Брава, Н.Батракова, Л.Рублеўская і інш.)
25. Творчасць С. Алексіевіч.
26. Прыгодніцка-дэтэктыўная і фантастычная проза (Л. Рублеўская, Р. Баравікова, А. Казлоў і інш.).
27. Творчасць Л. Рублеўскай. Тэматыка, праблематыка яе прозы. Экранізацыя.
28. Беларуская гісторыя ў творчасці У. Арлова, В. Іпатавай (У. Арлоў “Час чумы”, В. Іпатава “Альгердава дзіда”, “Залатая жрыца Ашвінаў”).
29. Антыўтопія, фэнтазі ў беларускай літаратуры (на прыкладзе твораў А. Адамовіча, В. Марціновіча, Ю. Станкевіча).
30. Песенныя традыцыі ў творчасці Р. Барадуліна, Г. Бураўкіна, Н. Гілевіча і інш.

Выкладчык
_______________В. С. Варапаева
(подпіс)

Разгледжана на пасяджэнні кафедры
беларускай і замежнай філалогіі
пратакол №   ад «   » ____________ 20__ г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ**
**да экзамену**
па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская і сусветная літаратура”
для студэнтаў ФХК, ФМіХМ, ФКіСКД
(дзённая і завочная форма навучання)

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Заг.кафедры
беларускай філалогіі
і сусветнай літаратуры

_____________А.М.Пісарэнка
«___»______________ 20__ г.

1. Старажытная літаратура: агульная характарыстыка. Мастацкі феномен “Слова пра паход Ігаравы”.
2. Жанравая спецыфіка старажытнай літаратуры. Мастацкія асаблівасці “Жыція Ефрасінні Полацкай”, слоў і прытчаў Кірылы Тураўскага (на выбар).
3. Літаратура эпохі Адраджэння і дзейнасць Францыска Скарыны. Гісторыка-культурнае значэнне прадмоў і пасляслоўяў Скарыны.
4. Творчасць Міколы Гусоўскага. “Песня пра зубра” як твор рэнесанснай літаратуры.
5. Барока і Асветніцтва на Беларусі. Творчасць Каятана Марашэўскага.
6. Творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча. Фарс-вадэвіль “Пінская шляхта”: змест і праблематыка твора.
7. Рамантызм у беларускай літаратуры ХІХ ст. Адлюстраванне гісторыі ў творчасці А. Міцкевіча.
8. Фальклорныя матывы і праблематыка творчасці Я.Баршчэўскага.
9. Рэалістычныя тэндэнцыі ў літаратуры ХІХ ст. Тэмы і матывы творчасці Ф.Багушэвіча.
10. Асаблівасці літаратурнага працэсу на пачатку ХХ ст. Беларуская літаратура “нашаніўскага” перыяду ў агульнаеўрапейскім культурным кантэксце (аўтары – на выбар).
11. Творчасць М. Багдановіча: асаблівасці паэтычных вобразаў і праблематыка.
12. Тэмы, матывы і сімволіка паэзіі Янкі Купалы (паводле вершаў розных гадоў).
13. Праблема культуры мыслення ў п’есе “Тутэйшыя” Янкі Купалы.
14. Гратэскава-камічны свет рамана А. Мрыя “Запіскі Самсона Самасуя”.
15. Гуманістычная скіраванасць прозы М. Зарэцкага.
16. Псіхалагізм і інтэлектуалізм у прозе М. Гарэцкага.
17. Творчы феномен Змітрака Бядулі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

18. Агульная характарыстыка літаратурнага працэсу ў 20-30-я гады XX стагоддзя. Літаратурныя а’яднанні “Маладняк”, “Узвышша”, “Полымя” і іх найбольш значныя прадстаўнікі (аўтары – на выбар).
19. Творчасць Якуба Коласа. Нацыянальны свет беларуса ў паэме “Новая зямля”.
20. Філасофскі змест і паэтыка “Казак жыцця” Якуба Коласа (1 казка на выбар).
21. Адметнасць прозы Кузьмы Чорнага. Псіхалагізм у творчасці пісьменніка.
22. Жанравае і тэматычнае наватарства драматургіі А.Макаёнка.
23. Тэма і праблема вайны ў творчасці Васіля Быкава.
24. В.Быкаў і экзістэнцыялізм. Аналіз твораў “Аблава”, “Сцяна”, “Кошка і мышка” і інш. (1 твор на выбар).
25. Своеасаблівасць мастацкага свету Янкі Брыля. Аўтабіяграфізм у творчасці пісьменніка.
26. Творчасць І.Шамякіна і сацрэалізм. Праблематыка твораў 80–90-х гг.
27. Беларуская літаратура пра падзеі канца 20-х – 30-х гадоў (на прыкладзе твораў Я.Брыля, С.Грахоўскага інш.).
28. Асаблівасці адлюстравання беларускай гісторыі ў творчасці Уладзіміра Караткевіча.
29. Паэтычная творчасць Максіма Танка. Матывы і тэмы лірыкі (на прыкладзе 3-4 твораў – на выбар).
30. Філасофскія аспекты паэзіі А.Куляшова. Праблема творчай асобы ў паэме “Варшаўскі шлях”.
31. Творчая індывідуальнасць Пімена Панчанкі. Адметнасць вобразна-выяўленчых сродкаў яго паэзіі.
32. Духоўна-творчае абнаўленне паэзіі Н.Гілевіча, Р.Барадуліна, А.Вярцінскага, В.Зуёнка (на выбар).
33. Тэма вёскі і праблема захавання традыцыйнай народнай культуры ў творах А. Жука, В. Казько (на выбар).
34. Чарнобыльская катастрофа і яе наступствы ў творчасці беларускіх пісьменнікаў.
35. Прыгодніцка-дэтэктыўная і фантастычная проза Л.Рублеўскай.
36. Антываенная скіраванасць прозы А. Адамовіча.
37. Пошукі новых жанравых форм у беларускай паэзіі канца XX стагоддзя. Творчасць А. Разанава, Я.Янішчыц, С.Законнікава і інш. – вершы розных аўтараў на выбар).
38. Агляд сучаснай беларускай паэзіі (Л.Дранько-Майсюк, А.Сыс, А. Глобус, В. Жыбуль і інш.).
39. Літаратурная суполка “Тутэйшыя”. Постаці і кнігі: творы А. Сыса, А. Глобуса, і інш. (на выбар).
40. Жанр антыутопіі ў беларускай літаратуры. Творчасць В. Гігевіча.
41. Мастацкае асэнсаванне жыцця сучаснага грамадства Ю.Станкевічам (раман “Любіць ноч – права пацукоў”).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

42. Асаблівасці развіцця літаратуры на сучасным этапе. Творчыя эксперыменты і літаратура постмадэрнізму (творы – на выбар).
43. Постмадэрнізм у творчасці беларускіх пісьменнікаў. Філасофскі погляд на жыццё ў творчасці А. Горвата.
44. Беларуская драматургія: традыцыі і сучаснасць (К. Крапіва, А.Дудараў, С.Кавалёў ці інш. – аўтар на выбар).

Выкладчык
_______________ С.М.Тычына
(подпіс)

Разгледжана на пасяджэнні кафедры
беларускай філалогіі
і сусветнай літаратуры
(пратакол № ____ ад «___»_________ 20__ г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

| Балы | Крытэрыі ацэнкі |
|---|---|
| 1 (адзін), не залічана | Адсутнасць ведаў і кампетэнцый у рамках вучэбнага курса; адмаўленне ад адказу |
| 2 (два), не залічана | Фрагментарныя веды ў межах вучэбнага курса; наяўнасць у адказе грубых, лагічных памылак |
| 3 (тры), не залічана | Недастаткова поўны аб'ём ведаў у межах вучэбнага курса; фрагментарны пераказ тэксту; няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію і арыентавацца ў тэорыі літаратурнага працэсу |
| 4 (чатыры), залічана | Валоданне зместам твора пераважна на ўзроўні пераказу, адсутнасць канцэптуальнага ўспрымання літаратурнага працэсу; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі |
| 5 (пяць), залічана | Дастатковы ўзровень ведаў у рамках вучэбнай праграмы; эмацыянальнае асэнсаванне тэксту са спробай ацаніць характары і сітуацыі; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; лагічны адказ і здольнасць рабіць высновы; засваенне асноўнай літаратуры |
| 6 (шэсць), залічана | Дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; раскрыццё зместу літаратурнага твора праз выяўленне праблематыкі, вобразнай сістэмы; спроба раскрыць аўтарскія адносіны да герояў і падзей пры адсутнасці аналітычнага падыходу; лагічны адказ і здольнасць рабіць высновы; засваенне асноўнай літаратуры |
| 7 (сем), залічана | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; добрае валоданне тэкстам, уменне аналізаваць твор на ідэйна-кампазіцыйным узроўні; здольнасць рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; лагічны і разгорнуты адказ; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры |
| 8 (восем), залічана | Сістэматызаваныя, грунтоўныя і трывалыя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; свабоднае валоданне навуковай тэрміналогіяй і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; разуменне і раскрыццё шматузроўневасці мастацкага твора; выкарыстанне цытат; самастойнасць высноў; валоданне метадамі комплекснага аналізу; адказ на дадатковыя пытанні; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры |
| 9 (дзевяць), | Сістэматызаваныя, грунтоўныя і трывалыя веды па ўсіх |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| залічана | раздзелах вучэбнай праграмы; свабоднае валоданне навуковай тэрміналогіяй і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; уменне аналізаваць твор у адзінстве зместу і формы; прадуманы, лагічны, разгорнуты, абгрунтаваны адказ, які не патрабуе дадатковых пытанняў; поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры |
| 10 (дзесяць), залічана | Сістэматызаваныя, грунтоўныя і трывалыя веды па ўсіх раздзелах праграмы; свабоднае валоданне навуковай тэрміналогіяй і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; уменне даваць тыпалагічны аналіз, рабіць арыгінальныя высновы; выяўленне аўтарскай канцэпцыі жыцця і асобы; творчая інтэрпрэтацыя тэксту; поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# V. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар
па вучэбнай рабоце

_______________ С. Л. Шпарло

“____” _________________ 2022 г.

Рэгістрацыйны № ВД _____ / вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**БЕЛАРУСКАЯ І СУСВЕТНАЯ ЛІТАРАТУРА**
**РАЗДЗЕЛ І. БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА**

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для ўсіх спецыяльнасцей універсітэта*

2022

Вучэбная праграма складзена на аснове тыпавых вучэбных планаў установы вышэйшай адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*Г. М. Друк,* дацэнт кафедры беларускай і замежнай філалогіі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ**:

*Н. В. Кузьміч,* дацэнт кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

*М. А. Яцэвіч,* дацэнт кафедры інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай беларускай і замежнай філалогіі (пратакол № 10 ад 24.05.2021 г.);

Навукова-метадычным саветам ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № ад г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Беларуская і сусветная літаратура» складаецца з двух раздзелаў: «Беларуская літаратура» і «Сусветная літаратура». Дадзеная праграма распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйных стандартаў і прызначана для вывучэння раздзела «Беларуская літаратура».

Вучэбная дысцыпліна дапамагае рэалізоўваць галоўную мэту адукацыйна-выхаваўчага працэсу – фарміраванне інтэлектуальна і эстэтычна развітай, культурнай асобы. Пры вывучэнні названай вучэбнай дысцыпліны студэнты атрымліваюць звесткі пра асаблівасці і грамадскае прызначэнне мстацкай літаратуры, якія неабходны ім для паспяховага ўспрымання і асэнсавання жыццёвых з’яў, ролі і месца чалавека ў соцыуме, для фарміравання пэўных прафесійных навыкаў.

Вучэбная дысцыпліна “Беларуская літаратура” цесна звязана з такімі дысцыплінамі, як “Гісторыя”, “Гісторыя мастацтваў”, “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” і інш. У працэсе вывучэння беларускай літаратуры на канкрэтных прыкладах можна спазнаць і засвоіць вытокі і асновы, этапы станаўлення і асаблівасці развіцця беларускай літаратуры і культуры. Дапамагаючы глыбей пазнаваць жыццё, літаратура адначасова спрыяе духоўнаму развіццю і самасцвярджэнню чалавека як асобы, здольнай творча рэалізоўваць сябе ў жыцці.

*Мэтай* выкладання вучэбнай дысцыпліны “Беларуская літаратура” з’яўляецца ўключэнне студэнта пры дапамозе літаратурыў сучасную інфармацыйна-культурную прастору, бесперапынны працэс адукацыі і духоўнага самаўдасканалення, рразвіццё патрэбнасці ў пастаянным знаёмстве з творамі нацыянальнай і сусветнай культуры. Выкладанне вучэбнай дысцыпліны павінна забяспечыць фарміраванне кампетэнцыі “Аналізаваць літаратурныя творы, арыентавацца ў сусветным і айчынным літаратурных працэсах і супастаўляць іх з парадыгмай развіцця іншых відаў мастацтва”. Таму *задачамі* выкладання з’яўляюцца:

– фарміраванне сістэмы літаратурных (тэарэтыка-літаратурных і гісторыка-літаратурных) ведаў як кампанента гуманітарнага светаадчування і мыслення;
- развіццё моўнай культуры студэнтаў – найпершай умовы для ўступлення ў сацыякультурны дыялог;
- выпрацоўка навыкаў прафесійнага аналізу мастацкіх з’яў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць*:
- спецыфіку мастацкай літаратуры як формы спасціжэння свету;
- сувязі літаратуры з іншымі відамі мастацтва, іх узаемаўплывы;
- творчасць яркіх прадстаўнікоў кожнай з мастацкіх эпох;

*умець*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– характарызаваць літаратурную эпоху і асноўныя этапы яе развіцця, літаратурныя напрамкі;

– вызначаць спецыфіку нацыянальнага літаратурнага працэсу;

– самастойна аналізаваць мастацкі твор і творчасць пісьменніка;

– выкарыстоўваць набытыя веды ў прафесійнай практыцы;

*валодаць:*

– асноўнымі паняццямі і катэгорыямі мастацкай інтэрпрэтацыі твора;

– навыкамі параўнальнага аналізу літаратурна-мастацкіх з’яў;

– здольнасцю ацэньваць культурна-гістарычную сітуацыю на сучасным этапе.

У адпаведнасці з вучэбнымі планамі на вывучэнне раздзела “Беларуская літаратура” для спецыяльнасцей ФІДК прадугледжана 220 гадзін, з якіх 116 гадзін – аудыторныя заняткі (64 г. – лекцыі, 52 г. – семінары). Рэкамендуемыя формы кантролю ведаў студэнтаў – залік, экзамен. Для спецыяльнасцей ФКіСКД, ФМіХМ, ФМК усяго прадугледжана 90 гадзін, з якіх 42 г. – аудыторныя заняткі (20 г. – лекцыі, 12 г. – семінары), 10 г. КСР. Рэкамендуемая форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *УВОДЗІНЫ*

Змест і задачы вывучэння курса, сувязь дысцыпліны з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі. Асноўная і дадатковая літаратура па вучэбнай дысцыпліне. Віды заняткаў і формы кантролю. Патрабаванні да засваення дысцыпліны, крытэрыі ацэнкі вучэбнай дзейнасці.

Агульнае паняцце пра літаратурны працэс. Гісторыя развіцця нацыянальнай літаратуры як часткі сусветнага літаратурнага працэсу, іх узаемадзеянне і ўзаемаўзбагачэнне. Асноўныя стадыі развіцця.

## *РАЗДЗЕЛ 1. СТАРАЖЫТНАЯ ЛІТАРАТУРА*

### *ТЭМА 1. ЛІТАРАТУРА XI – XVI СТСТ.*

Літаратура ранняга Сярэднявечча (XI – XIII стст. Спецыфічныя рысы старажытнай беларускай літаратуры і культуры. Перакладная літаратура (Біблія, патрыстыка, апокрыфы, хронікі, інш.). Арыгінальная літаратура. Урачыстае красамоўства. Творчасць Кірылы Тураўскага (каноны, словы, прытчы, інш.). Жыційная літаратура, паняцце агіяграфічнага канону ("Жыціе Еўфрасінні Полацкай" і інш.). Патэрыкі. Хаджэнні. Першапачатковае летапісанне. "Аповесць мінулых гадоў". Гісторыя ўзнікнення "Слова пра паход Ігаравы", яго ідэйны змест, беларускія матывы ў творы.

Літаратура позняга Сярэднявечча (сярэдзіна XIII – пач. XVI стст.). Жанр летапісу. Беларуска-літоўскае летапісанне. Сярэднявечны рыцарскі раман і яго ўплыў на старажытную беларускую літаратуру.

### *ТЭМА 2. ЛІТАРАТУРА АДРАДЖЭННЯ І РЭФАРМАЦЫІ*

Эпоха Адраджэння як культурна-гістарычная з'ява ў еўрапейскіх краінах, паняцце рэнесансавага гуманізму. Асаблівасці беларускага Адраджэння (сінтэз розных культурных плыняў, развіццё эпасу і публіцыстыкі, росквіт навалацінскага мастацтва, інш.).

*Францыск Скарына* (каля 1480 – каля 1551). Старонкі жыцця. Выдавецкая і літаратурная дзейнасць. Прадмовы і пасляслоўі. Гісторыка-культурнае значэнне постаці Ф.Скарыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паэзія эпохі Адраджэння: новалацінская (*Я.Вісліцкі* "Пруская вайна", інш.), польскамоўная (*Ц.Базылік, М.Стрыйкоўскі, інш.*), беларускамоўная (творы *А.Рымшы*). Адметнасць жанраў (эпіграма, лямант, інш.). *Мікола Гусоўскі* (1480(?) – пасля 1533). Сучасная навука пра жыццё і творчасць пісьменніка. "Песня пра зубра": гісторыя стварэння, творчая задача і звышзадача, сістэма мастацкіх вобразаў, праблематыка, гуманістычны роздум паэта пра лёс хрысціянскай Еўропы.

Рэфармацыйная публіцыстыка, яе віды і жанры ("Катэхізіс" *С.Буднага*, "Прадмова" да Евангелля *В.Цяпінскага* як праграма духоўнага адраджэння, пасланні і лісты *Л.Сапегі*, інш.). Змест палемічнай літаратуры пазнейшага часу ("Трэнас" *М.Сматрыцкага*, інш.).

*ТЭМА 3. ЛІТАРАТУРА XVII – XVIII СТСТ.*

Культурна-гістарычная і палітычная сітуацыя на беларускіх землях у XVII ст. Класіцызм і барока – вызначальныя стылі эпохі Асветніцтва. Сутнасць і асноўныя рысы стылю (павышаная эмацыянальнасць, ускладненая метафарычнасць, кантраст, інш.). Асновы асветніцкай філасофіі.

Паэзія. *С.Полацкі* (1629–1680). Беларускі і маскоўскі перыяды жыцця. Асветніцка-культурная дзейнасць. Жанрава-тэматычная разнастайнасць вершаў, эксперыменты з вершаванай формай. Станаўленне лірычных жанраў (вершы *Ф.У.Радзівіл*). Паэзія аўтараў XVIII ст. – *А.Нарушэвіча, Ю.Нямцэвіча, Ф.Карпінскага, М.Карыцкага і інш.*

Развіццё прозы. Гістарычна-мемуарная літаратура ("Баркулабаўская хроніка","Успаміны" *Ф.Еўлашоўскага* і *Я.Цадроўскага*, "Дыярыуш" *А.Філіповіча*, інш.); парадыйна-сатырычная ("Прамова Мялешкі", "Ліст да Абуховіча", "Казанне рускае", "Торба смеху", інш.). Спроба першага прыгодніцкага рамана (*С.Пільштынова-Русецкая* "Авантуры майго жыцця": гісторыя і геаграфія падарожжа, авантурны тып героя-апавядальніка, інтрыга і займальнасць сюжэту, экзотыка чужога быту).

Драматургія. Батлейка. Інтэрмедыя як жанр, асаблівасці зместу і вобразнай сістэмы ("Селянін і студэнт", "Селянін у касцёле", інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Школьная драматургія (*М.Цяцерскі* "Доктар па прымусу"; *К.Марашэўскі* "Камедыя"). Прыдворны тэатр (драматургія *У.Ф.Радзівіл*).

### *ЛІТАРАТУРА XIX СТ.*

### *ТЭМА 4. АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ЛІТАРАТУРЫ XIX СТ.*

Літаратура XIX ст. як новы этап у гісторыі беларускага пісьменства. Польскамоўна-беларуская літаратура. Праблема мастацкага метаду. Эвалюцыя вобраза героя. Перыядызацыя. Асноўныя тэндэнцыі літаратурнага развіцця: этнаграфічна-фальклорная, бурлескна-травесційная, публіцыстычная. Ананімная літаратура, яе змест і значэнне.

Пісьменнікі-пачынальнікі новай беларускай літаратуры. Філаматы і філарэты, іх ідэйна-эстэтычная праграма. Рамантызм і яго выяўленне ў творах *Я.Чачота*, *Т.Зана* і інш. (паэтызацыя гераічнага мінулага, фальклорны каларыт, інш.). Зварот да мінулага роднай зямлі, вобраз героя ў баладах і паэмах *А.Міцкевіча* ("Свіцязь", "Гражына", "Пан Тадэвуш", "Конрад Валенрод").

### *ТЭМА 5. ЭСТЭТЫЧНАЯ ЭВАЛЮЦЫЯ ЛІТАРАТУРЫ XIX СТ.*

*Ян Баршчэўскі (1792/94) – 1851).* Вершы на беларускай мове. Вобраз Беларусі і беларуса ў кнізе "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях". Спецыфіка рамантызму кнігі. Асоба і творчасць Я.Баршчэўскага ў сучаснай крытыцы.

*Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч (1807–1884).* Жыццё і творчасць. Рамантычна-этнаграфічны этап ("Вечарніцы", "Купала", "Гапон", інш.). Сентыменталізм і яго праявы ў "Ідыліі" ("Сялянцы"). Фарс-вадэвіль "Пінская шляхта": аб'ект сатыры, сістэма вобразаў, праблематыка, жыццёвасць п'есы.

*У. Сыракомля* (1823–1862). Эстэтычныя погляды. Жыццё народа ў жанры гавэнды ("Паштальён", "Хадыка", "Ілюмінацыя"). Пераклады і апрацоўкі народных песень, навукова-мастацкія працы ("Вандроўкі па маіх былых ваколіцах" і інш.).

*В.Каратынскі* (1831–1891). Паказ прыгонніцкай рэчаіснасці ў зб. "Чым хата багата, тым рада", паэме "Таміла".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*К.Каліноўскі* (1838–1864). Праблематыка публіцыстычных твораў ("Мужыцкая праўда", "Ліст з-пад шыбеніцы"), запавет аўтара ў вершы "Марыська чарнаброва, галубка мая…"

*Францішак Багушэвіч (1840–1900).* Біяграфія. Зб."Дудка беларуская", "Смык беларускі". Змест прадмоў. Тэмы і матывы паэзіі (сацыяльны пратэст, выкрыццё царскага суда, інш. – "Бог не роўна дзеле", "У астрозе", "Быў у чыстцы", "Хрэсьбіны Мацюка", "Кепска будзе", інш.). Жанр балады, байкі, апавядання. Крытычны рэалізм. Значэнне творчасці.

Творчасць *А.Абуховіча* (байкі "Ваўкалак", "Суд"), *А.Гурыновіча* ("Перш душылі паны…"), *Я.Лучыны* (верш "Роднай старонцы", паэма "Паляўнічыя акварэлькі з Палесся": паказ жыцця і псіхалогіі беларуса ў творы).

## *ЛІТАРАТУРА XX СТАГОДДЗЯ*

### *ТЭМА 6. "НАШАНІЎСКІ" ПЕРЫЯД*

Нацыянальнае адраджэнне як культурна-грамадскі і літаратурны рух пач. XX ст. "Наша доля" і "Наша ніва". Развіццё лірычнай паэзіі, прозы, крытыкі і публіцыстыкі, перакладу, зараджэнне нацыянальнага ліра-эпасу. Арганізацыя тэатральных калектываў *(І.Буйніцкі, Ф.Ждановіч, У. Галубок, К.Каганец).* Мадэрнізм і яго філасофска-эстэтычная сутнасць.

*Ядвігін Ш.* (Антон Лявіцкі, 1869–1922). Мастацкая разнастайнасць "малой" прозы (алегорыя, сацыяльна-бытавое, філасофскае апавяданні, верш у прозе, інш.). Раман "Золата".

*Цётка* (Алаіза Пашкевіч, 1876–1916). Рэвалюцыйна-адраджэнскія матывы, вобраз жыцця і долі беларуса, эстэтычныя погляды ў зб. "Скрыпка беларуская" і "Хрэст на свабоду". Гуманістычная скіраванасць і псіхалагізм прозы ("Прысяга над крывавымі разорамі", "Асеннія лісты", "Зялёнка") і публіцыстыкі ("Шануйце роднае слова" і інш.).

*Змітрок Бядуля* (Самуіл Плаўнік, 1886–1941). Зб. "Абразкі" як прыклад імпрэсіянізму. Майстра навелы ("Юлька", "Малыя дрывасекі", "Велікодныя яйкі"). Роздум пра лёс нацыянальнага мастацтва ("Салавей").

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Алесь Гарун* (Аляксандр Прушынскі, 1887–1920). Нацыянальна-адраджэнскі і філасофска-гуманістычны пафас лірыкі (зб. “Матчын дар”). Ідэйна-мастацкі змест прозы (“Першы снег”, “Пан Шабуневіч”, інш.).

*Янка Купала* (Іван Луцэвіч, 1882–1942). Сацыяльна-філасофская, патрыятычная, інтымная, пейзажная лірыка Я.Купалы (зб. “Жалейка”, “Гусляр”, “Шляхам жыцця”, “Спадчына”). Паэмы 1906--1908 гг. (“Зімою”, “Адплата кахання”, “Нікому”, інш.) і 1911--1913 гг. (“Курган”, “Магіла льва”, “Яна і я”, інш.). Філасофія жыцця чалавека ў творах. Тэма Бацькаўшчыны (“На куццю”, “На Дзяды”, “Безназоўнае”). Драматычныя паэмы “Адвечная песня”, “Сон на кургане” і іх змест. Драматургія Я.Купалы (“Прымакі”, “Паўлінка”, “Раскіданае гняздо”) і яе сучаснае прачытанне. П’еса “Тутэйшыя”: сцэнічны лёс, сістэма вобразаў-персанажаў, адметнасць жанру, канцэпцыя “тутэйшасці”. Перакладчыцкая дзейнасць. Публіцыстыка 20-х гг. (“Адбудова Беларусі”, “Незалежнасць”, інш.). Вобраз Купалы і яго творчасць у розных відах мастацтва – музыцы, жывапісе, інш.

*Якуб Колас* (Канстанцін Міцкевіч, 1882–1956). Зб.“Песні жальбы”: сацыяльна-нацыянальная тэма (вобразы беларуса і Беларусі), асаблівасці пейзажнай лірыкі, цыкл вершаў з турмы. Паняцце “коласаўскай” прозы. Асаблівасці зместу і стылю ранніх апавяданняў. Зб.“Казкі жыцця”, яго маральна-этычная і філасофская накіраванасць, сувязь з гістарычным лёсам беларускага народа (“Што лепей?”, “Балотны агонь”, інш.). Праблематыка твораў 1920-х гг. (“Сяргей Карага”, “Крывавы вір”, “Дачакаўся”), іх навізна і актуальнасць, прыёмы псіхалагічнага раскрыцця вобразаў. Паэмы “Новая зямля” і “Сымон-музыка”, ідэйна-мастацкі змест твораў. Трылогія “На ростанях”.

*Вацлаў Ластоўскі* (1883–1938). Грамадска-палітычная, рэдактарска-выдавецкая дзейнасць, уклад у развіццё навукі (“Кароткая гісторыя Беларусі”, інш.). Ідэйна-творчыя ўстаноўкі (артыкулы “Па сваім шляху”, “Сплачвайце доўг”). Апавяданні, іх жанравая разнастайнасць (легенды, імпрэсіі, абразкі, інш.) і праблематыка; аповесць “Прыгоды Панаса і Тараса”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"Лабірынты": мнагаслойнасць вобразна-выяўленчай палітры, канцэпцыя гісторыі ў творы, рэальнае і фантастычнае ў сюжэце, сінтэз жанравых элементаў. Інтэлектуалізм і філасафічнасць як вызначальныя рысы творчасці.

*Максім Багдановіч* (1891–1917) як паэт-"кампазітар", феномен асобы. Зб."Вянок", яго змест і структура ("У зачараваным царстве", "Старая Беларусь", "Места", "Мадонны", інш.), першае і другое выданні. Пейзажная, інтымная, філасофская і грамадзянска-патрыятычная лірыка. Эстэтычныя погляды, праблема красы ("Музыка", "Апокрыф", "Песняру", "Псалтыр"). "Максім і Магдалена" і "Страцім-лебедзь": праблематыка, сістэма паэтычнай вобразнасці. Цвёрдыя формы верша ў паэзіі (санет, трыялет, рандо, інш.). М.Багдановіч як перакладчык, крытык і гісторык літаратуры. Праблематыка і жанравыя віды артыкулаў ("Забыты шлях", "Санет", "За тры гады", інш.). Вобраз пісьменніка ў літаратуры, музыцы, выяўленчым мастацтве.

### *ТЭМА 7. ЛІТАРАТУРА 1920-40-Х ГАДОЎ*

#### *Савецкая літаратура*

Творчыя аб'яднанні ("Маладняк", "Узвышша", "Полымя", інш.), іх дзейнасць. Авангардызм, яго асноўныя рысы (адмаўленне традыцыйнай культуры, стварэнне новага мастацтва, абнаўленне зместу і формы, інш.) і напрамкі. "Маладнякоўскае" апавяданне і яго спецыфіка. Тэорыя бесканфліктнасці. Паняцце сацрэалізму. Тэматыка, жанрава-стылёвыя пошукі, праблема новага героя ў беларускай прозе ("Спалох на загонах" П.Галавача, "Ні госць, ні гаспадар" Л.Калюгі, "Андрэй Лятун" М.Лынькова, інш.). Жанравае станаўленне беларускай аповесці і рамана.

"Маладняк" і "Узвышша": творчыя постаці. *М.Чарот* (Кудзелька, 1896–1937) як паэт авангарду. Матывы лірыкі (рэвалюцыя, заклік да працы, інш.), адметная вобразнасць. Драматызм аўтарскіх адчуванняў ("З сучасных настрояў", Босыя на вогнішчы", "Карчма", інш.). *Уладзімір Дубоўка* (1900–1976). Зб. "Строма", "Credo", "Наля". Нацыянальна-адраджэнскія матывы, тэма красы, асацыятыўная вобразнасць, метафарычнасць стылю. Творчыя пошукі ў жанры паэмы ("Кругі", "І пурпуровых ветразей узвівы",

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"Штурмуйце будучыні аванпосты"). *Язэп Пушча* (Іосіф Плашчынскі, 1902–1964). Зб. "Раніца рыкае". Праявы імажынізму. Ідэйна-мастацкі змест вершаванага цыкла "Лісты да сабакі", паэм "Цень Консула", "Сады вятроў". Агляд творчасці расстраляных паэтаў *(Т.Кляшторнага, В.Маракова, А.Дудара, Ю.Таўбіна, І.Харыка, інш.)*.

Інтэлектуальная, філасофска-псіхалагічная проза 20-40- хх гг.

*Максім Гарэцкі* (1893--1938). Тэматыка і праблематыка твораў: "патаемнае" ("Што яно?", інш.), інтэлігенцыя і народ ("Роднае карэнне", "У лазні", "У чым яго крыўда?", "Меланхолія"), Першая сусветная вайна ("Літоўскі хутарок", "Рускі", "На імперыялістычнай вайне"), лёс народа ў гісторыі ("Фантазія", "Апостал", "Ціхая плынь", "Дзве душы"). Трагізм лёсу пісьменніка і яго творчасць у 30-я гг. ("Скарбы жыцця", інш.). Раманы і зварот да драматургіі ("Жартаўлівы Пісарэвіч"). Сінтэз дакументальнага і мастацкага, філасафічнасць, псіхалагізм як асноўныя рысы творчасці.

*Кузьма Чорны* (Мікалай Раманоўскі, 1900–1944). Біяграфія. Адметнасць прозы ранняга перыяду (унутраны псіхалагізм, філасофская тэматыка, чалавек як цэлы свет, інш.) – зб. "Апавяданні", "Срэбра жыцця", інш. Савецкая рэчаіснасць у творах ("Макаркавых Волька", "Лявон Бушмар", інш.), драматызм светаадчування аўтара. Сацыяльна-гістарычная аснова раманаў "Зямля", "Бацькаўшчына", тэма інтэлігенцыі і народа ў рамане "Сястра". Асэнсаванне сутнасці і вытокаў фашызму ў раманах ваеннага часу ("Пошукі будучыні", "Млечны шлях", "Вялікі дзень"). Гуманістычны пафас творчасці.

*Міхась Зарэцкі* (Касянкоў, 1901–1937). Жанчына і новы сацыяльны лад у творах ("Дзіўная", "Кветка пажоўклая", "Бель"). Вобраз Яроцкага ў аповесці "Голы звер", яго філасофія жыцця. Востры канфлікт, дынамічны сюжэт, драматызм сітуацый, хрысціянска-гуманістычнае гучанне, псіхалагізм як адметныя рысы творчасці. Зарэцкі-раманіст (наватарства ў даследаванні тэмы калектывізацыі ("Вязьмо"), удзелу інтэлігенцыі ў рэвалюцыі ("Сцежкі-дарожкі").

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Развіццё сатыры ў літаратуры 20-40-хх гг.

*А.Мрый* (Шашалевіч, 1893–1943) як сатырык. Звесткі з біяграфіі. Паказ жыцця 20-х гг. у рамане "Запіскі Самсона Самасуя". Вобраз цэнтральнага героя. Асаблівасці кампазіцыі і стылю. З'ява "самасуеўшчыны" і яе актуальнасць.

*Кандрат Крапіва* (Кандрат Атраховіч, 1896–1991). Біяграфія. Тэматыка вершаў і баек ("ідыятызм" вясковага жыцця, антырэлігійнасць, інш.). Мадэль грамадска-культурнага жыцця 20-30-хх гг. ў творах ("Балет", "Ціт заводзіць новы быт", інш.). Майстэрства Крапівы-байкапісца. Крытычныя артыкулы ("Думкі пра сатыру", "Канфлікт – аснова п'есы", інш.). Праблематыка камедый "Хто смяецца апошнім?" (1939), "Мілы чалавек" (1945), эвалюцыя вобраза-тыпу прыстасаванца. "Брама неўміручасці" (1973): ідэйны змест і жанравыя асаблівасці. Роля К.Крапівы ў развіцці нацыянальнай драматургіі.

*Літаратура Заходняй Беларусі*

Заходнебеларускі друк і яго роля ў развіцці літаратурнага працэсу ("Беларускія ведамасці", "Беларускае жыццё", "Звон", "Калоссе", "Нёман" і інш.). Дзейнасць Грамады, ТБШ і іншых нацыянальных арганізацый. Публіцыстыка *А.Луцкевіча, Б.Тарашкевіча, А.Смоліча, М.Гарэцкага*, інш.; літаратурна-філасофскае эсэ *І.Канчэўскага* "Адвечным шляхам".

Разнастайнасць мастацка-эстэтычных плыняў у паэзіі *Н.Арсенневай, М.Машары, М.Васілька, К.Сваяка, П.Пестрака, В.Таўлая* і інш. Роля і месца ранняй паэзіі М.Танка ў кантэксце заходнебеларускай літаратуры (зб. "На этапах" і інш.).

*Уладзімір Жылка* (1900–1933). Біяграфія. Зб. "Вершы", "Пожні", паэма "Тэстамент". Нацыянальна-адраджэнскія настроі ("Меч", "Палімпсест", "Покліч", "Ляпей жабрачы лёс…"), філасофска-гістарычная скіраванасць паэзіі. Тэма красы ("Хараство", "Максім Багдановіч"). Цыкл "Вершы аб Вільні".

Драматургія. *Леапольд Родзевіч* (1895--1938). Камедыі "Збянтэжаны Саўка", "Конскі партрэт", драма "Пакрыўджаныя". Ідэйны змест п'есы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"П.С.Х.". *Францішак Аляхновіч* (1883-1944) як прадстаўнік навейшай беларускай драматургіі ("Пан міністр", "Новая драма": сюжэт з "падводнай плынню", адкрыты фінал, псіхалагізм, інш.). Аповесць "У кіпцюрох ГПУ" – мастацкі дакумент часу (аўтабіяграфічнасць кнігі, аб'ектыўнасць паказу, лагерны быт, інш.).

## *ЛІТАРАТУРА XX СТАГОДДЗЯ (II ПАЛОВА)*

### *ТЭМА 8. ТЭМА ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ*

Літаратура перыяду вайны. Перавага паэзіі і публіцыстыкі (балада і інш.), шматстылёвасць (рамантычна-гераічная, лірычная з народна-песеннымі інтанацыямі, сатырычная, публіцыстычная плыні). Гераічна-патрыятычны пафас у паэзіі *А.Куляшова* ("Ліст з палону", "Ёсць пад старою Русаю…", інш.), *П.Панчанкі* (зб. "Іранскі дзённік"), *П.Броўкі* ("Рана", "Надзя, Надзейка", інш.), *М.Танка* ("Родная мова", інш.), і малой эпічнай форме (зб. *М. Лынькова* "Астап", *К. Чорнага* "Вялікае сэрца").

Тэма вайны ў 50-60я гады. Творчыя пошукі *І. Мележа* "Мінскі напрамак", *І.Шамякіна* "Помста", "Глыбокая плынь", *Я.Брыля* "Птушкі і гнёзды", інш.). Кніга "Я з вогненнай вёскі…" як народная праўда пра вайну.

*Васіль Быкаў* (1924–2003). Біяграфія. Прыход у літаратуру. Першыя апавяданні, аповесць "Жураўліны крык". Быкаўская аповесць (радавы герой, абмежаванае кола персанажаў, кампактнасць формы, інш.). Трагічнае бачанне вайны ў творах 60-70-х гг. ("Трэцяя ракета", "Мёртвым не баліць", "Круглянскі мост", "Сотнікаў", "Абеліск", інш.). Адметнасць аповесці "Альпійская балада". Жыццё беларуса на акупаванай тэрыторыі ("Знак бяды")). Пашырэнне паняцця гераізму В.Быкавым. Творы пра вайну апошніх дзесяцігоддзяў ("Пакахай мяне, салдацік" і інш.). Зварот да новых тэм ("Аблава", "На Чорных лядах", "Жоўты пясочак", "Народныя мсціўцы", "Дваццаць марак", "Труба", "Ваўчыная яма", інш.). Зб. прытчаў "Сцяна", "Пахаджане" (філасофскі змест, універсальнасць сітуацый, сімвалічнасць).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Экзістэнцыялізм і яго праявы ў творчасці В.Быкава (праблема выбару, роля выпадку, "чужы" герой, інш.).

Асаблівасці выяўлення тэмы вайны ў 70-80-я гг. Вайна ў жыцці і творчасці пісьменнікаў філалагічнага пакалення (*І.Пташнікава, І.Чыгрынава, І.Навуменкі, В.Адамчыка),* паэта-франтавіка *А.Пысіна.* Новыя аспекты (дзеці і вайна, жанчына і вайна, інш.). Кнігі *С.Алексіевіч* ("Апошнія сведкі", "У вайны не жаночы твар"). Кніга-памяць "Я з вогненнай вёскі…". *Алесь Адамовіч* (1927–1994). Звесткі з біяграфіі. Дылогія "Партызаны", "Хатынская аповесць", "Карнікі", інш. (дакументалізм, публіцыстычнасць, пастаноўка глабальных праблем часу). Тэма атамнай вайны ("Апошняя пастараль"). А.Адамовіч і кіно.

## *ТЭМА 9. ЛІТАРАТУРА ПЕРЫЯДУ ДЭМАКРАТЫЧНАГА АБНАЎЛЕННЯ ГРАМАДСТВА*

### *Паэты-класікі савецкага пасляваеннага дзесяцігоддзя.*

*Максім Танк* (1912–1995). Біяграфія. Эстэтычныя пошукі ў даверасвёўскай творчасці (паэмы "Кастусь Каліноўскі", "Нарач", "Сказ пра Вяля", "Казка пра музыку"). Тэматычная разнастайнасць і філасофская скіраванасць паэзіі 60-80-х гг. (арганічная спалучанасць сучаснасці з мінулым, беларускага фальклору з культурай сусветнай цывілізацыі, інш. у зб. "След бліскавіцы", "Мой каўчэг", "Errata", інш.). Танкаўскі верлібр (лаканічнасць формы, парадаксальнасць мыслення, інш.).

*Аркадзь Куляшоў* (1914–1978). Навізна тэм у паэзіі (космас, навука, асоба ў гісторыі, інш.). Ідэйна-мастацкі змест паэм 70-х гг. ("Цунамі", "Варшаўскі шлях", "Хамуціус", інш.), адметнасць іх формы (сімвалізм, драматычная прырода, філасафічнасць).

*Пімен Панчанка* (1917–1995). Лірычнасць і публіцыстычнасць паэзіі, яе сатырычная скіраванасць, спавядальныя матывы (зб. 60-90-хх гг.: "Пры святле маланак", "І вера, і вернасць, і вечнасць…", "Горкі жолуд", інш.). Грамадзянскае гучанне паэзіі (зацікаўленасць жыццём, вастрыня пастаноўкі праблем – сацыяльных, культурных, экалагічных і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Беларуская проза 60-80-х гг.*

“Ваенна-вясковая” плынь (*А.Жук, А.Карпюк, В.Карамазаў, І.Пташнікаў, А.Кудравец*, інш.). Асноўныя мастацкія аспекты ў прозе: асаблівая народная філасофія, трагедыя лёсу беларуса пад уплывам сацыяльна-гістарычных падзей і працэсаў – калектывізацыі, вайны, рэпрэсій; міграцыя ў горад, роля сялянства ў жыцці нацыі, інш.

Актуалізацыя жанру рамана, яго новыя формы: гістарычны, лірычны, раман у вершах, інш. Раман-эпапея. “Палеская хроніка” *І.Мележа* як шматпланавае эпічнае адлюстраванне жыцця беларускай вёскі 1920-х гг. Поліфанізм стылю, яркасць характараў, наватарства раскрыцця тэмы калектывізацыі. *Іван Шамякін* як майстра рамана (інтрыга ў сюжэце, акцэнт на маральна-этычных праблемах, падзейнасць, інш.). Характар канфліктаў, сацыяльны тыпаж у творах 90-х гг. “Крывінка”, “Палеская мадонна”, “Без пакаяння” і інш.

Традыцыі рэалізму (зварот да факта, падзей паўсядзённага жыцця, лёс народа праз лёс індывідуальнага чалавека, інш.). Пашырэнне сродкаў і відаў псіхалагічнага аналізу (“падзейны” ў І.Шамякіна, “аналітычны” ў В.Быкава, “плынь свядомасці” ў А.Адамовіча, І.Пташнікава).

Лірычная проза др. пал. XX ст., яе асаблівасці (павышаная эмацыйнасць, суб’ектыўнасць, эсэістычнасць, інш.). Асноўныя формы: дзённікі, імпрэсіі, замалёўкі, інш. *Янка Брыль* (1917–2006). Спосабы выяўлення лірызму, аналітычнасць і філасафічнасць твораў (“Ніжнія Байдуны”, “Муштук і папка”, інш.). Лірычная мініяцюра, тэматычная разнастайнасць і эстэтычная арыгінальнасць жанру (зб. “Жменя сонечных промняў”, “На сцежцы – дзеці” і інш. *Міхась Стральцоў* (1937–1987) як паэт і празаік. Імпрэсіяністычнасць творчай манеры, адметнасць героя, навізна тэматыкі (зб. “Блакітны вецер”, “Сена на асфальце”).

*“Філалагічнае” пакаленне ў літаратуры*

*Уладзімір Караткевіч* (1930–1984). Універсальнасць таленту. Патрыятычны пафас, асаблівасці рамантызму і паэтызацыі Беларусі ў

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

лірыцы, яе віды і жанры (зб. “Мая Іліяда”, “Быў. Ёсць. Буду.”, інш.). Адметнасць прозы (“Дзікае паляванне караля Стаха”, “Ладдзя роспачы”, інш.): праблемы сучаснасці праз мінулае, сувязь з фальклорам, сінтэз нацыянальнага і агульначалавечага, інш. У.Караткевіч як эсэіст і драматург.

*Ніл Гілевіч* (1931–2016). Шматтэмнасць, багацце жанраў, культура паэтычнага слова (зб. 1960-2000-хх гг.: “Актавы”, “Жыта, сосны і валуны”, “На высокім алтары”, інш.). Раман у вершах “Родныя дзеці”: ідэйна-мастацкі змест і праблематыка (экалогія, творчасць, культура, лёс вёскі, чалавек, інш.). Н.Гілевіч пра народную песню; творы паэта ў музыцы. Зб. “У віры быцця” (2016) – публіцыстычны роздум аўтара над лёсам беларускай культуры.

*Анатоль Вярцінскі* (нар. у 1931). Гуманістычна-філасофскі пафас, грамадзянскае гучанне лірыкі (зб. “Тры цішыні”, “Чалавечы знак”, інш.). Асаблівасці паэтыкі (паўторы, сінтаксічны паралелізм, аналогія, інш.).

*Рыгор Барадулін* (1935–2014). Гістарычная і лірычная скіраванасць паэзіі (тэма памяці, Бацькаўшчыны, вобраз маці, міфалагічныя і біблейскія матывы, інш.). Адметнасць “барадулінскага метафарызму”, рыфмы, сінтаксісу (зб. “Неруш”, “Свята пчалы”, “Евангелле ад мамы”, “Ксты”). Гумар і сатыра ў яго творах.

*Янка Сіпакоў* (н. у 1936). Наватарства кнігі “Веча славянскіх балад” (новыя жанравыя формы балады, мастацкі паказ гісторыі славян). Жанрава-стылявая адметнасць прозы (зб. “Тыя, што ідуць”, эсэ “Мая бібліятэка”).

*Літаратура 70-80-х гг. Творчыя постаці*

*Віктар Казько* (н. у 1940). Ваеннае дзяцінства аўтара і яго герояў (“Високосный год”, “Суд у Слабадзе”). Міфы, легенды, біблейская гісторыя як аснова стварэння мастацкага тэксту, выпрацоўка ўласнай міфапаэтычнай вобразнасці з выразным нацыянальным каларытам (“Неруш”, “Хроніка дзетдомаўскага саду”, “Выратуй і памілуй нас, чорны бусел”, “Да сустрэчы…”, “Час збіраць косці”, “Бунт незапатрабаванага праху”, інш.). Экзістэнцыяльнае гучанне твораў. Сувязь творчасці В.Казько з еўрапейскай літаратурай (М.Булгакаў, Ч.Айтматаў, Г.Маркес, інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Юры Станкевіч* (н. у 1949). Спецыфіка выяўлення рэалізму, праблема героя ў прозе ("Ізумрудна-зялёныя мухі", "Псеўда", "Прузі", інш.). Раман "Любіць ноч – права пацукоў": адметнасць зместу і формы, моўнай плыні, характар канфлікту, сістэма вобразаў-персанажаў. Пошукі пісьменніка ў жанры фантастыкі (антыўтопія "П'яўка" і інш.).

*Сяргей Законнікаў* (нар. у 1946). Новыя паэтычныя ракурсы адлюстравання традыцыйных тэмаў – вайны, прыроды, бацькаўшчыны і інш. Змест паэм "Чорная быль", "Зязюля". Кнігі публіцыстыкі ("Беларускае сэрца", "Вячэра пад райскім дрэвам").

*Алесь Разанаў* (нар. у 1947). Творчыя пошукі новага зместу і жанру (зб. "Шлях-360", "Вастрыё стралы", "Паляванне ў райскай даліне" і інш.). Інтэлектуальная насычанасць паэзіі. Аўтарскія жанры (пункціры, версэты, вершаказы, інш.). А.Разанаў і традыцыі еўрапейскай культуры.

*Раіса Баравікова* (нар. у 1947). Адметнасць паэтычнага свету, шчодрасць інтанацый у інтымнай лірыцы (зб. "Люстэрка для самотнай", "Сад на капялюшыку каханай", інш.). Драматычная паэма "Барбара Радзівіл". Р.Баравікова як дзіцячы пісьменнік.

*Яўгенія Янішчыц* (1948–1988). Асноўныя матывы паэзіі (зб. "Каліна зімы" і інш.): святло вёскі, сіла прыроды і роднай зямлі, магія творчасці, інш. Багаты духоўны свет лірычнай гераіні. Паэма "Ягадны хутар". Свежасць паэтычных інтанацый, іх "музычныя" настроі.

*Алесь Пісьмянкоў* (1957–2012). Лапідарнасць лірыкі, праблема духоўнай повязі з зямлёй і гісторыяй у паэзіі ("Белы Камень", "Чытаю зоры", "Я не памру, пакуль жыву", інш.).

*Андрэй Макаёнак* (1920–1983). Асуджэнне бюракратызму, ашуканства, кар'ерызму ў камедыях "Выбачайце, калі ласка!", "Лявоніха на арбіце". Палітычная трагікамедыя "Зацюканы апостал". Элементы лубка і фарсу ў мастацкай структуры трагікамедыі "Трыбунал". Паказ сацыяльных праблем у камедыях "Таблетку пад язык", "Святая прастата", "Пагарэльцы".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Аляксей Дудараў* (н. у 1950). Ад сацыяльных драмаў "Парог", "Вечар" да гістарычнай тэмы "Чорная панна Нясвіжа", інш. Майстэрства (каларытны персанаж, філасофскае асэнсаванне жыцця, сімволіка, інш.).

## *ЛІТАРАТУРА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ*

### *ТЭМА 10. СУЧАСНЫ ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС*

Агульная характарыстыка сацыяльна-грамадскіх абставін к. ХХ – пач. ХХІ стст. Узнікненне творчых літаратурных аб'яднанняў у 80-90-я гг. ("Тутэйшыя", "ТВЛ", "Бум-Бам-Літ", "Шмэрцвэрк", інш.), іх маніфесты. З'яўленне новых літаратурна-філасофскіх выданняў "Крыніца", "Дзеяслоў", "Arche", інш., аднаўленне "Нашай Нівы". Новыя кніжныя серыі ("Залатая калекцыя беларускай літаратуры", "Проза ХХІ ст.", інш.), часопісы, выдавецтвы. Літаратурнае двухмоўе. Сучасная літаратура і інтэрнэт.

Постмадэрнізм як мастацкая з'ява. Характэрныя рысы (інтэртэкстуальнасць, гульня, фрагментарнасць і калаж, адсутнасць "табу", інш.). Супярэчлівасць літаратуразнаўчых падыходаў у ацэнцы постмадэрнізму. Праявы постмадэрнізму ў творчасці сучасных аўтараў.

### *ТЭМА 11. БЕЛАРУСКАЯ ПРОЗА АД 80-Х ГГ. ХХ СТ. ДА СУЧАСНАСЦІ*

Мастацка-дакументальная проза (роля факта, мінімум вымыслу, інш.), яе жанры (мемуары, дзённікі, споведзь, інш.). Тэма ГУЛАГу ў творчасці *С.Грахоўскага, Л. Геніюш*, інш. (аўтабіяграфізм, вобраз аўтара, характар паказу лагернага быту, інш.). Проза *С. Алексіевіч*, адметнасць творчага метаду (кніга-араторыя, саборны раман, інш.). Канцэпцыя Чарнобыля ў кнізе "Чарнобыльская малітва".

Гістарычная проза. Праблема "асоба і гісторыя" ў прозе *Л. Дайнекі* ("След ваўкалака" і інш.). Полацкая гісторыя, сувязь айчыннага мінулага з сусветнай гісторыяй у кнігах *У. Арлова* ("Таямніцы Полацкай гісторыі" і інш.). Асаблівасці спалучэння вымыслу з рэальнасцю ў прозе *В.Іпатавай* ("Залатая жрыца Ашвінаў" і інш.). Жанчына ў гісторыі ў творах *К. Тарасава* ("Тры жыцці княгіні Рагнеды", інш).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэма вясковага жыцця (зб. “Сад нявіннасці” *М.Вайцяшонак*, “Радзіва Прудок” *А.Горвата*, інш.). *А.Федарэнка* (н. у 1964г.). Паказ сацыяльнай трансфармацыі жыцця вёскі (“Вёска”, “Бляха”, “Дзікі луг”). Ідэйна-мастацкія асаблівасці прозы пісьменіка: тонкі псіхалагізм, рэалізм, тэматычная і жанравая разнастайнасць, таямніцы нацыянальнага характару (“Нічые”, “Жэтон на метро”, інш.).

Прыгодніцка-дэтэктыўны кірунак (інтрыгуючы сюжэт, фантастычнасць і міфалагізм, інш.) у творах *А.Наварыча, А.Федарэнкі, Ф.Сіўко, В.Гапеева*, інш. Традыцыі У.Караткевіча ў іх прозе. З’яўленне жанру трылера. *Л.Рублеўская* (н. у 1965 г.) як паэтка і казачніца. Творчыя набыткі ў прозе (“Сэрца мармуровага анёла”, “Забіць пягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію”, “Пантофля Мнемазіны”, інш.). Авантурны тып гераіні, рамантызм стылю, хэпі-энд у канцы сюжэта, інш.

Гісторыя развіцця і сучасны стан беларускай фантастыкі, яе віды (сацыяльная, навуковая, фэнтэзі, інш.). Сацыяльна-псіхалагічная фантастыка *Р.Баравіковай* (зб. “Вячэра манекенаў”). Асаблівасці жанру антыўтопіі (характар праблемы “асоба і грамадства”, сімвалізм, функцыя папярэджання, інш.). Беларуская антыўтопія (*В.Гігевіч* “Карабель”, “Пабакі”, інш., *В.Марціновіч* “Мова”, *Ю.Станкевіч* “Пʼяўка”, інш.). Набыткі *Л.Рублеўскай* у сферы фантастыкі (“Дзеці гамункулуса”, серыя кніг пра Пранціша Вырвіча, інш.).

Сінтэз рэалістычнага і фальклорна-міфалагічнага ў прозе *А.Казлова, Ф.Сіўко, В.Гапеева*, інш. Актывізацыя ўмоўных мастацкіх формаў (казкі *А.Глобуса*, прытчы *В.Быкава* і *Я.Сіпакова*, сказы *Н.Гілевіча*, інш.), іх алегарычны характар, іронія, інш.

Творчасць аўтараў-жанчын, спецыфіка зместу, вобразнай сістэмы, ракурсаў раскрыцця праблем, інш. Проза *А.Брава* (зб. “Камендацкі час для ластавак”), *Ю.Каляды* “Галоўная памылка Афанасія”, *В.Куртаніч* “Запострэчча для Алісы”, інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *ТЭМА 12. БЕЛАРУСКАЯ ПАЭЗІЯ К. ХХ – ПАЧ. ХХІ СТСТ.*

Мастацка-стылёвыя плыні (лірычная, рамантычная, публіцыстычная, філасофска-аналітычная, інтэлектуальная, інш.).

Узбагачэнне зместу беларускай паэзіі, сувязь традыцыйнага і новага. Рэлігійныя аспекты, біблейская вобразнасць у паэзіі *Р.Барадуліна, І.Багдановіч, Х.Лялько, В.Аксак*, інш. Чарнобыльская тэма ў творах *В.Зуёнка, Я.Сіпакова, М.Мятліцкага, С.Законнікава,* інш. Актуалізацыя нацыянальна-адраджэнскай тэматыкі (асабліва ў паэзіі прадстаўнікоў пакалення "Тутэйшых" найперш праз узнаўленне ў яркіх вобразах-тыпах гісторыі нацыянальнага пісьменства, сцвярджэнні звышкаштоўнасці беларускай мовы, рэпрэзентацыі язычніцкай міфалогіі, інш.). Зварот да гістарычнага мінулага *Л.Рублеўскай, В.Шніпа, Р.Малахоўскага*, інш. Антычнасць як сістэма вобразаў (ці складнік лірычнага светаадчування) у паэзіі *Т.Мушынскай, В.Куставай, С.Шах, В.Гапеевай*, інш. Нацыянальная міфалогія ў вершах *М.Вайцяшонак, С.Сыса, Ф.Баторына, А.Хатэнкі, Я.Дашынай*, інш. Урбаністычная тэма (*А.Глобус, С.Мінскевіч, Г.Булыка, І.Бабкоў, М.Баярын*, інш.). Лірыка кахання (*А.Спрынчан, В.Морт, Л.Сом*, інш.).

Жанр паэмы, шматграннасць формы і яе мадэрнізацыя, схільнасць да сінтэзу (ліра-эпічная, лірыка-псіхалагічная, лірыка-публіцыстычная, інш.). Паэмы "Самота паломніцтва" *Р. Барадуліна*, "Чорная быль" *С. Законнікава*, "Лодачкі" *Н. Гілевіча*, "Барбара Радзівіл" *Р. Баравіковай*, "Калі мяне не стане" *У. Някляева* і мн. інш.

Жанравае і кампазіцыйнае абнаўленне паэзіі (хоку, трыялеты, вянкі санетаў, паліндромы, рубаі, лімэрыкі, амбіграмы і інш.). "Візуальная" ("зрокавая", "графічная", "фігурная") паэзія. Авангардныя пошукі аўтараў "Бум-Бам-Літу" (*С.Мінскевіча, В.Жыбуля, З.Вішнёва, А.Хадановіча*, інш.). З'ява паэтычных слэмаў.

*Л.Дранько-Майсюк* (н. у 1957). Арыентацыя на красу, вобраз жанчыны (цыкл "Маёй цудоўнай А..."), тэма горада, музыкальнасць і акварэльнасць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

псіхалагізм паэзіі (зб. “Гаспода”, інш.). Паэма “Цацачная крама”. Музычна-песенныя інтанацыі ў паэзіі (“Прынц і ружа”, “Аксаміткі”, інш.)

*А.Сыс* (1959–2005). Лёс Беларусі, яе мінулае і будучыня, вобраз паэта-творцы ў зб. “Лён” (ці інш.). Філасофская змястоўнасць вершаў.

*Э.Акулін* (н. у 1963 г.). Зб. “Крыло анёла”, “Радно”, “Непрычалены човен”. Лірыка кахання. Нацыянальна-адраджэнскія матывы. Зварот да ўзораў еўрапейскай паэзіі (вершы-таўтаграмы, брахікалан, трыялет, інш.).

### *ТЭМА 13. БЕЛАРУСКАЯ ДРАМАТУРГІЯ МЯЖЫ СТАГОДДЗЯЎ: ТРАДЫЦЫІ І НАВАТАРСТВА*

Стан сучаснага тэатра і яго рэпертуар. Крытыка аб праблемах і перспектывах развіцця драматургіі. Эксперыментальныя пошукі ў 80-я гг. у жанры драмы абсурду (*Г.Багданава* “АС-лінія”, *І.Сідарук* “Галава”, *М.Арахоўскі* “Ку-ку”, інш.).

Жанравыя адметнасці камедый *Мікалая Матукоўскага* (1929–2001) “Мудрамер”, “Калізей”, інш. Выразнасць канфлікту і характараў, гратэск і фарс, дынаміка дзеяння, вострыя праблемы жыцця ў п’есах.

*Алесь Петрашкевіч* (нар. у 1930) як “летапісец гісторыі”. Жанр гістарычнай драмы (“Прарок для Айчыны”, “Воля на крыжы”, “Меч Рагвалода”, інш.). Тэма Чарнобыля (“Дагарэла свечачка”, “Інтэрнацыянал па-беларуску”).

Творчы рымейк. “Германеўтычны праект” *Сяргея Кавалёва* (“Стомлены д’ябал”, “Навука кахання”, зб. для дзяцей “Шлях да Бэтлеема”).

Рэнесанс п’есы-казкі. Іронія як абавязковы элемент, “двайны адрасат”-чытач такіх твораў. Зварот да сюжэтаў рыцарскай літаратуры і іх сучасная трансфармацыя (“Янук, рыцар Мятлушкі” *Л.Рублеўскай* і інш.). Парадаксальнасць, арыгінальнасць характараў, займальнасць сюжэту ў п’есах *П.Васючэнкі* (зб. “Страшнік Гам”).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

*для спецыяльнасцей*

1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках);

1-23 01 12 Культурная спадчына і турызм

*(дзённая форма навучання)*

| № | Назва раздзелаў, тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | |
| 1. | УВОДЗІНЫ | 2 | | | |
| | СТАРАЖЫТНАЯ ЛІТАРАТУРА | | | | |
| 2. | ТЭМА 1. Літаратура XI-XVI стст. | 2 | 2 | | |
| 3. | ТЭМА 2. Літаратура Адраджэння і Рэфармацыі | 2 | 2 | | |
| 4. | ТЭМА 3. Літаратура XVII-XVIII стст. | 2 | 2 | | |
| | ЛІТАРАТУРА XIX ст. | | | | |
| 5. | ТЭМА 4. Агульная характарыстыка літаратуры XIX ст. | 2 | 2 | | |
| 6. | ТЭМА 5. Эстэтычная эвалюцыя літаратуры XIX ст | 2 | 6 | | |
| | ЛІТАРАТУРА XX ст. | | | | |
| 7. | ТЭМА 6 «Нашаніўскі перыяд» | 8 | 10 | | |
| 8. | ТЭМА 7 Літаратура 1920-40-х гадоў | 8 | 10 | | |
| | ЛІТАРАТУРА XX ст. (2-я палова) | | | | |
| 9. | ТЭМА 8 Тэма Другой сусветнай вайны ў беларускай літаратуры | 8 | 2 | | |
| 10. | ТЭМА 9 Літаратура перыяду дэмакратычнага абнаўлення грамадства | 8 | 4 | | |
| | ЛІТАРАТУРА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ | | | | |
| 11. | ТЭМА 10 Сучасны літаратурны працэс | 8 | 2 | | |
| 12. | ТЭМА 11 Беларуская проза ад 80-х гг. XX ст. да сучаснасці | 4 | 6 | | |
| 13. | ТЭМА 12 Беларуская паэзія к. XX-нач. XXI стст. | 4 | 2 | | |
| 14. | ТЭМА 13 Беларуская драматургія мяжы стагоддзяў: традыцыі і наватарства | 4 | 2 | | |
| | **УСЯГО:** | 64 | 52 | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

*для ўсіх спецыяльнасцей (акрамя студэнтаў ФІДК)*
*(дзённая форма навучання)*

| № | Назва раздзелаў, тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | |
| 1. | УВОДЗІНЫ | 1 | | | |
| | СТАРАЖЫТНАЯ ЛІТАРАТУРА | | | | |
| 2. | ТЭМА 1.<br>Літаратура XI-XVI стст. | 1 | | | |
| 3. | ТЭМА 2.<br>Літаратура Адраджэння і Рэфармацыі | 1 | | | |
| 4. | ТЭМА 3.<br>Літаратура XVII-XVIII стст. | | | 1 | |
| | ЛІТАРАТУРА XIX ст. | | | | |
| 5. | ТЭМА 4.<br>Агульная характарыстыка літаратуры XIX ст. | 1 | | 1 | |
| 6. | ТЭМА 5.<br>Эстэтычная эвалюцыя літаратуры XIX ст | 1 | | | |
| | ЛІТАРАТУРА XX ст. | | | | |
| 7. | ТЭМА 6<br>«Нашаніўскі перыяд» | 2 | 2 | | |
| 8. | ТЭМА 7<br>Літаратура 1920-40-х гадоў | 2 | 2 | 1 | |
| | ЛІТАРАТУРА XX ст. (2-я палова) | | | | |
| 9. | ТЭМА 8<br>Тэма Другой сусветнай вайны ў беларускай літаратуры | 1 | 2 | | |
| 10. | ТЭМА 9<br>Літаратура перыяду дэмакратычнага абнаўлення грамадства | 4 | 2 | 2 | гутарка на занятках |
| | ЛІТАРАТУРА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ | | | | |
| 11. | ТЭМА 10<br>Сучасны літаратурны працэс | 1 | 4 | | |
| 12. | ТЭМА 11<br>Беларуская проза ад 80-х гг. XX ст. да сучаснасці | 2 | | 2 | праверка дзённіка |
| 13. | ТЭМА 12<br>Беларуская паэзія к. XX-нач. XXI стст. | 2 | | 2 | праверка дзённіка |
| 14. | ТЭМА 13<br>Беларуская драматургія мяжы стагоддзяў: традыцыі і наватарства | 1 | | 1 | праверка дзённіка |
| | **УСЯГО:** | 20 | 12 | 10 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Літаратура

*Асноўная*

1. Старажытная беларуская літаратура / [уклад. УП "Выдавецтва "Вышэйшая школа"]. – Мінск: Вышэйшая школа, 2022. – 368 с.

*Дадатковая*

1. Баршчэўскі, Л. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён: папулярныя нарысы / Л.Баршчэўскі, П.Васючэнка, М.Тычына. – Мінск : Радыёла–плюс, 2006. – 574 с.
2. Бельскі, А. І. Сучасная беларуская літаратура: станаўленне і развіццё творчых індывідуальнасцяў (80–90 гг.): вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў / А.І.Бельскі. – Мінск : Нар. асвета, 1997. – 254 с.
3. Васючэнка, П.В. Сучасная беларуская драматургія: дапам. Для настаўнікаў / П.В.Васючэнка. – Мінск : Мастац. літ., 2000. – 156 с.
4. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: У 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я.Купалы; Навук. рэд.: І.Я.Навуменка, В.А.Каваленка. – Мінск : Бел. навука, 1999–2015. – 4 т.
5. Гісторыя беларускай літаратуры, XIX – пачатак XX ст.: Падруч. для філал. спец. выш. пед. навуч. установ / І.Э.Багдановіч, У.В.Гніламёдаў, Л.С.Голубева і інш.; пад агул. рэд. М.А.Лазарука, А.А.Семяновіча. – Мінск : Выш. шк., 1998. – 559 с.
6. Гісторыя беларускай літаратуры: XX стагоддзе (20-50-я гг.): Падруч. для студэнтаў філал. спец. ВНУ / У.В.Гніламёдаў, В.В.Казлова, М.А.Лазарук і інш.; Пад агул. рэд. М.А.Лазарука, А.А.Семяновіча. – Мінск : Выш. шк., 2000. – 510 с.
7. Гісторыя беларускай літаратуры: Старажыт. перыяд: падруч. для філал. спец. пед. выш. навуч. установ / М.М.Грынчык, У.А.Калеснік, У.Г.Кароткі і інш.; Пад агул. рэд. М.А.Лазарука, А.А.Семяновіча. – Мінск : Выш. шк., 1996. – 351 с.
8. Гісторыя беларускай літаратуры, XIX – пач. XX ст.: падручнік для філал. фак. пед. ін-таў БССР / Л. С. Голубева [і інш.]; пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – Мінск : Выш. школа, 1981. – 412 с.
9. Гісторыя беларускай літаратуры, XI – XIX стст.: у 2 т. / НАН Беларусі, Ін-т імя Я. Купалы; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2006—2007. – 2 т.
10. Дасаева, Т.М. Беларуская літаратура XX – пачатку XXI стагоддзя : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях "Журналістыка міжнародная", "Журналістыка (па напрамках)", "Літаратурная работа (па напрамках)", "Інфармацыя і камунікацыя", "Беларуская філалогія" / Т.М. Дасаева. – Мінск: РІВШ, 2016. – 263 с.
11. Кісліцына, Г.М. Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы. Навуковае выданне. – Мінск: Логвінаў, 2006. – 415 с.
12. Кісялёў, Г. Ад Чачота да Багушэвіча / Г.Кісялёў. – 2-е выд. – Мінск : Мастац. літ., 2003. – 426 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

13.Лойка, А. А. Старабеларуская літаратура: Падруч. для філал. спец. ВНУ / А.А.Лойка. – Мінск : Выш. шк., 2001. – 318 с.
14.Лойка, А. А. Гісторыя беларускай літаратуры: дакастрычніцкі перыяд: падручнік для філал. фак. выш. навуч. Устаноў БССР: у 2 ч. / А. А. Лойка. – Мінск: Выш. школа, 1977–1980. – 2 ч.

**Дадатковая біяграфічна-даведачная літаратура**

1. Адамовіч, А. Браму скарбаў сваіх адчыняю… : даследаванне жыцця і творчасці М. Гарэцкага / А.Адамовіч. – Мінск : БДУ, 1980. – 223 с.
2. Беларускія пісьменнікі; [пад рэдакцыяй А. В. Мальдзіса]: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы Акад. навук Рэсп. Беларусь, Беларус. энцыкл. – Мінск : БелЭн, 1992–1995. – 6 т.
3. З росных сцяжын: аўтабіяграфіі пісьменнікаў Беларусі / Уклад. М.Мінзер. – Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2009. – 460 с.
4. Максім Багдановіч. Пясняр чыстае красы: успаміны, артыкулы, прысвячэнні / [уклад. Т. Шэляговіч]. – Мінск: Мастац. літ., 2011. – 349 с. – (Жыццё знакамітых людзей Беларусі : ЖЗЛБ).
5. Пяцьдзесят чатыры дарогі: Аўтабіягр. беларус. пісьменнікаў / Склад. І падрыхт. Тэкстаў Я.Казекі. – Мінск : Мастац. літ., 1963. – 551 с.
6. Уладзімір Караткевіч. Быў. Ёсць. Буду!: успаміны, інтэрв'ю, эсэ / укладанне Г.Шаблінскай. – Мінск : Мастац. літ., 2005. – 517 с. – (Жыццё знакамітых людзей Беларусі : ЖЗЛБ).
7. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. / рэдкал.: І.П.Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1984–1987. – 5 т.
8. Янка Купала: энцыкл. Даведнік / Беларуская сав. энцыкл.; рэдкал.: І.П.Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1986. – 727 с.
9. Куляшова, В.А. Аркадзь Куляшоў. Лясному рэху праўду раскажу... : аповесць-эсэ / Валянціна Куляшова. - Мінск : Мастацкая літаратура, 2014. – 260 с.
10.Калядка, С.У. Максім Танк. Новыя факты, матэрыялы, інтэрпрэтацыі : [манаграфія] / С. У. Калядка ; [навук. рэд.: А. Л. Верабей, Л. Г. Кісялёва]. -- Мінск : Беларуская навука, 2014. – 483с.
11.Кузьма Чорны. Чалавек – гэта цэлы свет: успаміны, эсэ, артыкулы, інтэрв'ю, дакументы / [уклад. Галіна Шаблінская]. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2016. - 510 с. (Жыццё знакамітых людзей Беларусі).

**Хрэстаматыі**

1. Анталогія даўняй беларускай літаратуры / пад рэд. В.Чамярыцкага. – Мінск: Выш. шк., 2003. – 1015 с.
2. Літаратура XI–XVI стагоддзяў / Уклад. і камент. А. У. Бразгунова, І. У. Будзько, Л. В. Ляўшун ; прадм. У. В. Гніламёдава; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. - Мінск : Маст. літ., 2011. – 765 с. – (Залатая калекцыя беларускай літаратуры).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Літаратура XVII–XVIII стагоддзяў / Уклад. А.У.Бразгунова, С.Л.Гараніна; навук. рэд. В.А.Чамярыцкі. – Мінск : Маст. літ., 2012. – 830 с. – (Залатая калекцыя беларускай літаратуры).
4. Літаратура Беларусі XIX стагоддзя: анталогія / уклад.: К.А.Цвірка, І.С.Шпакоўскі, К.У.Антановіч; нав. Рэд. А.В.Мальдзіс; прадм.: К.Цвірка . – Мінск : Бел. навука, 2013. – 861 с.
5. Старажытная беларуская літаратура (XII–XVII стст.) / уклад., прадм., камент. І.Саверчанкі. – Мінск : Кнігазбор, 2007. – 608 с.
6. Старажытная беларуская літаратура : Зборнік : Для ст. шк. узросту / уклад. Л.С.Курбека; аўт. Прадм. У.Г.Кароткі. – Мінск : Юнацтва, 1990. – 350 с.
7. Сучасная беларуская драматургія: Традыцыі і наватарства / уклад. П.Васючэнка. – Мінск: Маст. літ., 2003. – 639 с.
8. Сучасная беларуская п’еса: Зб. / склад. Г.Марчук. – Мінск: Маст. літ., 1992. – 396 с.
9. Сучасная беларуская п’еса: Зб. / склад. П.Васючэнка. – Мінск: Маст. літ., 1997. – 302 с.
10. Філаматы і філарэты : Зборнік / уклад., пер. пол. Твораў, прадм., біягр. Даведкі пра аўт. І камент. К.Цвіркі. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1998. – 400 с.
11. Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі: у 3 т. / Беларус. ун-т культуры; уклад., рэд. тэкстаў, уступ. Арт. І камент. А.В.Сабалеўскага. – Мінск : Беларус. навука, 1997. – 3 т.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці**

| Балы | Крытэрыі ацэнкі |
|---|---|
| 1 (адзін), не залічана | Адсутнасць ведаў і кампетэнцый у рамках вучэбнага курса; адмаўленне ад адказу |
| 2 (два), не залічана | Фрагментарныя веды ў межах вучэбнага курса; наяўнасць у адказе грубых, лагічных памылак |
| 3 (тры), не залічана | Недастаткова поўны аб'ём ведаў у межах вучэбнага курса; фрагментарны пераказ тэксту; няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію і арыентавацца ў тэорыі літаратурнага працэсу |
| 4 (чатыры), залічана | Валоданне зместам твора пераважна на ўзроўні пераказу, адсутнасць канцэптуальнага ўспрымання літаратурнага працэсу; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі |
| 5 (пяць), залічана | Дастатковы ўзровень ведаў у рамках вучэбнай праграмы; эмацыянальнае асэнсаванне тэксту са спробай ацаніць характары і сітуацыі; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; лагічны адказ і здольнасць рабіць высновы; засваенне асноўнай літаратуры |
| 6 (шэсць), залічана | Дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; раскрыццё зместу літаратурнага твора праз выяўленне праблематыкі, вобразнай сістэмы; спроба раскрыць аўтарскія адносіны да герояў і падзей пры адсутнасці аналітычнага падыходу; лагічны адказ і здольнасць рабіць высновы; засваенне асноўнай літаратуры |
| 7 (сем), залічана | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; добрае валоданне тэкстам, уменне аналізаваць твор на ідэйна-кампазіцыйным узроўні; здольнасць рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; лагічны і разгорнуты адказ; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры |
| 8 (восем), залічана | Сістэматызаваныя, грунтоўныя і трывалыя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; свабоднае валоданне навуковай тэрміналогіяй і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; разуменне і раскрыццё шматузроўневасці мастацкага твора; выкарыстанне цытат; самастойнасць высноў; валоданне метадамі комплекснага аналізу; адказ на дадатковыя пытанні; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| 9 (дзевяць), залічана | Сістэматызаваныя, грунтоўныя і трывалыя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; свабоднае валоданне навуковай тэрміналогіяй і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; уменне аналізаваць твор у адзінстве зместу і формы; прадуманы, лагічны, разгорнуты, абгрунтаваны адказ, які не патрабуе дадатковых пытанняў; поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры |
| 10 (дзесяць), залічана | Сістэматызаваныя, грунтоўныя і трывалыя веды па ўсіх раздзелах праграмы; свабоднае валоданне навуковай тэрміналогіяй і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; уменне даваць тыпалагічны аналіз, рабіць арыгінальныя высновы; выяўленне аўтарскай канцэпцыі жыцця і асобы; творчая інтэрпрэтацыя тэксту; поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

*для спецыяльнасцей*

1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках);

1-23 01 12 Культурная спадчына і турызм

*(дзённая форма навучання)*

| № | Назва раздзелаў, тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колька сць гадзін КСР | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарс кія заняткі | | |
| 1. | УВОДЗІНЫ | 2 | | | |
| | СТАРАЖЫТНАЯ ЛІТАРАТУРА | | | | |
| 2. | ТЭМА 1.<br>Літаратура XI-XVI стст. | 2 | 2 | | вуснае апытанне, пісьмовая работа, рэферат |
| 3. | ТЭМА 2.<br>Літаратура Адраджэння і Рэфармацыі | 2 | 2 | | вуснае апытанне, пісьмовая работа, рэферат |
| 4. | ТЭМА 3.<br>Літаратура XVII-XVIII стст. | 2 | 2 | | вуснае апытанне, пісьмовая работа, рэферат |
| | ЛІТАРАТУРА XIX ст. | | | | |
| 5. | ТЭМА 4.<br>Агульная характарыстыка літаратуры XIX ст. | 2 | 2 | | вуснае апытанне, пісьмовая работа, рэферат |
| 6. | ТЭМА 5.<br>Эстэтычная эвалюцыя літаратуры XIX ст | 2 | 6 | | вуснае апытанне, пісьмовая работа, рэферат |
| | ЛІТАРАТУРА XX ст. | | | | |
| 7. | ТЭМА 6<br>«Нашаніўскі перыяд» | 6 | 8 | | вуснае апытанне, пісьмовая работа, рэферат |
| 8. | ТЭМА 7<br>Літаратура 1920-40-х гадоў | 4 | 8 | | вуснае апытанне, |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | пісьмовая работа, рэферат |
| ЛІТАРАТУРА XX ст. (2-я палова) | | | | | |
| 9. | ТЭМА 8<br>Тэма Другой сусветнай вайны ў беларускай літаратуры | 4 | 2 | | вуснае апытанне, пісьмовая работа, рэферат |
| 10. | ТЭМА 9<br>Літаратура перыяду дэмакратычнага абнаўлення грамадства | 4 | 2 | | вуснае апытанне, пісьмовая работа, рэферат |
| ЛІТАРАТУРА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ | | | | | |
| 11. | ТЭМА 10<br>Сучасны літаратурны працэс | 6 | 2 | | вуснае апытанне, пісьмовая работа, рэферат |
| 12. | ТЭМА 11<br>Беларуская проза ад 80-х гг. XX ст. да сучаснасці | 4 | 6 | | вуснае апытанне, пісьмовая работа, рэферат |
| 13. | ТЭМА 12<br>Беларуская паэзія к. XX-нач. XXI стст. | 4 | 2 | | вуснае апытанне, пісьмовая работа, рэферат |
| 14. | ТЭМА 13<br>Беларуская драматургія мяжы стагоддзяў: традыцыі і наватарства | 4 | 2 | | вуснае апытанне, пісьмовая работа, рэферат |
| | **УСЯГО:** | 48 | 46 | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

*для ўсіх спецыяльнасцей (акрамя студэнтаў ФІДК)*
*(дзённая форма навучання)*

| № | Назва раздзелаў, тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | |
| 1. | УВОДЗІНЫ | 1 | | | |
| | СТАРАЖЫТНАЯ ЛІТАРАТУРА | | | | |
| 2. | ТЭМА 1.<br>Літаратура XI-XVI стст. | 1 | | | |
| 3. | ТЭМА 2.<br>Літаратура Адраджэння і Рэфармацыі | 1 | | | |
| 4. | ТЭМА 3.<br>Літаратура XVII-XVIII стст. | | | 1 | вуснае апытанне, пісьмовая работа, рэферат |
| | ЛІТАРАТУРА XIX ст. | | | | |
| 5. | ТЭМА 4.<br>Агульная характарыстыка літаратуры XIX ст. | 1 | | 1 | вуснае апытанне, пісьмовая работа, рэферат |
| 6. | ТЭМА 5.<br>Эстэтычная эвалюцыя літаратуры XIX ст | 1 | | | |
| | ЛІТАРАТУРА XX ст. | | | | |
| 7. | ТЭМА 6<br>«Нашаніўскі перыяд» | 2 | 2 | | вуснае апытанне, пісьмовая работа, рэферат |
| 8. | ТЭМА 7<br>Літаратура 1920-40-х гадоў | 2 | 2 | 1 | вуснае апытанне, пісьмовая работа, рэферат |
| | ЛІТАРАТУРА XX ст. (2-я палова) | | | | |
| 9. | ТЭМА 8<br>Тэма Другой сусветнай вайны ў беларускай літаратуры | 1 | 2 | | вуснае апытанне, пісьмовая работа, рэферат |
| 10. | ТЭМА 9<br>Літаратура перыяду дэмакратычнага абнаўлення грамадства | 4 | 2 | 2 | гутарка на занятках |
| | ЛІТАРАТУРА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ | | | | |
| 11. | ТЭМА 10<br>Сучасны літаратурны працэс | 1 | 4 | | вуснае апытанне, пісьмовая работа, |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | рэферат |
| 12. | ТЭМА 11<br>Беларуская проза ад 80-х гг. XX ст. да сучаснасці | 2 | | 2 | праверка дзённіка |
| 13. | ТЭМА 12<br>Беларуская паэзія к. XX-нач. XXI стст. | 2 | | 2 | праверка дзённіка |
| 14. | ТЭМА 13<br>Беларуская драматургія мяжы стагоддзяў: традыцыі і наватарства | 1 | | 1 | праверка дзённіка |
| | **УСЯГО:** | 20 | 12 | 10 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ**

*для спецыяльнасцей*

1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках);

1-23 01 12 Культурная спадчына і турызм

*(завочная форма навучання)*

| № | Назва раздзелаў, тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | |
| 1. | УВОДЗІНЫ | 2 | | |
| | СТАРАЖЫТНАЯ ЛІТАРАТУРА | | | |
| 2. | ТЭМА 1. Літаратура XI-XVI стст. | 2 | | |
| 3. | ТЭМА 2. Літаратура Адраджэння і Рэфармацыі | 2 | | |
| 4. | ТЭМА 3. Літаратура XVII-XVIII стст. | | | |
| | ЛІТАРАТУРА XIX ст. | | | |
| 5. | ТЭМА 4. Агульная характарыстыка літаратуры XIX ст. | 2 | | |
| 6. | ТЭМА 5. Эстэтычная эвалюцыя літаратуры XIX ст | | | |
| | ЛІТАРАТУРА XX ст. | | | |
| 7. | ТЭМА 6. «Нашанiўскі перыяд» | 2 | 2 | вуснае апытанне, пісьмовая работа, рэферат |
| 8. | ТЭМА 7. Літаратура 1920-40-х гадоў | 2 | 2 | вуснае апытанне, пісьмовая работа, рэферат |
| | ЛІТАРАТУРА XX ст. (2-я палова) | | | |
| 9. | ТЭМА 8. Тэма Другой сусветнай вайны ў беларускай літаратуры | | 2 | вуснае апытанне, пісьмовая работа, рэферат |
| 10. | ТЭМА 9. Літаратура перыяду дэмакратычнага абнаўлення грамадства | 2 | | |
| | ЛІТАРАТУРА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ | | | |
| 11. | ТЭМА 10. Сучасны літаратурны працэс | 2 | 2 | вуснае апытанне, пісьмовая работа, рэферат |
| 12. | ТЭМА 11. Беларуская проза ад 80-х гг. XX ст. да сучаснасці | 2 | | |
| 13. | ТЭМА 12. Беларуская паэзія к. XX-нач. XXI стст. | 2 | | |
| 14. | ТЭМА 13. Беларуская драматургія мяжы стагоддзяў: традыцыі і наватарства | 2 | | |
| | **УСЯГО:** | 22 | 8 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

*для ўсіх спецыяльнасцей (акрамя студэнтаў ФІДК)*
*(завочная форма навучання)*

| № | Назва раздзелаў, тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | |
| 1. | УВОДЗІНЫ | 1 | | вуснае апытанне |
| | СТАРАЖЫТНАЯ ЛІТАРАТУРА | | | |
| 2. | ТЭМА 1.<br>Літаратура XI-XVI стст. | 1 | | праверка дзённіка |
| 3. | ТЭМА 2.<br>Літаратура Адраджэння і Рэфармацыі | | | |
| 4. | ТЭМА 3.<br>Літаратура XVII-XVIII стст. | | | |
| | ЛІТАРАТУРА XIX ст. | | | |
| 5. | ТЭМА 4.<br>Агульная характарыстыка літаратуры XIX ст. | 1 | | праверка дзённіка |
| 6. | ТЭМА 5.<br>Эстэтычная эвалюцыя літаратуры XIX ст | | | |
| | ЛІТАРАТУРА XX ст. | | | |
| 7. | ТЭМА 6<br>«Нашаніўскі перыяд» | 2 | 2 | гутарка на занятках |
| 8. | ТЭМА 7<br>Літаратура 1920-40-х гадоў | 1 | | праверка дзённіка |
| | ЛІТАРАТУРА XX ст. (2-я палова) | | | |
| 9. | ТЭМА 8<br>Тэма Другой сусветнай вайны ў беларускай літаратуры | | | |
| 10. | ТЭМА 9<br>Літаратура перыяду дэмакратычнага абнаўлення грамадства | | | |
| | ЛІТАРАТУРА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ | | | |
| 11. | ТЭМА 10<br>Сучасны літаратурны працэс | 4 | | праверка дзённіка |
| 12. | ТЭМА 11<br>Беларуская проза ад 80-х гг. XX ст. да сучаснасці | | | |
| 13. | ТЭМА 12<br>Беларуская паэзія к. XX-нач. XXI стст. | | | |
| 14. | ТЭМА 13<br>Беларуская драматургія мяжы стагоддзяў: традыцыі і наватарства | | | |
| | **УСЯГО:** | 10 | 2 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ